В. В. Швед

# Падзеі і постаці гродзенскай даўніны

Гродна

1995

Рэцэнзент кандыдат гістарычных навук, дацэнт С. Я. Сяльверстава.

В. В. ШВЕД.

Падзеі і постаді Гродзенскай даўніны. — Гродна, 1995. — 176 с.

Гэта кніжка з'яўляецца лагічным працягам першага твора аўтара «По следам Гродненской старины», які выдадзены ў 1993 г. і стаў ужо бібліяграфічнай рэдкасцю. Чытач знойдзе тут нарысы пра малавядомыя падзеі і асобы Гродзенскай даўніны канца XVIII — пачатку XX стагоддзя: паўстанні 1794, 1830-1831, 1863 гадоў на тэрыторыі Гродзенскай губерні, вайна 1812 года, развіццё гандлю і сельскай гаспадаркі, постаці мастакоў Ю. Карчэўскага і Я. Траяноўскага, паплечнікаў Касцюшкі і Каліноўскага, А. Міцкевіча, Э. Плятэр, Е. Арлоўскага і інш.

Разлічана на выкладчыкаў, школьнікаў і студэнтаў, усіх, хто цікавіцца гісторыяй Гродзеншчыны.

УДК 947,6+908.476,6

© В. В. Швед, 1995

# ПРАДМОВА

Сёння, калі адбываецца адраджэнне Беларусі, важнай справай гісторыкаў з'яўляецца аднаўленне гістарычнай памяці. Старажытныя грэкі мелі рацыю, сцвярджаючы: «Гісторыя — Настаўніца жыцця». Яна сапраўды вучыць як быць Грамадзянінам і патрыётам сваёй Айчыны, як пазбегчы памылак, добра разбірацца ў сучаснасці і прадугледзець перспектывы развіцця ў будучым. Ці ведаем мы, жыхары Гродзеншчыны, сваю гісторыю? А можа і яна навучыць нас добраму і разумнаму?

Я гірапаную вам пазнаёміцца з падзеямі, якія адбыліся на тэрыторыі Гродзенскай губерні — цяперашніх Гродзеншчыны, Беластокшчыны і Брэстчыны — у перыяд з канца 18 ст. да пачатку 20 ст. Вы даведаецеся пра тое, як адбываўся ў Гродзенскім Новым замку другі падзел Рэчы Паопалітай, што гэта прывяло да паўстання А. Т. Касцюшкі і спроб адраджэння незалежнасці ў 1812 г. і 1863 г. А ці нецікава прачытаць пра навагрудскіх масонаў, гродзенскіх гусар, развіцці ўнутранага і знешняга гандлю; дзейнасці таварыства сельскай гаспадаркі. Мне здаецца, сённяшнія эканамісты і прадпрымальнікі маглі б нешта запазычыць з таго часу. Малавядома гісторыя Гарадзенскага княства і яго ўладальнікаў, хаця і ёсць ужо невялічкі артыкул Я. Г. Звяругі ў другім томе Эндыклапедыі гісторыі Беларусі (с. 470-471). Прапануемы ў нашай кнізе нарыс зыходзіць з іншага пункту гледжання. Другая частка кнігі прысвечана або малавядомым асобам, або расказвае невядомае пра, здаецца, добра знаёмыя постаці: мастакі Юліян Карчэўскі і Ян Траяноўскі, паэт філамат Адам Міцкевіч, літаратар-паўстанец Эмілія Плятэр, інсургенты з Мастоўшчыны і Людвік Нарбут, гісторык-бібліятакар Еўстафій Арлоўскі. Цікава падкрэсліць, што дзейнасць некаторых асоб перакрыжоўваецца: Траяноўскі — Міцкевіч, Міцкевіч — Плятэр. Гэта яшчэ больш паглыбляе веды пра кожнага з іх. Сучаснай моладзі патрэбны куміры. Будзем спадзявацца, што пошуку іх дапамогуць і матэрыялы гэтай кнігі.

Нарысы напісаны на базе архіўных пошукаў, вывучэнні дакументальных крыніц і літаратуры беларускіх, рускіх і польскіх аўтараў, значная частка якіх маладаступна шырокаму колу чытачоў.

## Частка I. П А Д З Е І

## ГАРАДЗЕНСКАЕ КНЯСТВА І ЯГО ЎЛАДАЛЬНІКІ [1]

У 1978 годзе гродзенцы ўрачыста адзначылі 750-годдзе горада Гродна. Пачаткам адліку доўгі час лічыўся 1128 год. Зыходзілі з запісу ў Іпацьеўскім летапісу, дзе нагадваецца Горадзен пад 6636 г. ад «стварэныя свету»: «...посла князь Мстислав с братьею сваею многы кривичи четырьми пути Вячеслава из Турова, Андрея из Володимера, Всеволодка из Городна и Вячеслава Ярославича из Клечьска... Тем повеле итить Изяславлю... рек им динъ день всем пустити на воропъ мда августа 11 дня»[2].

Пры звычайным перакладзе старажытнай даты на сучасную ад 6636 года трэба адняць 5508, атрымаецца сапрауды 1128 год. Але названы паход чатырох князёў Кіеўскай Русі на Полацкую зямлю згадваецца ў Лаўрэнцьеўскім летапісу (а таксама і ў Радзівілаўскім) пад 6635 годам, а гэта — 1127 год. Чамусьці гэтую супярэчлівасць даследчыкі заўсёды пакідалі без увагі. Між тым, пытанне з розніцай гадоў вырашаецца даволі проста. Летапісцы прытрымліваліся так званага «мартаўскага стылю», у якім год пачынаецца ў сакавіку (марте) у адрозненне ад «вераснёўскага стылю», дзе год адлічваецца з верасня. Сакавіцкі год можа пачынацца паўгодам раней і тады ён будзе старэйшы за вераснёўскі і мае назву «ўльтрамартаўскі». Што і адбылося пры складанні Іпацьеўскага летапісу — пры перакладзе на сучасны стыль ад прыведзенай даты 6636 трэба было адымаць не 5508, а 5509. У выніку будзе тая ж самая дата — 1127 год[3].

Як бачым, нават калі карыстацца агульнапрызнаным запісам Іпацьеўскага летапісу, Гродна на адзін год старэйшы. Больш дакладнае вывучэнне летапісаў, а таксама праз вядомых гісторыкаў В. В. Ключэўскага, С. М. Салаўёва, В. Н. Тацішчава і іншых, дазваляе нам сцвярджаць, што пачаткам горада можна лічыць 1116 год. Вось запіс таго ж самага Іпацьеўскага летапісу: «6624... В се же лета преставися Мстислав внук Игорев. Том же лете Володимер отда дщерь свою Огафью за Всеволодка»[4].

---

1 Пры напісанні нарыса былі выкарыстаны матарыялы, прадстаўленыя А. П. Госцевым.

2 Полное собрание русских летописей. (Далей ПСРЛ). Т. 2. Ипатьевская летопись. — М., 1962. — стб. 294.

3 Гл.: Климишин И. А. Календарь и хронология. — М., 1990. С. 380-384.

4 ПСРЛ. Т. 2. — стб. 292.

У гэтым урыўку ўпамінаюцца: першы гарадзенскі князь Усевалад Давыдавіч і ягоныя жонка Агаф'я, стрыечны брат Мсціслаў Усеваладавіч, дзед Ігар Яраслававіч (бацька Давыда), цесць Уладзімір Усеваладавіч Манамах.

Згодна з завяшчаннем Яраслава Мудрага (пам. 1054), калі бацька памірае раней дзеда ці старэйшых дзядзькоў, то ягоныя сыны і іх нашчадкі страчваюць правы на бацькоўскую зямлю і становяцца князямі-ізгоямі і самі вымушаны клапаціцца аб сваім лёсе. Дапамагчы ім маглі заможныя сваякі: напрыклад, паспрыяць іх шлюбу з набыццём у пасаг кавалка зямлі. Мсціслаў быў апошнім апекуном князя-ізгоя Усевалада Давыдавіча (нездарма ж летапісец называе яго змяншальным імем — «Всеволодка». Пасля яго смерці, каб не даць юнаку прапасці (заснавальнік дынастыі гарадзенскіх князёў нарадзіўся паміж 1098-1100 гг.), Уладзімір Манамах жэніць яго на сваёй дачцы Агаф'і. А яна якраз з'яўляецца сястрой таго самага князя Мсціслава, які наладзіў у 1127 годзе паход чатырох князёў на Полацкую зямлю.

У якасці пасагу маладыя атрымалі зямлю ў месцы ўпадзення ў Нёман ракі Гараднічанкі. Тут узніклі крэпасныя ўмацаванні, а затым горад, які ўвайшоў у летапісы пад назвай Горадзен або Горадня (да прыкладна 1569 г.). Уладзімір Манамах вёў у 1115-1116 гадах паспяховую барацьбу супраць Полацкага княства і паганцаў — балцкіх плямёнаў, таму заснаванне ў гэты час гарадзенскай крэпасці было яму вельмі патрэбна. Зяць Усевалад, відаць, прыступіў да будаўніцтва не адкладваючы далёка ад шлюбу[5].

Праз дзесяць гадоў Усевалад Давыдавіч узгадваецца ў летапісах як гарадзенскі князь. Уладанні княства, на наш погляд, абмяжоўваліся на поўначы Жамойціяй і Полацкім княствам, на ўсходзе — Літвою (Верхняе Панямонне), на поўдні — Тураўскім і Галіцка-Валынскім княствамі, на захадзе — зямлёй яцвягаў. На гэтай тэрыторыі было звыш дваццаці населеных пунктаў: Горадзен, Наваградак, Ваўкавыск, Услонім, Турск, Ольжэва, Індура, Мсцібогаў, Муравельнік, Збочна, Янава, Мерачоўшчына, Турэцкая Гара, Сашокі, Дзераўна, Высоцк, Агароднікі, Пуркевічы, Радагошча, Селішча і іншыя[6]

---

[5] Падрабязней гл.: Гостев А. О возникновении Гродненского княжества и князьях городенских//Наш радавод. — Гродно, 1990. С. 107-109; Гостев А. П., Швед В. В. Кронон. Летопись города на Немане (1116-1990 гг.). — Гродно, 1993. — С. 11-17; Госцеў А., Швед В. Шлюб князя-ізгоя або як пачынаўся Горадзень//Гродненская правда. —1991.—1.XI. — С. 3.

[6] Раппопорт П. А. Военное зодчество Западно-русских земель. — Л., 1967.

У палітычным аспекце Гарадзенскае княства залежала ад вялікага князя Кіеўскага. Усевалад Давыдавіч і яго нашчадкі прымалі ўдзел у паходах князя. Так, у 1127 г. Усевалад Гарадзенскі хадзіў разам з Мсціславам Уладзіміравічам на Полацкае княства, а ў 1132 г. — на Літву. Барыс і Глеб Гарадзенскія ўдзельнічалі ў паходзе кіеўскага князя Усевалада на Галіцка-Валынскае княства. У тым жа годзе кіеўскі князь аддае сясцёр Барыса і Глеба замуж: адну за Уладзіміра Давыдавіча Чарнігаўскага, а другую — за Юрыя Яраслав іча Тураўскага (тураўская галіна гарадзенскіх князёў паклала пачатак дынастыі пінскіх князёў 13 ст. і ў 14 ст. выйшла на князёў Астрожскіх і Заслаўскіх).

У 1150-1151 гадах Барыс Гарадзенскі ўдзельнічаў у барацьбе князя Мсціслава за кіеўскі стол. У 1166 г. Глеб Гарадзенскі па загаду кіеўскага князя ахоўвае ад полаўцаў купецкія караваны каля Канева, а ў 1168 г. прымае ўдзел у паходзе на полаўцаў. Актыўна ўдзельнічае ў міжусобнай барацьбе за кіеўскі стол. Спачатку на баку Мсціслава Ізяславіча (1167, 1170 гг.), а потым разам з полацкімі, тураўскімі і пінскімі князямі і сваім братам Мсціславам на баку Андрэя Багалюбскага (1173 г.). У 1184 г. Мсціслаў Гарадзенскі прыняў удзел у паходзе кіеўскага князя Святаслава Усеваладавіча на полаўцаў.

У апошняй чвэрці 12 ст. ствараецца самабытная гарадзенская школа дойлідства. Характэрнымі асаблівасцямі яе з'яўляюцца: выкарыстанне прыроднага абчэсанага каменю ў роўнаслаёвай муроўцы плінфы (плоскай цэглы), у сценах — геаметрычныя кампазіцыі з каляровых паліваных кафляў; наборная маёлікавая падлога з плітак разнастайных форм; умуроўка ў верхнюю частку сцен галаснікоў (керамічных збаноў) для паляпшэння акустыкі; невялікая таўшчыня апорных канструкцый. Прадстаўніком гарадзенскай школы дойлідства з'яўляецца Пётр-Міланег (Нежык), які працаваў у Горадзене на працягу дванаццаці-пятнаццаці гадоў (у 1180-я — 1190-я гады). У 1194 г. ён стаў асабістым архітэктарам кіеўскага князя Рюрыка Расціслававіча. Летапісец параўноўвае Пятра-Міланега з біблейскім дойлідам Веселіілам, а М. М. Карамзін пісаў: «Тады ж славіўся ў Кіеве дойлід Пётр-Міланег, будаўнік каменнай сцяны на беразе Дняпра над кляштарам Выдубецкім, такой дзівоснай для сучаснікаў, што яны гаварылі пра яе, як аб вялікім цудзе». Узорамі гарадзенскай школы дойлідства з'яўляюцца ў Горадзене — Ніжняя царква (12 ст.), Барысаглебская (Каложская) царква (2 палова 12 ст.), Прачысценская царква (12 ст.), княжацкі хорам (12 ст.), а таксама царква ў Ваўкавыску (сяр. 12 ст.).

У рэлігійным аспекце Гарадзенскае княства падпарадкоўвалася Тураўскай епархіі. Старажытнае летапіснае паданне захавала

наступнае сведчанне (перадаем на мове арыгінала): «Третие богомолие епископию постави в Турове в лето 6513 (па сучаснаму летазлічэнню гэта 1005 г. — В. Ш.) и придах к ней городы и погосты в послушание и священие, и благословские держати себе Туровской епархии: Пинск, Новогородок, Городен, Берестье, Волковыеск, Здитов, Неблестеск, Дубовица, Высоцко, Случеск, Коиысь, Ляхов, Городок, Смедяне, и поставих первого епископа Фому, и придах сёла, винограды, земли бортныя, волости со всеми придатками... Святому Спасу и Святой Богородице»[7].Апошні з Усеваладавічоў гарадзенскі князь Юры Глебавіч загінуў у 1241 г., баронячы Горадзен ад нейкіх захопнікаў. Доўгі час лічылі, што горад быў захоплены і спалены мангола-татарамі. Па словах П. Баброўскага, «ваеначальнік Кайдан уварваўся ў Гарадзенскае княства, асадзіў горад і пасля зацятага супраціўлення войск Юрыя захапіў яго. Юры загінуў, ягонае войска знішчана, замак спалены... горад ператварыўся ў груду руін»[8]. Сучасныя гісторыкі пакуль што не могуць знайсці археалагічных пацвярджэнняў гэтай падзеі, а існаванне хана Кайдана адмаўляецца.

У 1240-я гады Гарадзенскае княства падпадае пад уладу Міндоўга і тэрыторыя яго падпарадкоўваецца Наваградку, які ў сярэдзіне 13 ст. стаў цэнтрам даволі вялікага рэгіёна, вядомага сярод іншаземцаў пад назваю Чорная Русь. З 1249 года пачынаецца барацьба валынскіх князёў за гарады Гарадзенскага княства. Спачатку браты Даніла і Васілька Раманавічы разам з Львом Данілавічам захапілі Ваўкавыеск, Услонім і шмат іншых навакольных месц. Потым, у 1252 г., Даніла паслаў са сваім войскам Васілька з сынам Раманам і яны захапілі Горадзен і разрабавалі шэраг гарадоў Гарадзенскага княства. Міндоўг у адказ паслаў свайго сына Войшалка і той знішчыў дашчэнту Турынск на Валыні. Пад канец 1254 г. Войшалк, як гарадзенскі князь, памірыўся з Данілам і аддаў Раману Данілавічу Услонім, Ваўкавыеск і іншыя гарады, а сам прыняў манаства.

З 1270 г. Гарадзенскае княства падпарадкоўва ецца вялікаму князю Літоўскаму Трайдзену, які з 1275 г. разам з гарадзенцамі захапіў горад Дарагічын. Пасля гэтага на працягу 1275-1278 гг. галіцкія князі зрабілі некалькі паходаў на гарады Гарадзенскага княства з намерам захапіць і абрабаваць іх. У 1276 г. Услонімам завалодаў Уладзімір Васількавіч. За гэта Трайдзен знішчыў г. Каменя, а Уладзімір — Турск

---

[7] Белорусь в исторической государственной и церковной жизни. / Сост. Афанасий Мартос. — Буэнос-Айрес, 1966. Репринт. Мн., 1990. — С. 69.

[8] Бобровский П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния. Ч. 2. — СПб., 1863. — С. 758—759.

на Нёмане і ўсе навакольныя вёскі. У выніку гэтай барацьбы князем Услонімскім каля 1280 г. становіцца Васілько Раманавіч, а Ваўкавыскім — Мсціслаў Данілавіч.

У 1282 г. гарадзенскім князем становіцца брат Гедыміна Віцень, а з 1284 г. на Гарадзенскую зямлю абрушылася крыжацкая навала. Рыцары штурмавалі чатыры разы Наваградак, тры разы Лідскі замак, Ваўкавыеск, дваццадь разоў Горадзен. У бітвах з імі праславіў сваё імя гарадзенскі кашталян Давыд Гарадзенскі — сын князя Пскоўскага Даўмонта. Ён не толькі абараняў жыхароў Гарадзенскага княства, але і сам са сваімі ваярамі рабіў паспяховыя паходы на крыжацкія землі[9].

У 1347 г. «Гарадзенскім каралём» (Rex Gartena) становіцца Патрык Кейстутавіч, а з 1376 г. — Вітаўт Кейстутавіч, які атрымаў афіцыйны тытул «Гарадзенскі князь» (Dux grodnensis). Пры княжэнні Вітаўта Гарадзенскае княства вылучалася адметным эканамічным і культурным узроўнем. Гарадзенскія кавалі, ганчары, скарнякі, сталяры, цесляры, шаўцы выраблялі разнастайныя прылады працы, бытавыя рэчы, царкоўнае начынне, дзіцячыя забаўкі, жаночыя ўпрыгожванні. Горадзен быў важным гандлёвым горадам, куды прывозілі тавары не толькі з навакольных месц, але і з Прыбалтыкі, Прыдняпроўя.

У 1391 г. Ягайла дае Горадзену першы прывілей, па якому ён атрымаў частковае магдэбурскае права. Паступова горад становіцца другой сталіцай Вялікага княства Літоўскага. Пасля заключэння Гарадзельскай вуніі (1413 г.) удзельныя княствы ВКЛ ператварыліся ў ваяводствы. Тэрыторыя былога Гарадзенскага княства ўвайшла ў склад Трокскага ваяводства.

## ДРУГІ ПАДЗЕЛ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ І ГРОДЗЕНСКАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ 1793 г.

1793 год. Дзвесце гадоў прайшло з таго часу, калі Расія і Прусія ажыццявілі другі падзел Рэчы Паспалітай абодвух народаў — федэратыўнай дзяржавы, якая складалася з дзвюх самастойных краін: Вялікага княства Літоўскага (Беларускай рэчы паспалітай) і Польскага каралеўства (Польскай рэчы паспалітай). Што адбылося ў тыя далёкія гады: уз'яднанне Беларусі з Расіяй ці страта беларусамі сваёй дзяржаўнасці?

---

[9] Гл.: Ткачев М. А. Замки Белоруссии. — Мн., 1987. — С. 29-35.

75 год тэндэнцыйная савецкая навука сдвярджала, што пасля падзелаў Рэчы Паспалітай (у 1722, 1793, 1795 гадах) беларускі народ і яго зямля добраахвотна «воссоединились» з рускім народам у складзе Расійскай імперыі. Чамусьці забылі гісторыкі аб тым, што была беларуская дзяржава (Вялікае княства Літоўскае) і ў выніку падзелаў расійскі агрэсар захапіў яе тэрыторыю. У 1772 г. Расія анаксавала ўсходнія землі Беларусі, у 1793 г. — цэнтральную частку, у 1795 г. — заходнюю. Таму, на мой погляд, ніякага «ўз'яднання» Беларусі з Расіяй не было, а быў сапраўдны захоп, пасля якога беларусы на доўгі час трапілі ў няволю.

Сёння цікава і карысна ўспомніць старонкі гродзенскай гісторыі той цяжкай эпохі. І пачаць хроніку падзей трэба, відаць, не з 1793 г., а раней, калі ўжо адбываліся з'явы, стаўшыя прадвеснікамі падзелу і страты беларусамі дзяржаўнасці.

3 мая 1791 г. Чатырохгадовы (1788-1792) сейм прымае канстытуцыю, паводле якой скасоўваецца аўтаномія Вялікага княства Літоўскага і абвяшчаецца стварэнне ўнітарнай дзяржавы з агульнымі выканаўчымі органамі ўлады, бюджэтам і войскам. Юрыдычна беларускае гаспадарства перастала існаваць, але захаваліся яшчэ асобныя дзяржаўныя пасады і 15-тысячная «літоўская» армія. Згодна з канстытуцыяй 3 мая адмяняліся «ліберум вета», шляхецкія канфедэрацыі і выбарнасць каралёў, шляхціцы маглі займацца гандлем, а мяшчане — набываць зямельныя ўладанні, займаць цывільныя і ваенныя пасады на дзяржаўнай службе.

Канстытуцыя 3 мая і рэформы Чатырохгадовага сейма мелі ў цэлым прагрэсіўны характар, таму супраць іх выступілі рэакцыйныя групоўкі магнатаў і шляхты.

14 мая 1792 г. яны ствараюць Таргавіцкую (каронную) канфедэрацыю. Вялікую ролю ў ёй ігралі вялікі каронны гетман Ксаверы Враніцкі, польскі гетман Северын Жэвускі і Шчэнсны Патоцкі. Па згодзе з канфедэратамі Расія і Прусія ўводзяць у Рэч Паспалітую свае войскі.

Без бою былі заняты Браслаў, Ушачы, Бабруйск, Глуск, Нясвіж, Навагрудак, Слонім. Значныя сутычкі адбыліся пад Мірам (11 чэрвеня), Зэльвай (3 ліпеня), Мсцібавам (10 ліпеня), Брэстам (23 ліпеня).

25 чэрвеня, Пасля таго, як рускія войскі на чале з Крачэтнікавым захапілі Вільна, Шымон Касакоўскі арганізаваў у Літве і Беларусі канфедэрацыю, падобную Таргавіцкай.

6 ліпеня рускія войскі над камандаваннем Ю. У. Даўгарукава займаюць Гродна. Камендант мясцовай крэпасці М. Забела, маючы 14-тысячнае войска, не працідзейнічае гэтаму.

У кастрычніку Таргавіцкая канфедэрацыя пераязджае з Брэста ў Гродна. 18 лістапада выходзіць першы нумар газеты «Wiadomości Grodzieńskie» («Гродзенскія ведамасці») — органа канфедэратаў. Да снежня 1793 г. выйшла 12 нумароў. 28 лістапада Гродна наведвае М. І. Кутузаў.

12 студзеня 1793 г. Расія і Прусія падпісваюць канвенцыю аб другім падзеле Рэчы Паспалітай.

21 сакавіка ў Гродна прыехаў расійскі пасол у Польшчы Якаў Сіверс. На Гарадніцы, каля былога палаца Тызенгауза, яго сустракалі таргавічане, войскі якіх зрабілі ружэйны салют.

17 сакавіка ў Гродне адбываецца сесія генеральнай канфедэрацыі. С. Жэвускі пратэстуе супраць падзелу Рэчы Паспалітай.

22 красавіка прыехаў кароль Сігізмунд Аўгуст Панятоўскі. На занеманскім прадмесці яго сустракалі расійскія генералы, быў таксама салют з ружжаў. У Новым замку чакалі члены канфедэрацыі, міністры, сенатары і дамы. Асабіста прывіталі караля магістрат і кагал. Сіверс, назваўшыся хворым, не сустракаў Аўгуста II.

17 чэрвеня — 23 лістапада ў гродзенскім Новым замку праходзіў надзвычайны сейм Рэчы Паспалітай. Сеймавая зала выглядала наступным чынам: у адным канцы залы знаходзіўся трон караля, у другім — табурэт і столік для маршалка сейма Бялінскага. Справа і злева караля былі два рады крэслаў для сенатараў, а за імі — лаўкі для паслоў. Па абодвух баках ад маршалка знаходзіліся крэслы для маршалкаў двара і міністраў. Сярэдзіна залы была пустою, а за спінамі паслоў ішла галерэя з лаўкамі для гледачоў[10]. На сейме стварылася некалькі груповак: караля, Сіверса, Касакоўскіх, літоўская, патрыётаў (літоўскі пасол Ю. Краснодэмбскі, Ю. Кімбар, Гадашэўскі, С. Незабітоўскі, Алданоўскі).

21 чэрвеня на сейме пачынаецца абмеркаванне нотаў пасланнікаў, і 13 ліпеня быў заключаны акт дэмаркацыі межаў паміж Расійскай імперыяй і Прускім каралеўствам.

17 ліпеня кароль Аўгуст II Панятоўскі выступае на сейме з прадмовай, у якой радзіць паслам «покориться печальной необходимости, чтобы не ухудшить положения Речи Посполитой». Каб зразумець гэтыя слова караля, трэба ведаць, што ён знаходзіўся пад строгім наглядам расійскага пасла Я. Сіверса. Той падпарадкаваў Станіслава Аўгуста сваёй волі (гэта значыць, волі Расіі) і меў значны ўплыў на польскую ўнутраную і знешнюю палітыку.

---

[10] Апісанне залы гл. Реймонт В. Последний сейм Речи Посполитой. — Мн., 1994. — С. 107.

19-22 ліпеня заключаецца трактат паміж Расіяй і Польшчай аб падзеле апошняй.

17 жніўня сейм ратыфікуе трактат і такім чынам да Расіі адыходзіць цэнтральная частка Беларусі — рэшткі Полацкага, Віцебскага, Мінскае і ўсходнія часткі Навагрудскага, Брэсцкага ваяводстваў, Браслаўскі і Ашмянскі паветы з агульнай колькасцю насельніцтва 974 тыс. чалавек і Правабярэжная Украіна.

Увесь перыяд сейма адбываліся прыёмы і балі ў Сіверса, а таксама польскіх магнатаў. З Францыі прыйшла мода на грэчаскія сукенкі, апранутыя без жаночай кашулі, а на агалёныя ножкі апраналі кольцы. За ноч прапіваліся або прайграваліся ў карты тысячы[11].

2 верасня. Сіверс дае загад начальніку рускага гарнізона заблакіраваць выхады з горада і галоўныя вуліцы, акружыць замак, дзе засядае сейм. На двары і ў калідорах замка ўстанаўліваецца модная варта, а дванаццаць афіцэраў размяшчаюцца ўнутры сеймавай залы. Паслы сейма ўпускаюцца ў залу, але не выпускаюцца з яе. Аднак хутка, па просьбе дэлегацыі сейма, Сіверс выводзіць салдат і афіцэраў з замка. Пасяджэнне адбывалася 12 гадзін (да 4 гадзін раніцы).

15 верасня. Таргавіцкая канфедэрацыя распушчана і заменена Гродзенскай. Працягваюцца балі. Пышна святкуюць імяніны караля. П. Зубаў дае баль. Іграе італьянскі аркестр, у тэатры адбываедца канцэрт.

23 верасня. Арыштаваны чатыры найбольш актыўныя сябры апазіцыі: Краснадэмбскі, Шыдлоўскі, Мікорскі і Скаржынскі, але хутка былі адпушчаны па просьбе дэпутацыі. На выхадах з горада пастаўлены пікеты, каб не выпускаць паслоў без пашпарта, падпісанага Сіверсам. Замак акружаны двума батальёнамі, а ля брамы ўстаноўлены чатыры гарматы, каля якіх стаяць артылерысты з запаленымі фіцілямі. На двары замка пастаўлены пікет з 50 чалавек. У сеймавую залу праходзіць начальнік рускага гарнізона. Па прыбыцці караля пачынаюцца дэбаты па праекту дагавора з Прусіяй. Пытанне праекта перарываецца шумам апазіцыі, значная частка паслоў спіць.

24 верасня. З гадзіны папоўначы. Ніхто з паслоў не выступае. Пры агульным «мёртвом» маўчанні маршалак сейма тройчы запытаў ці згодны на падпісанне ўмоў. У адказ цішыня. Тады ён заяўляе аб аднагалосным прыняцці праекта дагавора з Прусіяй (вокліч аднаго з дэпутатаў: «Молчание есть знак согласия»). Па гэтаму дагавору да

---

[11] Гл.: Реймонт В. — С. 20—21, 42—44; Jodkowski J. Grodno.— W., 1922.—S. 38-43; Lopalewski T. Miedzy Niemnem a Dzwina — Poznan, 1990.-S. 161.

Прусіі адыходзіла амаль уся Вялікая Польшча, частка Мазовіі і Кракаўскага ваяводства. Такім чынам, у 1793 г. адбыўся не «нямы сейм» (ён быў І.ІІ.1717 г.), а «нямое пасяджэнне». У 3.30 Станіслаў Аўгуст зачыніў яго.

5-16 кастрычніка. Заключэнне трактата аб'яднання, сяброўства і саюза паміж Расійскай імперыяй і каралём Польшчы. Згодна з яго ўмовамі, кожны падпісаўшыйся бок навінен прыйсці на дапамогу другому ў выпадку нападу на аднаго з іх. Польшчы забаранялася ўступаць у саюзы, заключадь дамовы, абыходзячы Расію. Рускае дваранства і польская шляхта атрымалі роўныя правы ў абедзвюх дзяржавах. Расія гарантавала будучую польскую канстытуцыю.

На апошнім пасяджэнні 23 лістапада яна была прынята. «Гродзенскай» канстытуцыя ў асноўным паўтарала канстытуцыю 1775 г. з уключэннем шэрагу палажэнняў канстытуцыі 1791 г.: 1) аднаўленне Пастаяннай рады (савета) — выбарнага органа пры каралі, на якім прымаліся рашэнні кіруючага характеру (рада мела 5 дэпартаментаў: паліцыі, ваенны, замежных спраў, юстыцыі, казначэйства); 2) аднаўленне выбарнасці польскіх каралёў; 3) сейм прызнаваўся вышэйшым заканадаўчым органам дзяржавы (ён склікаўся кожныя 4 гады), рашэнні ў якім прымаюцца большасцю галасоў (важнейшыя — большасцю ў 2/3, астатнія — простым); 4) пры рашэнні кардынальных спраў (асноўных законаў) каралю давалася права «liberum veto» на сеймавыя рашэнні; 5) беззямельная шляхта пазбавілася палітычных правоў; 6) мяшчанства атрымлівала права асабістай непарушнасці і набываць зямельную маёмасць; 7) захоўвалася гарадское самакіраванне; 8) пацвярджаліся ўсе папярэднія дваранскія прывілеі, уключаючы і поўную ўладу шляхты над сялянамі; 9) скасаваны інстытут прадстаўнікоў ад гарадоў у сейме[12].

Такім чынам, Гродзенская канстытуцыя, адхіляючы праграму Таргавіцкай канферэнцыі, не была простай рэстаўрацыяй артыкулаў канстытуцыі 1775 г. Маючы на ўвазе рэвалюцыйнае становішча ў Польшчы, царызм быў прымушаны ісці на некаторыя ўступкі прагрэсіўна настроенай сярэднепамеснай шляхце і вярхушцы трэцяга саслоўя. Гэтым хацелі абезгаловіць народны рух і папярэдзіць узброенае паўстанне.

---

[12] Бардах 10., Леснодорский Б., Пиетрчак М. История государства и права Польши. — М. 1980. — С. 282, 283, 302, 303; История Польши. В 3-х т. Т. 1 / Под ред. В. Д. Королюка и др. М. 1954. — С. 403-404.

Але яно ўсё ж такі адбылося — і пра гэтыя падзеі наш наступны нарыс.

## «ЗА ВОЛЬНАСЦЬ, РОЎНАСЦЬ, НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ»

24 сакавіка 1794 г. на Рынку Кракава Тадэвуш Андрэй Бонавентура Касцюшка дае ўрачыстую прысягу «ваяваць за Айчыну і зламаць яе аковы». У ратушы ён прачытаў і падпісаў Акт паўстання, які потым падпісалі ўсе жадаючыя (іх было некалькі тысяч). Пасля Касцюшкі ў ратушы выступіў аратар (Э. Ліноўскі — пасол на Чатырохгадовым сейме), які ў сваёй прамове адзначыў, што пакуль ён тут гаворыць, дойдзе справа, падобная кракаўскай, і да Варшавы, Гродна і Вільні. Ён не памыліўся.

У ноч з 22 на 23 красавіка атрад Якуба Ясінскага атакаваў і захапіў Вільню: 986 рускіх былі ўзяты ў палон, камандзір мясцовага гарнізона Н. Д. Арсеньеў арыштаваны, гетман Шымон-Марцін Касакоўскі павешаны. Вырвацца ўдалося толькі капітану М. А. Тучкову і маёру Раўтэнсбергу. Разам са значнай колькасцю гармат яны адступілі да Гродна. Па дарозе палілі вёскі, двары, корчмы. А што адбывалася ў Гродна?

Прускі пасол Л.-Г. Бухгольц апавядаў у сваім лісце Фрыдрыху Вільгельму II: «У Гродне павінны былі здарыцца такія ж падзеі, але генерал князь Цыцыянаў, які там начальстваваў, адышоў з горада са сваім гарнізонам і заняў вельмі выгадныя пазіцыі каля Гарадніцы над Нёманам, дзе акапаўся»[13]. Пад сваім кіраўніцтвам Павел Дзмітрыевіч Цыцыянаў меў 20 гармат і 6615 чалавек з Інгерманладскага карабінернага, Санкт-Пецярбургскага грэнадзёрскага, Рэвельскага палкоў і казацкага палка Вяршыніна.

Варожыя адносіны шляхты і гараджан прымусілі генерала адвесці войскі ў ваколіцы Гродна, дзе ён заняў добрую пазіцыю і пагражаў гораду артылерыйскім абстрэлам. Сюды падышлі рэшткі рэзерву Віленскага корпуса (8 гармат і 2007 чал.), а таксама іншыя рускія часці, якія адыходзілі з Літвы і заходніх раёнаў Беларусі.

Цыцыянаў прымусіў гродзенцаў заплаціць кантрыбуцыю. «Ведамость, коликое число взято в городе Гродне разных ведомств контрибуционной казны» прыкладзена была да рапарта Цыцыянава

---

[13] Bucholtz L. Powstanie Kościuszkowskie w świetle korespondencji posła pruskiego w Warszawę. — W., 1983. — S. 134.

мінскаму генерал-губернатару Т. Туталіну ад 16 мая. У ёй напісана: «Различность монет есть следующая:

| | | | |
|---|---|---|---|
| 2652 червонца (дуката — В. Ш.) | на | 7956 | рублёв, |
| Галанским талерам | на | 285 | рублёв, |
| Прусским талерам | на | 117 | рублёв, |
| Польским злотым и полузлотым | на | 1846 | рублёв, |
| Целковым рублям | на | 20211 | рублёв, |
| Русскою мелкою монетою | на | 71137 | рублёв. |
| В с е г о | на | 101552 | рублёв». |

Каля 14 мая войскі Цыцыянава пакінулі Гродна. Генерал завалодаў касамі казначэйскай камісіі і Гродзенскай каралеўскай эканоміі, а таксама запасамі сукна (227 паставаў) былых мануфактур А. Тызенгаўза. Цераз Скідаль, Шчучын, Навагрудак ён адышоў у напрамку на Мінск. Тут ваенная здабыча была пакінута, і пасля адпачынку і рэарганізацыі корпус (5 тыс. чал., артылерыя) зноў вярнуўся на Гродзеншчыну.

9 мая ў Сакулцы мясцовыя жыхары і прадстаўнікі гродзенцаў па ініцыятыве Францішка Боўфала і пад аховай невялікай каманды татарына Азулевіча абвясцілі аб далучэнні да паўстання і выбралі свой орган кіравання — Гродзенскую парадкавую камісію. Старшынёю стаў Боўфал, камісарам— Канопка. Гродзенцы далучыліся да паўстання згодна Кракаўскага акта, але прыслухоўваліся і да загадаў і распараджэнняў Рады Нацыянальнай Правінцыйнай (інакш — Літоўскай Рады). Ад Гродзенскага павета ў яе былі абраны Дамінік Матакевіч, ад Гродна — Францішак Мушынскі [14].Неўзабаве пасля пераезду Гродзенскай парадкавай камісіі ў Гродна тут апынуўся Міхал Клеафас Агінскі. У сваіх успамінах ён піша, што за горадам бачыў «аддзел салдат... падобна як паспалітае рушэнне шляхецкае і народ некалькі тысяч асоб, зацікаўленых навучэннем гэтага новага войска». Пабываў Агінскі і на пасяджэнні парадкавай камісіі, якая засядала ў Новым замку, у той самай зале, дзе адбывалася «нямое пасяджэнне» 1793 г. Камандзір віленскіх стралкоў убачыў тут 30 чалавек, большасць з каторых ён добра ведаў асабіста[15]. Напрыклад, Яўхіма Храптовіча, які якраз і запрасіў Агінскага на пасяджэнне камісіі.

---

[14] Гродно. Энциклопедический справочник. — Мн., 1989. — С. 121; Kraszewski J.— I. Polska w czasie trech rozbiorow. 1772-1799. T. III — W., 1903. - S. 455.

[15] Емяльянчык У, Паланез для касінераў. — Мн., 1994. — С. 76. Ogiński M. Pamiętniki o Polsce i polakach od 1788 az do końca roku 1815. T. I — Poznan, 1870. — S. 317-318.

Адной з галоўных яе спраў быў кантроль за тым, каб сялян моцна не прыгняталі. 7 мая баў выдадзены, а 30 мая абвешчаны вядомы Паланецкі ўніверсал Касцюшкі. Ён абмяжоўваў асноўныя павіннасці сялян, гарантаваў ім апеку ўрада і справядлівасць. Гродзенская парадкавая камісія таксама абвясціла ўніверсал і распрацавала таксу найму працаўнікоў, якую адаслалі ў Цэнтральную Дэпутацыю, адтуль дакумент накіравалі ў Найвышэйшую нацыянальную раду і апошняя выдала «Палажэнне найму работнікаў», узяўшы за аснову прапановы Гродзенскай камісіі. Выканаць Касцюшкаўскі ўніверсал у ваенны час ды яшчэ пры супраціўленні заможнай шляхты было немагчыма, таму камісія магла толькі неяк рэагаваць на скаргі сялян, напрыклад, з каралеўскай эканоміі, якія выконвалі вайсковыя абавязкі[16]

З 23 жніўня па 1 кастрычніка ў Гродне мела сваю рэзідэнцыю Цэнтральная Дэпутадыя — выканаўчы орган паўстанцаў у межах ВКЛ пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай. Вось што гаворыцца ў дзённіку Найвышэйшай нацыянальнай рады пра 93 сесію за 25 жніўня: «Чыталі экспедыцыю ад Цэнтральнай дэпутацыі ВКЛ з Гродна, датуемую 23 жніўнем з данясеннем, што як раз начала пасяджэнне ў Гродна і аб гэтым ген. Макраноўскаму, які стаіць у абозе пад Бярозаўкай; што выдала дыспазіцыю перавозкі серабра, абутку і палатна ў Варшаву; што забрала ад Рады (маецца на ўвазе Найвышэйшая Літоўская Рада, якая існавала да Дэпутацыі — В. Ш.) 100.000 злотых у наяўнасці і ў банкавых білетах 150.000, і аддзел харчавання гэтай Дэпутадыі ўзяў 100.000 злотых у банкаўскіх векселях, нарэшце, што і іншыя на цяперашнія патрэбы сродкі ўчынілі»[17].

У Дэпутацыю ўваходзілі памяркоўныя дзеячы паўстання: Ю. Несялоўскі, А. Тызенгаўз, Е. Белапятровіч, Т. Высагерд, В. Гарэцкі, С. Мірскі, Б. Марыконі, Д. Пільхоўскі і іншыя.

Яны па чарзе ўзначальвалі кіраванне і мелі 28 намеснікаў, Дэпутацыя была абмежавана ў сваіх дзеяннях і практычна выконвала загады Начальніка паўстання Касцюшкі і Найвышэйшай Нацыянальнай рады: папаўненне літоўскага (беларускага) войска, забеспячэнне яго зброяй, боепрыпасамі, харчам і фуражом. Існаванне Дэпутацыі ў Гроднеператварыла горад у часовую сталіцу ВКЛ.

У пачатку верасня становішча паўстанцаў у Літве і Беларусі пагоршылася. Прускія войскі ўвайшлі на тэрыторыю Жмудзі. 8 верасня

---

[16] Korzon T. Wewnetrzne dzieje Polskie za Stanisława Augusta. T. 1. - Krakow, 1897. — S. 499-500.

[17] Akty powstania Kosciuszki. T. II. — Krakow, 1918. — S. 408.

ў Ковелі сканцэнтраваўся атрад А. В. Суворава, адбылося яго злучэнне з корпусам генерал-маёра Ф. Ф. Буксгеўдэна. 11 верасня да іх далучыўся корпус І. І. Маркава. Усе войскі Сувораў аб'яднаў у адзін корпус на чале з П. С. Пацёмкіным. Гэтая сіла ішла на Беларусь.

13 верасня Я. Ясінскі з Гродна пісаў Т. Касцюшку: «...Дэпутацыя Цэнтральная, якая ёсць найвышэйшай уладай правінцыі, не дзейнічае, разарвалася сувязь з цэнтрам, таго — з Радай, Рады — з народам. Ніхто не ведае, да чаго трэба імкнуцца». Сам Якуб паслаў Касцюшку рапарт з праектам арганізацыі дзеянняў супраць прусакоў. Ён прапанаваў згуртаваць усе ваенныя сілы пад Гродна («абавязкова ў Гродне, не дзе-небудзь»), таму што тут ёсць вялікі магазін (склад), які хаця б месяц пракорміць. Сюды прыйдуць часці Рамуальда Гедройца, Тамаша Ваўжэцкага, батальёны стральцоў з Ломжы. Ясінскі прасіў у Начальніка паўстання 9 гармат, якія б ён падзяліў бы пароўну на тры створаныя дывізіі. З Гродна войска пайшло б у Прусію[18].

16 верасня армія Суворава ўвайшла ў Кобрын, а на наступны дзень корпус генерала К. Серакоўскага (16 тыс. чал. і 28 гармат) пацярпеў ад яе паражэнне пад Крупчыцамі (15 вёрст ад Кобрына), а 19 верасня — пад вёскамі Коршын, Дзебрын (6 вёрст ад Брэста). Серакоўскі збег у Седльцы. Харугвы паўстанцаў пачалі адступаць у Польшчу. Гродна з наваколлем засталося востравам паўстання перад наступаючымі расійскімі войскамі. Трэба было ратаваць становішча, таму Касцюшка звяртаецца да Серакоўскага.

Юліян Урсін Нямцэвіч — ад'ютант і сакратар Касцюшкі, ўспамінаў: «Касцюшка ўсё ж такі не губіў сэрца, як вуж, прыціснуты нагой вандроўніка, яшчэ круціцца ў розныя бакі і прыціснуўшую яго ногу опрабуз параніць, так Касцюшка на ўсе бокі кідаўся і абараняўся. Звярнуў упачатку свой погляд на Літву, і, узяўшы мяне з сабою, без эскорту кінуўся ў корпус Макраноўскага пад Гродна. Імчаліся мы поштай, прыпыніліся толькі ў Седльцы (12 міль ад Варшавы — В. Ш.) у гетманшы Агінскай»[19].

У лагер Ст. Макраноўскага Касцюшка прыехаў 29 верасня. Макраноўскі быў назначаны камандуючым рэшткамі літоўскай (беларускай) арміі, Ясінскі і Ваўжэцкі — камандзірамі дывізій. Касцюшка напісаў наступны загад: «Засцерагаю ўсё войска, што, калі хто будзе турбаваць размовамі аб тым, што супраць маскалёў нельга

---

[18] Падрабязнасці плана гл.: Powstanie Kosciuszki / Opr. Wl. Bartnowski. — W., 1959. — S. 29-30.
[19] Niemcewicz J. U. Pamiętniki czasów moich. — Paryż, 1848. S. 217.

ўтрымацца, або ў час бітвы будзе крычаць, што маскалі ў нас у тыле, маскалі нас адрэзваюць і нешта падобнае, той па данясенню каманды будзе адразу ўзяты ў аковы, аддадзены суду, і, па доказу віны, расстраляны. Загадваю ген. Макраноўскаму, каб у час бітвы частка пяхоты з артылерыяй заўсёды стаяла ззаду лініі з пушкамі, заладаванымі карцеччу, з каторых будуць страляць у бягучых. Усякі няхай ведае, што, ідучы ўперад, атрымлівае перамогу і славу, а паказваючы тыл, сустракае сорам, немінуючую пагібель. Калі паміж служачымі ў войску ёсць такія, хто ўпэўнены, што маскалёў нельга пабіць, людзі абыякавыя да Айчыны, вольнасці і славы, няхай тыя загадзя абвесцяць аб сваім звальненні ад службы. Мне цяжка, што я павінен устанаўліваць такія строгія правілы».

Касцюшка ўспамінаў: «Якіх-небудзь дзесяткі вашых продкаў маглі заваяваць дзяржаву Маскоўскую, прывесці ў аковах цароў яе, вызначыць маскалям владык, а вы, нашчадкі тых слаўных палякаў, можаце сумнявацца ў поспеху барацьбы за айчыну, вольнасць і дамы вашы, за крэўных і сяброў, і лічыце непераможнымі гэтыя драпежныя шайкі, якія бяруць над вамі верх толькі гіры вашай труслівасці»[20].

Ад Макраноўскага Касцюшка паехаў у Гродна, дзе, па сведчанню А. В. Суворава, меў савет у Гродзенскай парадкавай камісіі. У горадзе Начальнік паўстання, відаць, быў 30 верасня і займаўся тут мабілізацыяй гараджан і шляхты. Было сфарміравана новае войска, якое налічвала каля 5 тысяч чалавек. Каб падзякаваць лепшых са сваіх землякоў за адданасць, мужнасць і самаахвярнасць, Касцюшка ўзнагародзіў асабістым залатым пярсцёнкам Ясінскага, Т. Ваўжэцкага, Макраноўскага, маёра Корсака, Р. Гедройца, Я. Гарноўскага. На пярсцёнку быў надпіс: «Айчына — абаронцу свайму». З Гродна Касцюшка хутка вярнуўся ў лагер пад Варшаву, у Макраны. Нямцэвіч запрыкмеціў, што «звычайна мяккі, словаахвотлівы, аматар пажартаваць, Касцюшка, як вярнуўся з Гродна, зачыніўся. Што і гаварыць, справа кепская. Рускія занялі Вільню, не сёння-заўтра займуць і Гродна»[21].

Лёс паўстання быў вырашаны. 10 кастрычніка казацкі атрад генерал-маёра Ф. П. Дзянісава з корпуса І. Е. Ферзена нанёс буйнае паражэнне паўстанцам ля мястэчка Мацяёвіцы, на правым беразе Віслы. У гэтым сямігадзінным баі, відавочна, прымалі ўдзел і

---

[20] Гл.: Tadeusz Kosciuszko w historii i tradycji. — W., 1968. S. 22.

[21] Цыт. па: Островер Л. Тадеуш Костюшко. — М., 1961. — С. 219; Емяльянчык У. Паланез для касінераў. — Мн., 1994. — С. 135—136.

гарадзенцы, бо Нямцэвіч у сваіх успамінах сярод удзельнікаў называе касіянераў брэсцкіх і літоўскіх (літоўска-гродзенскіх?). Касцюшка, як вядома, быў у баі некалькі разоў паранены і папаў у палон разам з пяццю іншымі генераламі.

Відавочна ў тыя дні Рапнін напісаў графу Разумоўскаму: «Сообщаемые мною известия могут дойти до Вас очень поздно; но тем не менее я могу сообщить вам, что Гродно, Ковно и Ромни, также как и вся Литва до Немана и вся Самогития усмирены и заняты нашими войсками... Теперь ваше дело, господа, обсудить в ваших кабинетах: как поступить с завоеванными, я же желаю от всей души возвратиться к своему домашнему очагу, потому что уже начинаются морозы...»[22]

11 кастрычніка ў Гродне, занятым рускімі войскамі, выйшаў надрукаваны ўніверсал (адозва) Цыцыянава да сялян «каб усялякае паслушанне згодна дадзеных традыцый, не аглядваючыся на былыя ўніверсалы Касцюшкі, аказвалі, пашу апрацоўвалі, добра засявалі, будынкі даглядалі, масты, дарогі рамантавалі, чынш, дзякло, аброк, падаткі выплочвалі і збіралі»[23]. Такім чынам, вярталіся з царскімі войскамі і «даўнія традыцыі». 20 кастрычніка камісар Гродзенскай парадкавай камісіі Канопка даставіў у Варшаву на «трох параконных фурманках» серабро, грошы і архіў сваёй камісіі.

4 лістапада пад ударамі «чудо-богатырей» Суворава пала Варшава. У яе абароне прымалі ўдзел і гродзенцы. Пасля паражэння паўстання «господа» вырашалі лёсы «завоёванных». Асноўная маса арыштаваных адпраўлялася ў Смаленск, нейкая частка — у Гродна. Да данясення Рапніна імператрыцы Кацярыне II ад 11 студзеня 1795 года прыкладзены спіс «афіцэраў войск літоўскіх», якія прымалі ўдзел у захопе Вільні. Сярод іх двое, якія сядзелі пад аховаю ў Гродне: артылерыйскі капітан Калантай — за тое, што вёў гетмана Касакоўскага пад арышт і «возмущал всевозможно чернь к бунтованию»; паручнік Міхалоўскі — за тое, што застрэліў вартаўніка маёра Дзюгамеля і вёў гетмана, трымаючы за грудзі, да самага арсенала, «возмущая при том чернь к бунтованию произнесением всяких бранных слов против него, гетмана Коссаковского»[24]. У Гродне быў арыштаваны генерал-паручнік Мірбах, курляндскі шляхціц, які бунтаваў сялян супраць памешчыкаў.

---

[22] И. Сборник императорского русского исторического общества. Т. XVI. — СПб., 1875. — С. 243. (Далее Сб. ИРИО).
[23] Korzon T. Opis cit. — S. 503—504.
[24] Сб. ИРИО. Т. XVI. — С. 90.

12 лістапада 1793 г. Рэпнін быў прызначаны Эстляндскім і Літоўскім генерал-губернатарам. Гродна стаў яго рэзідэнцыяй і цэнтральным урадавым пунктам для кіравання і мірнага ўладкавання літоўскіх губерняў. Землі ВКЛ, якія ўвайшлі ў склад Расійскай імцерыі, былі падзелены на тры часткі з вызначэннем «первенствующих мест» у Вільні, Гродне, Коўна.

28 лістапада Рапнін пісаў у данясенні Кацярыне II: «Вчера приехав сюда в Гродно, сегодня представлялись мне здешние жители, между коими находится довольное число и довольно знатного шляхетства, которых всех уверил я в милости Вашего императорского Величества ко всем спокойно живущим, искренне отставшим от скверности мятежа, и тако ж повинующимся Высочайшей Вашего императорского Величества власти, припомнив им при том опытом ими дознанную руку Божию, караюцую всякое предательство, и что прилежно затем смотрено будет, дабы не были смешаны добрые со злыми, но чтобы всякий получил достойное по делам его. Все они приняли сие объявление со всеподданнейшею благодарностью, а мое напоминание с должным повиновением, и не приметил я, чтобы кто оным оскорбился; впрочем, я обласкал их всячески и сколько пристойно было»[25].

1 снежня 1795 г. насельніцтва далучаных тэрыторый прынесла прысягу на вернападданства Кацярыне II. У гэты дзень у Гродне каля 9 гадзін раніцы на плошчы (цяпер Савецкай) стаялі войскі ў поўнай параднай форме. Раздаўся першы выбух гарматы — знатныя асобы пачалі збірацца ля дома генерал-маёра графа Палена, астатнія — каля царквы. А 10-й гадзіне адбыўся другі выбух гарматы — гэта быў сігнал збору вышэйшых грамадзянскіх чыноў і важных асоб мясцовага дваранства на чале з Паленым у доме генерал-губернатара, а духавенства — каля царквы. У палове адзінаццатай генералгубернатар і ўсе прысутныя пайшлі ў царкву. Епіскап прачытаў Маніфест (у час гэтага гарматы выстралілі 101 раз), пасля адбыўся малебен удзячнасці за здароўе Яе імператарскай Вялікасці. Нарэшце зачыталі прысягу на вернападданства Кацярыне II і яе спадкаемцам, якую ўсе паўтаралі «ад слова да слова». Вусная прысяга была пацверджана пісьмова для кожнага саслоўя на асобым месцы.

9 ліпеня 1795 г. у Гродне пад старшынствам Рапніна было заснавана Вярхоўнае Літоўскае Кіраванне. 25 лістапада ў Новым замку Станіслаў Аўгуст Панятоўскі падпісаў сваё адрачэнне ад прастолу і

[25] Там сама. — С. 54.

такім чынам пацвердзіў юрыдычна трэці падзел Рэчы Паспалітай. Вырашаючы лёс караля, Кацярына II пісала яму, што звесткі аб небяспецы, якой падвяргаецца кароль «сярод разнузданага народа варшаўскага прымушаюць мяне жадаць, каб Ваша Вялікасць як мага хутчэй пераехалі з гэтага вінаватага горада ў Гродна»[26]. Так Гродна стаў да лістапада 1796 г. прытулкам апошняга польскага караля пасля пагібельных для яго бур 1794 года.

## ПАД ПРОЗВІШЧАМ ГЕРЦАГА ВІЧЭНЦКАГА, або НАПАЛЕОН БАНАПАРТ У СМАРГОНІ І АШМЯНАХ

Хто толькі ні пісаў пра гэты цікавы сюжэт «Напалеон у Смаргоні і Ашмянах»? Успомнім гістарычную хроніку «Напалеон» Аляксандра Дзюма, раман «Спаленая Масква» Грыгорыя Данілеўскага, «Латнік. Апавяданне партызанскага афіцэра» Аляксандра Бястужава-Марлінскага, манаграфію «Напалеон Банапарт» Альберта Манфрэда, раман «Кутузаў» Ляонція Ракоўскага, нарысы Барыса Клейна і Кастуся Тарасава, публікацыі краязнаўцаў У. Зінкевіча, І. Сцяпуніна, У. Шумава, В. Кацнельсона, З. Ленартовіча, Д. Гаўрыліна.

Якіх толькі паданняў і казак ні прачытаеш у гэтай літаратуры! Напрыклад, аб пакушэнні на жыццё Напалеона ў Ашмянах, або як ён еў там амаль жывую курыцу, раздзіраючы яе рукамі. Пра старую карчму ў Ашмянах, дзе як бы начаваў Напалеон і застаўся надпіс: «Napoleon premier» («Напалеон першы»), а калі там была кватэра Кутузава, дык той асабіста дапісаў: «et dernier» («і апошні»). А яшчэ мне гаварыді пра тое, што ёсць у ваколіцах Ашмян магіла графіні Крамаравай, якая спрабавала забіць французскага імператара, і недзе схавана карэта, у якой збег ён у Францыю.

Вось і хочацца сёння аддзяліць зерне ад пустазелля, але зрабіць тэта асцярожна, каб не выплюхаць дзіця разам з бруднай вадою. І дапамогуць у гэтым новыя гістарычныя крыніцы, якія, відаць, не заўважылі мае папярэднікі.

Звернемся да мемуараў генерала і дыпламата, чалавека, які ўвесь час вайны 1812-1813 гг. знаходзіўся пры Напалеоне, Армана Каленкура, і даведаемся, калі ўзнікла ў імператара думка аб тым, каб пакінуць сваю армію і збегчы ў Францыю. Ён піша: «Талочын. Вечарам, калі

[26] Милютин Д. М. Гродна ў 1794, 1795, 1796//Гродненские епархиальные ведомости. — 1904. — № 43. — С. 1248; Швед В. В. По следам Гродненской старины. — Гродно, 1993. — С. 12-13.

Напалеон паклаўся спаць, Дару і Дзюрок размаўлялі пра паветраны шар, каб увезці Напалеона. На наступны дзень, 23 лістапада дзяржаўная канцылярыя паліла свае паперы. Напалеон пажартаваў: «Іх паветраны шар сапраўды не быў бы лішні» і абмеркаваў з Каленкурам, што трэба падрыхтаваць для ад'езду. У Талочыне Банапарт даведаўся аб эвакуацыі французаў з Мінску і быў гэтым ашаломлены. Ваенны выпадак меў уплыў на рашэнне пакінуць «паміраючую армію». 29 лістапада ў в. Камень Нападеон вырашае ехаць у Францыю, а 3 снежня ў Маладзечна ад'езд яго, як успамінае Каленкур, — «становіцца неабходным, ён спяшаецца ехаць, пакуль дарогі больш надзейныя»[27],

Пісьменнік Л. Ракоўскі, які, дарэчы, прытрымліваецца гістарычных фактаў больш-менш шчыльна, у сваім рамане прыводзіць такую размову Напалеона з Каленкурам і Даву:

- Няма чаго адкладваць на доўгі час. Я еду паслязаўтра з гэтага... як яго... з Шамона, — сказаў Напалеон.

- Са Смаргоні, — паправіў Каленкур.

- Так, так. І трымаць усё ў найстражэйшым сакрэце, — загадаў імператар[28].

У Маладзечна быў падрыхтаваны 29-ы бюлетэнь Напалеона (яго празвалі «пахавальным»). Ён ні прымяншаў і ні ўпрыгожваў страты французаў і таму выклікаў у Францыі і Еўропе надзвычайныя ўражанні. Але дзіўна шакіравана гучала заключная фраза бюлетэня: «Здароўе Яго Вялікасці ніколі не было лепшым». А. Манфрэд лічыў, што гэта азначала: «Леў атрымаў цяжкія раненні, але ён не мёртвы, ён яшчэ захоўвае моц, ён небяспечны. Сцеражыцеся!»[29].

Напалеон бачыў немінучую пагібель арміі і не хацеў рызыкаваць сабою дзеля асуджаных на смерць яе рэшткаў. Трэба ехаць у Парыж, каб растлумачыць 29-ы бюлетэнь, напомніць аб сабе, аб сваёй уладзе і набраць новае войска для новай кампаніі. Для Напалеона, па словах Е. Тарле, «рускі паход быў толькі прайгранай партыяй. Ён быў ужо заняты новай, падрыхтоўваемай партыяй і абдумваў, як лепш яе выйграць»[30].

5 снежня Напалеон каля паўдня апынуўся ў Смаргоні. Тут яго чакалі два чалавекі: адзін з членаў часовага ўрада ВКЛ (прозвішча знайсці не ўдалося) і ад'ютант граф ван Хагендорп, губернатар Вільні.

---

[27] Коленкур Арман. Мемуары. Поход Наполеона в Россию. М. 1943. — С. 254-256, 267, 273.

[28] Раковский Л. Кутузов. — Л., 1986. — С. 640-641.

[29] Манфред А. З. Наполеон Бонапарт. — М., 1987. — С. 638.

[30] Тарле Е. В. Сочинения. Т. 7. — С. 725.

Імператар паразмаўляў з імі і хутка адаслаў назад. Аб чым была размова невядома, можна толькі здагадвацца, што рэч ішла пра ад'езд Напалеона і каб яго чакалі ў Вільні. Пасля размовы Напалеон прадыктаваў Каленкуру загад:

«Смаргонь, поўдзень 5 снежня.

Імператар выязджае ў 10 гадзін вечара. Яго суправаджаюць 200 чалавек з ягонай гвардыі. Пасля перакладнога пункта паміж Смаргонню і Ашмянамі яго суправаджае да Ашмян маршавы полк, які знаходзіцца ў чатырох лье адсюль і перадаць распараджэнне гэтаму палку праз генерала ван Хагендорпа.

150 адборных гвардзейскіх кавалерыстаў будуць пасланы на адлегласць аднаго лье ад Ашмян. Штаб маршавага палка і эскадрон гвардзейскіх уланаў будуць размешчаны на этапах паміж Смаргонню і Ашмянамі...

Імператар паедзе з герцагам Вічэнцкім у экіпажы Яго Высокасці і наперадзе — гаспадзін Вансовіч, ззаду — прыдворны лакей; обер-цырымоніймайстар граф Лабо, адзін прыдворны лакей і адзін рабочы —у калясцы; барон Фэн (сакратар кабінета імператара — В. Ш.), прыдворны лакей Канстан, захоўвальнік партфеля, і адзін канцылярскі служачы — у калясцы...»

Жыццё ўнясе ў загад свае карэктывы, але запомнім, што гаворыцца пра экіпаж імператара і дзве каляскі, або, інакш кажучы, пра тры карэты, ды яшчэ пра транспарт, на якім паедзе Вансовіч (як мы потым даведаемся, гэта сані). Называемыя мною вышэй даследчыкі гэтага сюжэту амаль усе пішуць толькі пра адну карэту Напалеона.

Каля сёмай гадзіны вечара ў стаўку, якая размяшчалася ў памешчыцкім палацы, пачалі збірацца маршалы і генералы. Прыйшлі: неапалітанскі кароль, маршал Іаахім Мюрат; віцэ-кароль Італіі камандзір корпуса Яўген Багарнэ і маршалы — герцагі: Эльхінгенскі — Мішэль Нэй, Трэвізскі — Эдуард Адольф Марцье, Істрыйскі — Жан-Батыст Бес'ер, Данцыгскі — Франсуа-Жозеф Лефэвр, князь Экмюльскі Людовік-Нікала Даву. Яны ўтварылі свайго роду нараду, хаця Напалеон ні з кім не раіўся і нічога не абмяркоўваў. Відаць, быў прачытаны 29-ы бюлетэнь. Затым Напалеон аб'явіў аб сваім рашэнні адправіцца ў Парыж і запрасіў усіх выказаць свае погляды ца гэта. Ніхто не пярэчыў, бо разумеў, што гэта дарэмна.

Вось што піша пра гэта ўдзельнік нарады Каленкур: « Ён зрабіў выгляд, што перадае гэты праект на іх абмеркаванне (але мы ўжо ведаем, што пытанне было вырашана 29 лістапада — В. Ш.), і ўсе аднагалосна сдвярджалі, што ён павінен ехаць. Былі выказаны ўсе тыя

доказы, якія мы раней абмяркоўвалі пры нашых розных размовах паміж сабой, усе тыя матывы, якія павінны былі абгрунтаваць гэтае важнае палітычнае рашэнне»[31].

У заключэнне Напалеон падзякаваў усім за іх добрыя дзеянні падчас кампаніі, раздаў кожнаму загады: генерал Жак Ларыстон павінен быў адправіцца ў Варшаву і збіраць там войскі, генерал Жак Рап павінен быў ехаць у Данцыг і г. д. Напалеон зацвердзіў, што ён едзе ў Парыж, каб прывезці трыста тысяч салдат для новай кампаніі. Вось вам і працяг 29-га бюлетэня і доказ таго, што леў «захаваў моц, і ён небяспечны».

Галоўнакамандуючым французскай арміі застаўся Мюрат — ён быў не лепшым з маршалаў, але старэйшым па манархічнай іерархіі. Інструкцыя Напалеона прадпісвала яму сабраць рэшткі арміі ў Вільні і трымацца тут і ў Коўна на зімніх кватэрах. У крайнім выпадку трэба было забраць усе рэчы і ісці ў Данцыг.

Вечарам, паміж восьмай і дзесятай гадзінамі, Напалеон выязджаў са Смаргоні. Можна нават сказаць, што гэта быў не ён, бо разам з паперамі і багажом Напалеон Банапарт пакідаў сваё імя. У дальні шлях імператар адпраўляўся пад прозвішчам і тытулам свайго генерала Каленкура — герцага Вічэнцкага. Гэта адна з мер засцярогі, а яшчэ адной было, па словах К. Тарасава (больш я аб гэтым нідзе не чытаў), пераапрананне Напалеона ў мундзір польскага ўлана: «У якімсці сэнсе . гэта хітрасць была самаразжалаваннем, вяртаннем з імператараў .у «маленькія людзі»[32].

Пра ад'езд Напалеона са Смаргоні напісаў у сваіх дарожных запісах ад'ютант Духін-Вансовіч. Іх выкарыстаў у сваёй працы яшчэ адзін сведка гэтай падзеі Поль Бургон. У кнізе, выдадзенай у 1864 г. у Парыжы, ён пісаў: «Стаялі на дарозе 3 карэты і адныя сані. У першай карэце, на два месцы, у добра вядомым усёй арміі экіпажы Напалеона, сядзеў сам імператар, маючы каля сябе Каленкура; мамлюк Рустан заняў месца каля вазніцы. У другой карэце сядзелі маршал Дзюрок і граф Лабо; у трэцяй генерал Лефэбр, камандзір конных стралкоў гвардыі, камердзінер і двое слуг. Нарэшце ў сані, па асобнаму загаду імператара, сеў граф Вансовіч і берэйтар Амандрю, які адразу азнаёміў маладога польскага афіцэра, што мэтаю вандравання з'яўляецца не

[31] Коленкур Арман. Указ. соч. — С. 275-276, 277.
[32] Тарасов К. Память о легендах. — Мн., 1984. — С. 131. 163

Вільня, а Парыж. Эскорт склаў эскадрон з 30 конных стральцоў, выбраных генералам Лефэбрам»[33].

Ітак, было тры карэты. Напалеон ехаў у сваім, «добра вядомым усёй арміі экіпажы». Цікава, чаму ён не змяніў яго, каб прынящь меры засцярогі? Большасць сведкаў гаворыць пра дармез (фр. dormeuse, літаральна — соня) — старадаўнюю вялікую карэту, прыстасаваную да сна ў дарозе. Яна, відаць, была на калёсах — наперадзе ехалі сані і прабівалі дарогу. У сані ж Напалеон перасеў або праз два дні ў Коўна (А. Макфрэд), або ўжо ў Герцагстве Варшаўскім (Ч. Янкоўскі). Другое, на нашу думку, больш верагоднае, бо абапіраецца на сведчанне Вансовіча.

Л. Ракоўскі ў сваім рамане прыводзіць апошнія словы Напалеона ў Смаргоні. Ці гэта гістарычны факт невядома, але нешта падобнае верагодна мела месца. Напалеон сказаў:

- Я пакінуў Парыж з намерам не ісці вайной далей польскіх граніц. Акалічнасці ўцягнулі мяне. Мабыць, я зрабіў памылку, што дайшоў да Масквы, мабыць я не добра зрабіў, што занадта доўга там заставаўся, але ад вялікага да смешнага — адзін крок. І няхай мяне асудзяць нашчадкі.

Ён памаўчаў некалькі хвілін у роздуме, потым дабавіў:

- А ўласна кажучы, чаго мне каштавала ўся гэта гісторыя? Нейкіх трыста тысяч чалавек. Прытым, у іх колькасці было столькі немцаў! — пагардліва фыркнуў ён[34].

У Ашмяны першым прыехаў Вансовіч. Гэта было, відаць, каля поўначы, а раней на горад зрабіў набег армейскі партызанскі атрад А. Н. Сяславіна. А. Бястужаў-Марлінскі апісвае так: «...К ночы наляцелі мы на Ашмяны, — там быў сам Напалеон.

Нягледзячы на першынство французаў у сілах, мы ўдарылі па іх як гром. Сам начальнік наш з ахтырцамі ўрубіўся ў сярэдзіну горада, мы ўварваліся туды з усіх бакоў; лямант, трывога, пальба, шаблі і штыкі ў рабоце, але цемра, падараваўшая нас перамогай, схавала Напалеона ад пошукаў нашых. Калі б мы ведал і месца начлегу, Ашмяны былі б геркулесавымі стаўбамі яго поля дзейнасці»[35].

Сяславін вымушаны быў адступіць, бо да горада падыходзіла з Вільні дывізія генерала Луазона. Калі прыехаў Вансовіч, то ён і ўбачыў частку ваяроў генерала Грасьена з гэтай дывізіі і Ашмянскі гарнізон

---

[33] Цыт. па: Jankowski Cr. Powiat Oszmianski. Materiały do dziejów ziemi i ludzi. Cz. 1. — Petersburg, Krakow, 1986. — S. 43-44.

[34] Раковский Л. Указ. соч. — С. 643.

[35] Бестужев-Марлинский А. А. Сочинения. Т. I. — М., 1981. - С. 461-462.

(французы, немцы, узвод польскіх уланаў) у баявой гатоўнасці. Ахоўныя меры не былі марнымі — з усіх бакоў падыходзілі да Ашмян і рускія войскі, праследуючыя адыходзячую Вялікую армію, а дакладней тое, што ад яе засталося.

Напалеон прыехаў амаль праз гадзіну пасля Вансовіча. Апошні абудзіў яго ад сна і далажыў становішча. Расказанае не ўскалыхнула імператара — ён гэта прадбачыў. Запытаўся, ці падрыхтаваны новы эскорт. Вансовіч адказаў, што стаяць 266 уланаў. «Цудоўна», — сказаў Напалеон, выйшаў з карэты і загаварыў з камендантам гарнізона. Потым загадаў падаць яму карту Літвы і ўважліва яе вывучаў. Генералы заклікалі яго не ісці на яўную пагібель, або хаця б пачакаць да раніцы наступнага дня. Пасля хвіліннага вагання імператар вырашыў не заставацца ў Ашмянах на ноч. Яму здавалася, што ў белы дзень адпраўляцца ў дарогу больш небяспечна. Напалеон запытаў ад'ютанта:

- Польскія ўланы падрыхтаваны?

- Так, Ваша імператарская Вялікасць, яны былі тут перад нашым прыбыццём.

- Няхай сядаюць на коней, эскорт акружыць карэту, едзем цяпер, ноч цёмная, расіяне нас не ўбачаць. Будзем разлічваць на шчасце, інакш нічога не дасягнеш.

Было каля двух гадзін ночы 6 снежня. Перапраглі коней. Імператар падаў пару пісталетаў ад'ютанту і загадаў сесці на козлы побач з Лефэбрам. Мамлюк пайшоў у сані, а палкоўнік Стайкоўскі, камандзір эскорта, атрымаў загад ехаць каля дзвярэй карэты.

- Спадзяюся на вас усіх, — сказаў імператар. — Глядзіце на абодва бакі дарогі.

Потым дадаў:

- У выпадку смяротнай небяспекі забіце мяне, не дайце, каб мяне захапілі (сам Напалеон меў на пагатове атруту).

Ноч была цёмная, без зорак, снег не ішоў, мароз, імгла, так што ўсё спрыяла Напалеону, каб выйсці цэлым і непашкоджаным з цяжкага становішча. Зорка ўдачы і тут дапамагла Напалеону. Калі Сяславін раніцою 6 снежня пачне атакаваць Ашмяны другі раз, Напалеон будзе ўжо ў Роўным Полі. Дасюль дайшло толькі 36 чалавек эскорта, таму яго змянілі неапалітанцы з коннай часці, якая тут стаяла. Далей шлях ішоў праз Меднікі, дзе Напалеона чакаў князь Басана, французскі міністр замежных спраў.

Раніцай 6 снежня Напалеон быў каля Вільні. У горад не заязджаў, змяніў коней і памчаўся ў Коўна. 8 снёжня імператар прыехаў у Варшаву, дзе падбадзёрыў палякаў новай кампаніяй. Праз Дрэздэн і

Майнц дабраўся ў ноч з 18 на 19 снежня да Парыжа. Праз Беларусь, Літву, Польшчу, Прусію, Саксонію, праз усю Еўропу «граф Вічэнцкі» мінаваў усе расстаўленыя яму пасткі. Вандроўніцтва на мяжы рызыкі чалавека, які вінаваты ў гібелі кожнага чацвёртага беларуса, завяршылася паспяхова. Але кара яго не мінуе. У 1815 г. Напалеон будзе сасланы на востраў Святой Алены, дзе 5 мая 1821 г. памрэ ад атручэння мыш'яком і сурмой графам Шарлем-Трыстанам дэ Манталонам. Іронія лесу — памерці на востраве, куды ў 1804 г., у час росквіту сваёй магутнасці, збіраўся пасланць марскую экспедыцыю!

...Шлях з Вільні праз Мезднікі, Ашмяны, Смаргонь, Маладзечна доўгі час называлі напалеонаўскім трактам. А карэта, у якой ехаў Напалеон, па сведчанню аўтара ўспамінаў Ч. Янкоўскага, на памежжы XIX і XX стагоддзяў знаходзілася ў Кушнера Вагнера, які жыў у Метзу. Згодна ж юбілейнага выдання 1912 г. «Отечественная война 1812 г. и русское общество»: «сані, у якіх ехаў Напалеон, захоўваюцца ў музеі Магілёва».

А дзе цяпер гэтая рэліквія? Можа, хто ведае?

## НАВАГРУДСКІЯ МАСОНЫ

Масонства — рэлігійна-этычны рух, які дзейнічаў па прынцыпах грамадска-палітычных арганізацый і з'яўляўся правобразам будучых палітычных партый. Вывучэнне развіцця масонства дазволіць напісаць больш разнастайную і глыбокую карціну грамадскага жыцця і руху ў Беларусі, наогул, і на Навагрудчыне, у прыватнасці.

Зрабіць гэта, праўда, будзе нялёгка, таму што пасля ўказа Аляксандра I ад 1 жніўня 1822 г. аб забароне масонскіх лож і тайных таварыстваў у Гродзенскай губерні збіралі ўсе дакументы і масонскія знакі, каб «все уничтожить и предать огню». Вось што даносіў 29 чэрвеня 1823 г. гродзенскі губернатар М. Бутаўт-Анджэйкавіч (дарэчы, сам з'яўляўся майстрам гродзенскай ложы «Приятель человечества») літоўскаму ваеннаму губернатару: «...по самовернейшим разысканиям удостоверился я, что со времени закрытия лож масонских не токмо оных работы совершенно прекращены, но даже никаких и ни под каким видом и названием секретных собраний в целой губернии не находится и не было». Губернатар пісаў, што ўсе знойдзеныя «дэкарацыі» спалены, а ў Навагрудку яны ліквідаваны яшчэ ў час закрыцця ложы.

Крыніцамі, па якіх усё ж такі можна даследаваць масонскі рух, з'яўляюцца дакументы дзяржаўнага справаводства, звязаныя з забаронай масонскіх лож. У Беларускім дзяржаўным гістарычным

архіве ў г. Гродна захавалася справа «О закрытии масонских лож и тайных обществ в Гродненской губернии»[36]. Дзякуючы ёй, а таксама апублікаваным дакументам і літаратуры аб масонах, дзе ўжываліся матэрыялы асабістага паходжання, можна напісаць хаця б кароткую гісторыю масонскай ложы ў Навагрудку.

Спачатку аб назве навагрудскай ложы, таму што няма адзінства сярод гісторыкаў. На старонках вышэйназванай архіўнай справы ёсць назва па польску: «Węzeł Jedności» і ў перакладзе на рускую мову — «Состав Соединения». С. Ф. Дабранскі называе ложу «Узел Единения» або «Узел Соединения на Востоке Новогрудка»[37]. Ціра Сакалоўская ў сваіх публікацыях піша пра навагрудскую ложу «Узел Единомыслия» і амаль таксама А. Пыпін — «Узлы Единомыслия»[38]. Сучасны маскоўскі гісторык А. Сяркоў, які, дарэчы, упершыню ўзняў праблему вывучэння масонскага руху на Беларусі, называў ложу «Узел единства»[39]. Мне здаецца, што такі пераклад з польскай мовы найбольш удалы і дакладны. Назва навагрудскай ложы адлюстроўвае агульнае імкненне масонаў аб'яднацца для агульнай «сокровенной работы».

Ложа «Узел Единства» была заснавана ў 1817 г., у час, які называецца росквітам масонства ў Расійскай імперыі (1815-1822 гг.)[40]. Падзеі вайны 1812 года зноў ускалыхнулі ў палякаў мары аб аднаўленні былога каралеўства. Масонскія ложы ў Літве і Беларусі «самым тщательным образом поддерживали политические стремления своих сочленов»[41]. Асобае ўладкаванне Царства Польскага, хартыя 1815 г., прадстаўнічае кіраванне, асобая армія — усё гэта спрыяла развіццю масонскага руху. Ложа «Узел Единства» (майстар стула — граф Адам Солтан і нейкі час — Галецкі Якуб) працавала ў саюзе з Вялікім Усходам Польшчы (і Літвы) і была падначалена правінцыяльнай ложы «Совершенного Единения» ў Вільні.

---

36 Беларускі дзяржаўны архіў г. Гродна (далей БДГА), ф. I, воп. I, сп. 2860.

37 Добрянский С. Ф. Очерки из истории масонства в Литве // Записки Северо-Западного отдела импер. русского географич. общества. Кн. 4, 1913 г. — Вильна, 1914 г. — С. 106, 142, 185.

38 Материалы по истории масонства в прежней русской армии / Сообщ. Т. Соколовская // Русская старина. — 1907. — Кн. IX. — С. 646; Пыпин А. Р. Русское масонство. XVIII и первая четверть XIX в. — Петроград, 1916. — С. 529.

39 Серков А. И. Масонские ложи на территории Белоруссии и движение декабристов // Декабристские чтения — I. Тезисы республиканской межвуз. науч. конференции / Под ред. Б. С. Клейна, Д. В. Карева, В. В. Шведа. — Гродно, 1990. — С. 72.

40 27.09.1816 г. у Навагрудку была створана сімвалічная ложа "багіні Цэрэры", потым перайменаваная ў "Узел единства".

41 Добрянский С. Ф. Указ. соч. — С. 104.

Сказанае пацвярджаюць выявы пячатак. На пячатцы апошняй ложы знаходзіцца дзесяць гербаў, сярод якіх ёсць знак ложы «Узел Единства»: на шчыце намаляваны два масонскіх вузла. Пячатка самой навагрудскай ложы была круглай і мела ў дыяметры 5,5 см. На ёй была наступная выява: «Унутры на пастаменце з 7 прыступкаў дзве калоны з літарамі "I" і «B». Паміж калонамі вялікі дыркуль і навугольнік у спалучэнні; паміж імі ззяючы трохкантовік і прадмет або сімвал, які з-за пашкоджання адбітка не паддаецца вызначэнню. Вакол надпіс: «Pieczec:. i:. d:. wezla iednosci na wsch:. Nowogrodka:. Г. зн. «Пячатка правільнай і дасканалай ложы «Узел Соединения на Востоке Новогрудка»[42].

«Узел Единства» быў «іаанаўскай ложай» і яго сябры валодалі толькі трыма ступенямі: вучні, таварышы, майстар. Ложа працавала па французскіх узорах. Праіснавала яна да 1821 г., калі 25 верасня Вялікі Князь Наместнік на імя Вярхоўнага Сходу Вялікага Усхода выдаў наказ, у якім прапанаваў закрыць працы ўсіх лож на нявызначаны час і лічыць усе правінцыяльныя ложы, якія будуць працягваць існаванне пасля 15 кастрычніка, парушальнікамі закону. Усе масонскія ложы, працуючыя пад апякунствам Вялікага Усхода Польшчы, вымушаны былі спыніць свае працы. У тым ліку і «Узел Единства», які прызнаў канстытуцыю (устаў) 1820 г. і застаўся пад апекай Вялікага Усхода Польшчы[43].

Сябрамі навагрудскай ложы было больш як 90 чалавек. Дакладную колькасць, пакуль не прааналізаваны ўсе крыніцы, прывесці нельга. Уваходзілі ў яе памешчыкі, шляхта, купцы, чыноўнікі, ваенныя, інтэлігенцыя. Цікава адзначыць, што мэты масонскай працы аб'яднаці палякаў, рускіх, беларусаў. Мары палякаў аб аднаўленні Польшчы разрасліся ў ідэю аб'яднання ўсяго славянства.

Чаму чалавек прыходзіў у масонства? Трэба згадзіцца з думкай А. Сяркова, што сярод братоў-масонаў былі розныя людзі: большая частка займалася самаўдасканаленнем, самавыхаваннем, «пераўтварэннем першапачаткова змарнаванай чалавечай натуры»[44]. Другіх цікавіла

---

[42] Там сама. — С. 135-136, 141, 142.

[43] БДГА г. Гродна, ф. I, воп. I, сп. 2860, с. 19, 20, 21, 35, 41, 63об. Серков А. И. Масонские ложи... — С. 73; Список офицеров русской армии, признавших свою причастность масонству. Материалы по истории масонства в прежней русской армии / Соколовская С. О. // Русская старина — 1907. — Т. 130. — С. 429, 646; Zaleski S. O masonii w Polsce od roku 1742 do 1822 na źródłach wyłącznie masońskich. — Krakow, 1899. — S. VI.

[44] Серков А. И. Из истории русского масонства / Ложи Трех добродетелей и декабристы // Вестник МГУ. Сер. 8. История — 1988. № 5. — С. 65.

прасоўванне на службовай лесвіцы, уваходжанне ў элітарныя колы. Трэція імкнуліся злучыць ідэю духоўнай працы па пабудове «Храма Господня» з пераўтварэннем рэчаіснасці. Сярод навагрудскіх масонаў былі, на маю думку, усе тры катэгорыі масонаў. Звярну ўвагу толькі на апошніх, якія сталі ініцыятарамі і дзеячамі двух тайных арганізацый: «Таварыства сяброў» і «Таварыства ваенных сяброў» (К. Г. Ігельстром, А. І. Вягелін).

Вядомы масон навікаўскага кола І. У. Лапухін гаварыў пра масонаў наступнае: «И святые, и бунтовщики, и проказники, и суеверы, и замысловатые обманщики»[45]. Дык ці былі яны апазіцыяй урада? Мне здаецца, што не былі, бо гэтаму перашкаджала масонская абраднасць, глыбокая канспірацыя, склад лож, большасць якіх займалася маральным удасканаленнем. Але польска-беларуска-літоўскае масонства звязана з нацыянальна-патрыятычным рухам і адыграла сваю вызначаную ролю ў барацьбе з самадзяржаўем. І навагрудская ложа «Узел Единства» таму прыклад.

Для цікавых прыводзім спіс сяброў ложы «Узел Единства». Можа хто з чытачоў-краязнаўцаў зоймецца распрацоўкай іх біяграфій.

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Ажароўскі Войцех | — ротмістр Валынскага уланскага палка |
| 2. | Арлоўскі | — паручнік гэтага ж палка, ад'ютант генерал-маёра Ігельштрома 2-га |
| 3. | Багданаў 1-ы | — паручнік гэтага ж палка |
| 4. | Вягелін Аляксандр Іванавіч | — паручнік Літоўскага піянернага батальёна Літоўскага асобнага корпуса (ЛАК) |
| 5. | Вішнеўскі Павел | — капітан, камандзір 4-га фурштацкага б-на Валынскага улан. палка |
| 6. | Вайдзбун Юзаф | |
| 7. | Вайніловіч Аўгуст | — падкаморы Навагрудскі, былы асэсар Галоўнага суда Гарадзенскага |
| 8. | Вайніловіч Ян (Іван) | — былы межавы суддзя Навагрудскага павета, сябра Нацыянальнага масонства і Польскага патрыятычнага таварыства |
| 9. | Вайніловіч Юзаф | — паручнік (ці маршалак Навагруд. павета) |
| 10. | Вайткевіч | — мастак у Ашмянах |
| 11. | Валадзько | — паручнік конна-артылерый- скай роты № 30 |

[45] Лопухин И. В. Записки некоторых обстоятельств жизни и службы... — М„ 1860. — С. 20.

| | | |
|---|---|---|
| 12. | Валадзько 2-і Ю. | — карнет Валынскага ўлан. палка, а затым паручнік Літоўскага ўлан. палка. Член «Таварыства сяброў». |
| 13. | Валовіч Казімір | — падкаморы Слонімскі |
| 14. | Волк Адольф | — былы капітан Войск польскіх |
| 15. | Галецкі Якуб | — апеляцыйны суддзя |
| 16. | Грыневіч | — паручнік Валынскага ўлан. палка. Член «Таварыства сяброў». |
| 17. | Грамякін | — юнкер Літоўскага ўлан. палка |
| 18. | Грахольскі Рафал | — ад'ютант брыгады расійскіх улан |
| 19. | Дабрачынскі | — паручнік Валынскага ўлан. палка |
| 20. | Далабоўскі Аляксандр | — адвакат Гродзенскага дэпартамента |
| 21. | Дунін Антоні | — артыст |
| 22. | Забароўскі Вінцэнт | — маёр Валынскага ўлан. палка |
| 23. | Залескі Міхаіл | |
| 24. | Зелеў (Жэлеў) Карэль | — штаб-ротмістр Валынскага ўлан. палка |
| 25. | Ігельстром Канстанцін Густававіч | — штабс-капітан піянернага батальёна ЛАК. Адзін з заснавальнікаў і кіраўнікоў Таварыства ваенных сяброў |
| 26. | Ігельштром (ці Ігельстром) | — паручнік Валынскага ўлан. палка, ад'ютант генерал- маёра Владэка |
| 27. | Карповіч Казімір | |
| 28. | Кашыц Юзаф | — паручнік Войск польскіх |
| 29. | Кандратовіч Ян | |
| 30. | Касаржэўскі | — карнет Валынскага ўлан. палка. Член «Таварыства сяброў» |
| 31. | Ленкевіч Ян | — жыхар Мазырскага павета |
| 32. | Лісоўскі Антоні | — жыхар Навагрудскага павета |
| 33. | Маркевіч Ян | жыхар |
| 34. | Марцінкевіч Аляксандр | |
| 35. | Мацкевіч Міхаіл | — навагрудскі віцэ-маршалак |
| 36. | Магельніцкі | — карнет Валынскага ўлан. палка. Член «Таварыства сяброў» |
| 37. | Матовіч Казімір | — навагрудскі павятовы страпчы |
| 38. | Нарбут Юзаф | — землямер у Вільні |
| 39. | Незабытоўскі Якуб | |
| 40. | Незабытоўскі Ян | — былы капітан Войск польскіх |
| 41. | Парадоўскі | — маёр Валынскага ўлан. палка |
| 42. | Похвіснеў | — капітан конна-артылерыйскай роты № 29 |
| 43. | Петрынскі В. (?) | — карнет Валынскага ўлан. палка. Член «Таварыства сяброў» |
| 44. | Пратасевіч Ежы | — суддзя са Слонімскага павета |
| 45. | Пушкоўскі Францішак | — доктар у Слонімскім павеце |
| 46. | Пшэслаўскі Юзаф | — былы дваранскі сакратар Слонімскага |

| | | |
|---|---|---|
| | | павета |
| 47. | Ратынскі Э. | — карнет Валынскага, а затым Літоўскага ўлан. палка. Разжалаваны ў радавыя. Член «Таварыства сяброў» |
| 48. | Рыкгаф | — з конна-артылерыйскай роты № 29 |
| 49. | Расінскі Мікалай | — паручнік Войск польскіх, Бабруйск. павет |
| 50. | Рушчыц Каспер | — шляхціц Кобрынскага павета |
| 51. | Сакалоўскі Караль | — паручнік Войск польскіх (ці расійскіх?) |
| 52. | Сангайла К. | — карнет, затым паручнік Валынскага ўлан. палка, сябра «Таварыства сяброў» |
| 53. | Солтан Адам, граф | — падпалкоўнік Войск польскіх, памешчык. Член Польскага патрыятычнага таварыства |
| 54. | Стацыскі Бенедыкт | |
| 55. | Стэфановіч Францішак | — земскі рэгент Слонімскага павета |
| 56. | Філімонаў Мікалай | — падпалкоўнік Валынскага ўлан. палка |
| 57. | Хельміцкі Аляксандр | — паручнік Валынскага ўлан. палка. Член «Таварыства сяброў» і Таварыства ваенных сяброў (?) |
| 58. | Хлявінскі Дыанізі | — сябра Польскага патрыятычнага т-ва |
| 59. | Хлускі Тадэвуш | |
| 60. | Цішкевіч | — юнкер Гродзенскага гусарскага палка |
| 61. | Чэхоўскі Станіслаў | — маёр Валынскага ўлан. палка |
| 62. | Шукевіч Юзаф | |
| 63. | Юлевіч Ігнаці | |
| 64. | Ядлоўскі Францішак | — настаяцель касцёла ў Слонімскім павеце |
| 65. | Вайніловіч Фларыян | — былы генерал польскай арміі |
| 66. | Белапятровіч К. | — сябра Польскага патрыятычнага т-ва |
| 67. | Гацыскі Г. | — сябра Польскага патрыятычнага т-ва |
| 68. | Гацыскі Бенедыкт | — былы старшыня земскі Навагрудскага павета |
| 69. | Шымкевіч Якуб | — доктар медыцыны, праф. Вілен. ун-та |
| 70. | Слізень Ян | — харунжы Навагрудскага павета |
| 71. | Маркевіч Матэуш | — падкаморы Навагрудскага павета |
| 72. | Ліхоўскі Павел | — афіцэр Валынскага уланскага палка |
| 73. | Кшэмінскі Ігнаці | — хірург |
| 74. | Навакоўскі Станіслаў Костка | — пасол на сейм Любельскага ваяводства |
| 75. | Малеўскі Антоні | — рэгент Радзівілаўскай камісіі |
| 76. | Букаты Алаізы | — стараста |
| 77. | Гадлеўскі Францішак | — ксёндз, канонік, Дзятлаўскі пробашч |

| | | |
|---|---|---|
| 78. | Каравайскі Кансганцін | — слуга |
| 79. | Шавельскі Г. | |
| 80. | Ігельстром Густав | — палкоўнік Літоўскага палка |
| 81. | Арцішэўскі Антоні | — падпалкоўнік Валынскага улан, палка |
| 82. | Нямцэвіч Урсін Станіслаў | — Гродзенскі губ. (?) |
| 83. | Вайніловіч Казімеж | — жыхар |
| 84. | Хлявінскі Адам | — былы харунжы Навагр. павета |
| 85. | Далінскі Станіслаў | — сакратар Гродз. казённай палаты |
| 86. | Жэброўскі Вінцэнты | — афіцэр Валынскага ўлан. палка |
| 87. | Сарнадкі Алаізы | — жыхар Каралеўства Польскага |
| 88. | Ёхме Тэадор | — доктар медыцыны |
| 89. | Ёхме Віндэнты | — доктар медыцыны |
| 90. | Керсноўскі Ігнаці | — касір Навагруд. павета |
| 91. | Незабытоўскі Стэфан | — былы паручнік Войск Польскіх |

## ЛІСТЫ ЗАГАВАРЫЛІ

Калісьці Аляксандр Герцэн вельмі слушна прыкмеціў: «Пісьмы больш, чым успаміны, на іх запяклася кроў падзей, гэта само былое, як яно было, затрыманае і нятленнае». Я прапаную прачытаць пісьмо, якое было мною знойдзена ў Беларускім дзяржаўным гістарычным архіве г. Гродна і звязана з гісторыяй Гродзеншчыны[46]. Каб захаваць каларыт эпохі, прыводжу тэкст пісьма на мове арыгінала:

№ 782 Милостивый Государь, Секретно
Михайло Николаевич!

Жительствующая в Новогрудке Г-жа Софья Поклонская обратилась ко мне с просьбою о дозволении брату ея Государственному преступнику Игельстрому, находящемуся в Сибири на поселении, посещать там же находящегося Государственного преступника Фаленберга и иметь при себе огнестрельное оружие.

Вследствие сего я покорнейше прошу Вас, Милостивый Государь, приказать объявить Г-же Поклонской, что удовлетворение означенной просьбы ея противно правилам, установленным насчет лиц, в одной категории с братом ея состоящих.

С совершенным почтением и преданностью имею честь быть,

[46] БДГА г. Гродна, ф. I, воп. 27, спр. 310.

Вашего Превосходительства
покорнейший слуга Граф
(Бенкендорф) (подпіс)

Аўтарам прачытанага вамі пісьма з'яўляецца Аляксандр Хрыстафоравіч Бенкендорф (1783-1844) — удзельнік разгрому паўстання дзекабрыстаў у Санкт-Пецярбурзе, генерал-лейтэнант і з 1826 па 1844 г. — шэф корпуса жандараў і галоўны начальнік III аддзялення асабістай Яго імператарскай Вялікасці канцылярыі. Названая ўстанова была ў Расіі ў 1826-1880 гг. органам палітычнага нагляду і вышуку або, як казаў сучаснік, «цэнтральным штабам па назіранню за поглядам агульным і духам народным». У функцыі III аддзялення ўваходзіў, такім чынам, і кантроль за паводзінамі сасланых дзекабрыстаў[47].

Адрасатам пісьма з'яўляўся Міхаіл Мікалаевіч Мураўёў (1796-1866) — былы сябра Саюза выратавання і Саюза благадзенства, а цяпер парваўшы з рэвалюцыйным рухам генерал-маёр, гродзенскі губернатар (5.09.1831-24.01.1835). Зусім нядаўна ён прымаў удзел у пагроме паўстання 1830-1831 гг., стаў ініцыятарам адмены Літоўскага Статута. Пасля разгрому паўстання 1863-1864 гг. яго назавуць Мураўёвым- Вешальнікам[48].

У пісьме ідзе гаворка пра Софью Ігельстром (у замужжы Паклонская) — сястру Канстанціна Густававіча (1799-1851), былога капітана, камандзіра 1-й роты Літоўскага піянернага батальёна, аднаго з арганізатараў Таварыства ваенных сяброў і выступления ў Браньску пад Беластокам. Ваенным судом Ігельстром быў прыгавораны да смяротнай казні, але па высачайшай канфірмацыі яна была зменена на дзесяць гадоў катаржных работ з наступным пасяленнем у Сібіры. У час напісання пісьма ён ужо знаходзіўся (па ўказу ад 8.11.1832 г.) на пасяленні і жыў у с. Тасеяўскім Канскай акругі Енісейскай губерні»[49].

Пісьмо Бенкендорфа гродзенскі губернатар Мураўёў атрымаў 22 ліпеня 1833 г. Прыкладна ў гэты час К. Ігельстром пісаў свайму сябру — дзекабрысту Аляксандру Крукаву: «Мне забаронена мець агнястрэльную зброю, а я жыву ў 28 вярстах ад Траецкага Саліваранага завода

---

47 Пра III аддзяленне гл.: Оржеховский И. В. Самодержавие против революционной России. — М., 1982 (цыт. с. 28).

48 Падрабязней гл.: Гостев А. П., Швед В. В. Кроной Летапісь города на Немане. (1116-1990). — Гродно, 1993. — С. 188-189.

49 Гл.: Декабристы. Биографический справочник. — М., 1988. С. 73-74; Швед В. В. По следам Гродненской старины. — Гродно, 1993. — С. 30-35; Швед В. В. Военные друзья // Энцикл. справочник. Гродно. Мн., 1989. — С. 117-118.

(дзе населены Фаленберг); Тасеяўскае ж у адносінах к Траецкаму амаль тое ж, што Хараўз да Пятроўскага, г. зн. летам адыходзяць з Траецкага завода работнікі і з'яўляюцца ў Тасеяўскае рабаваць; набегі гэтыя бываюць тут, як гавораць, нярэдка, такім чынам, калі хто з гэтых някліканых гасцей надумаецца наведаць мяне, дык я павінен, склаўшы рукі, глядзець, як ён будзе выбіраць, што яму спадабаецца з маіх рэчаў, і падставіць шыю, калі яму пажадана будзе перарэзаць яе»[50].

Як бачым, справы былі сур'ёзныя і зброя Ігельстрому была сапраўды патрэбна для абароны жыцця і маёмасці. Але Бенкендорф прасіў Мураўёва абвясціць сястру дзекабрыста, што здавальненне яе просьбы «супраць правіл». Якіх? У цытаваным вышэй лісце Ігельстром піша сябру, што ўжо на другі дзень пасля прыезду на пасяленне ён атрымаў «Настаўленне» Канскага земскага іспраўніка Шэвялёва, дзе чацвёрты пункт гаварыў: «Усялякую агнястрэльную зброю пры сабе строга забараняю».

У кастрычніку 1828 года ў канцылярыі Гродзенскага цывільнага губернатора была заведзена справа № 57 «По отношению генерала Куруты о письмах преступников Игельстрома, Рукевича и Вегелина». Ігельстрома мы ўжо ведаем. Вягелін Аляксандр Іванавіч (1801-1860) яго дваюрадны брат, сябра Таварыства ваенных сяброў і ўдзельнік паўстання Літоўскага піянернага батальёна. Асуджаны на 10 год на катаржную працу з далейшым затым пасяленнем у Сібіры. У 1828 г. знаходзіўся ў Чыцінскім астрозе. Рукевіч Міхаіл Іванавіч (1796-1841) — былы філамат, ініцыятар і адзін з арганізатараў названага тайнага таварыства. Меў такі ж самы прысуд і ў час адкрыцця справы сядзеў у Чыце.

Як і ўсім дзекабрыстам, Ігельстрому, Рукевічу і Вягеліну «Правила насчет переписки сосланных в каторжную работу и на поселение государственных преступников и их жён» прадпісвалі асобыя ўмовы перасылкі лістоў. З пісьма Ігельстрома Крукаву мы ведаем, што пяты пункт «Настаўлення» абвяшчаў: «Если желаешь посылать к родственникам, или кому другому письма, сие дозволяется только с тем, чтобы по наружности запечатанного пакета было адресовано на имя Его Превосходительства Господина Енисейского Гражданского Губернатора, каковые и отдавать вообще за пересылку оных страховым и

---

[50] Письма декабристов / Публ. Б. Кубалова // Сибирь и декабристы. Статьи и материалы, неизданные письма, библиография / Под ред. М. К. Азадовского и др. — Иркутск, 1925. — С. 142.

весовыми волостному голове для доставления ко мне (земскаму іспраўніку — В. Ш.), получая в сем расписки, без соблюдения же сего правила налагается на тебя законная перед судом ответственность». Дазвалялася пісаць пісьмы таксама жонкам, сестрам і сваякам дзекабрыстаў, якія прыехалі да іх у Сібір. У любым выпадку пісьмы ішлі праз III аддзяленне.

19 кастрычніка 1828 г. упраўляючы III аддзялення Фон Фок даслаў гродзенскаму губернатару пісьмо Марыі Мікалаеўны Валконскай з Сібіры на імя гродзенскага павятовага маршалка Баржэндкага. Той быў сваяком М. Рукевіча і ў яго жылі некаторы час сестры Карнэлія і Ксаверыя пасля свайго вызвалення з Гродзенскага брыгіцкага кляштара. У справе № 57 ёсць звесткі і аб пісьме жонкі Баржэнцкага да М. Рукевіча

Гродзенскі губернатар не ведаў, што рабіць і запрасіў меркаванне начальніка Галоўнага штаба цэсарэвіча графа Куруты. Той адказаў: «...ўсе тыя пісьма сяго рода, коі будуць пасланы да Вас з III—га аддзялення, павінны быць адпраўлены без затрымання да тых ліц, да каго адрасаваны. Тыя ж пісьма, якія будуць адрасаваны ад сваякоў або знаёмых дзяржаўных злачынцаў к сім апошнім павінны быць ад Вас пасланы для разгледжання і далейшага адпраўлення ў III-е аддзяленне». Губернатар так і зрабіў. Таму саміх пісем у справе № 57 не захавалася[51].

## ГРОДЗЕНСКІЯ ГУСАРЫ

Гродзенскі гусарскі полк быў створаны паводле ўказа Аляксандра I ад 13.06.1806 г. Фарміраваўся з эскадронаў Александрыйскага, Ізюмскага, Сумскага і Ольвіяпольскага гусарскіх палкоў, а ўсяго павінен быў «состоять впредь до повеления в 5 эскадронах». Кватэры Гродзенскага гусарскага палка знаходзіліся ў г. Тарапец Пскоўскай губерні. Полк уваходзіў у склад 14-й дывізіі генерала ад інфантэрыі графа Буксгеўдзена. Прымаў удзел у кааліцыі супраць Францыі ў 1807 г., у руска-шведскай вайне (1808-1809 гг.) быў на тэрыторыі Фінляндыі, дзе заняў Аландскія астравы і дайшоў за 100 вёрст да Стакгольма.

У вайне 1812 г. полк нашчэнт разбіў французскую брыгаду Сен-Жэнэ пад Друяй, пад Полацкам (узяў у палон некалькі батальёнаў і

---

[51] БДГА, ф. I, воп. 3, спр. 191, л. 3-3 об.

2 эскадроны, гарматы), Клясціцамі вёў трохдзённы бой[52]. Камандаваў у тэты час гродзенскімі гусарамі Якаў Пятровіч Кульнеў, генерал-маёр, камандзір ар'ергарда 1-га корпуса 1-й арміі. Апошні бой давялося правесці яму 20 ліпеня (1 жніўня) каля вёскі Баяршчына, дзе ён спачатку дабіўся значнага поспеху ў кавалерыйскай атацы праціўніка, але потым вымушаны быў адступіць к Сівошыну. У час пераправы праз р. Дрысу быў смяротна паранены: ядром яму адарвала абедзьве нагі. «Расія, — пісаў будучы дзекабрыст, удзельнік вайны 1812 г. С. Р. Валконскі, — страціла ў ім сапраўднага грамадзяніна, армія — правадыра, падначаленыя справядлівага начальніка, а сябры — надзейнага сябра»[53].

За 1812-1814 гады гродзенскія гусары ўдзельнічалі ў 30 генеральных бітвах, 50 авангардных баях, узялі ў палон 5 генералаў, 117 афіцэраў і 13035 ніжніх чыноў[54]. У авангардзе рускіх войск 20.02.(5.03.)1813 г. увайшлі ў Берлін, а ў 1814 г. у Парыж.

У 1824 годзе Гродзенскі гусарскі полк быў перайменаваны ў Клясціцкі 18-ы Драгунскі яго каралеўскай высокасці вялікага герцага Гесенскага полк (з 1882 — Драгунскі)[55]. 19 лютага 1824 г. Аляксандр I выдаў рэскрыпт на імя Канстанціна Паўлавіча, у якім даручыў яму сфарміраваць лейб-гвардыі Гродзенскі гусарскі полк маладой гвардыі ў складзе 2-й брыгады гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі рэзервовага корпуса, якім камандаваў цэсарэвіч. Новы полк фарміраваўся з ураджэнцаў Польшчы, Літвы і Беларусі, якія служылі ў палках 1-й гусарскай і Літоўскай уланскай дывізій. Гэта уланскія палкі — Літоўскі (Слонім), Татарскі (Нясвіж), Польскі (Слуцк), Валынскі (Навагрудак) і 1-я гусарская дывізія (Ліда). Усяго набралі з гэтых палкоў на чатыры эскадроны.

З кожнага палка Літоўскай уланскай дывізіі выбіралі па 12 унтэр-афіцэраў, 3 трубачы, 160 радавых і па 160 страевых коней. Людзі павінны былі быць «відныя», добрых паводзін і не былых штрафаваных. З цэлай дывізіі трэба было знайсці 20 обер-афіцэраў.

Першапачаткова штаб-кватэра палка, 1-га і 2-га эскадронаў і палкавы лазарэт знаходзіліся ў г. Седльцы (85 вёрст ад Варшавы), 3-га эскадрона — у чатырох вёрстах ад горада ў в. Ігання, 4-га эскадрона —

---

52 Полное собрание законов Российской империи. Т. XXIX. СПб., 1833. — С. 370, 373; Елец Ю. История лейб-гвардии Гродненского гусарского полка. — СПб., 1890. — С. И.
53 Гл.: Бородино. 1812. — М., 1987. — С. 50-51.
54 Елец Ю. Указ соч. — С. 11-13. Далей, калі ў тэксце нарыса не прыводзяцца асобныя спасылкі, матэрыялы выкарыс- таны з дадзенай кнігі.
55 Энциклопедический словарь Брокгауза и Ефрона. Т. XV (29). — СПб., 1895. — С. 447.

у в. Слок-Ладскі. Сюды везлі для палка з Пецярбурга і Дубны сукно і холст, з Вільні — жалезныя прадметы, з Варонежа — потнікі, з Масквы — прылады к ташкам, з Тулы — шаблі, пісталеты, карабіны. 6 кастрычніка полк уступіў у Варшаву.

Першы дывізіён размясціўся ў казармах паблізу Лазенкаўскага палаца, трэці эскадрон часова — у в. Пясечка, чацвёрты ў в. Вілянова, пяхотныя рэзервы — у крэпасці Модлін (Нова-Георгіеўск). Служба заключалася ў нясенні каравулаў у Каралеўскіх лазенках на Саконскай плошчы, разводах, парадах у царкоўныя святы, вартавая і аванпостная служба, нарады па палку і эскадронам. Праходзілі страявыя заняткі, вучылі верхавой яздзе, страляць у цэль, плаваць, адбываліся «умственное развитие солдат» і палявыя заняткі на Макотаўскім полі. З 1849 г. кватэры Гродзенскага гусарскага палка знаходзіліся ў Спаскай Полесці пад Ноўгарадам. Форма гродзенскіх лейб-гусараў была пашыта па ўзору лейб-гвардзейскага гусарскага палка. Ківер быў малінавага колеру з белымі басонамі, круглым пампонам, лускаю, лакіраваным верхам і скураным казырком. На галаўным уборы змяшчаўся герб з арлом і Пагоняй. Менцік (накідка) быў аліўкавага колеру, грузікі і ўвесь прыбор — белыя, каўнер і апушка з чорных барашкаў, расшыты і вылічбаваны. Даламан (мундзір) шыўся з сукна аліўкавага колеру, а каўнер, абшлагі, гузікі і ўвесь прыбор — белыя. Чакчыры — малінавага колеру з белай вылічбоўкаю. Ташка (скураная сумка) мела вензелі і карону з малінавага сукна, накладзенага на белае сукно. Кушак быў белы з малінавымі гомбамі ў тры радкі па тры і на канцах — па дзве вялікія кісці. Вальтрап (потнік для каня) — малінавае сукно, абшытае тонкім белым шнурком, на ім венцель і карона з малінавага ж сукна, падкладка пярэдняй паловы — холст, задняй — чорная кляёнка. Такія ўзоры і колеры формы існавалі да 1833 г. У час фарміравання палка шыццё абмундзіравання ішло пад наглядам паручніка Аляксандра Густававіча Ігельстрома, брата будучага дзеяча Таварыства ваенных сяброў.

3 кастрычніка 1827 года полк займеў штандарт, на конках якога былі вензелі імператара з каронамі і ўсярэдзіне — сярэбраны двухгаловы арол, на грудзях якога шчыт з выявай літоўскага конніка (Пагоні), пад арлом — літары Л.Г.Г.Г.П., над дрэўкам штандарта быў змешчаны шар з двухгаловым арлом, маючым у шчыце святога Георгія.

Полк удзельнічаў у разгроме рэвалюцыі 1831 года. За гэта атрымаў права старой гвардыі і 15 сярэбраных труб. У 1848 г. полк пайшоў у «вянгерскі» паход, але спыніўся на Слонімшчыне і вярнуўся ў Наўгародскую губерню. У 1854-1855 гг. полк хадзіў паходам у Фінляндыю, стаяў аванпастамі на беразе мора супраць англа-фран-

цузскага дэсанта. У 1863 годзе зноў удзельнічаў у пагроме рэвалюцыіі. У 1877-1878 гг. полк біўся пад Плеўнай, Дубняком; захапіў Целішскую ўмацаваную пазіцыю. Першым 23 снежня 1877 года ўвайшоў у вызваленую Сафію. «За подзвігі мужнасці і храбрасці» полк атрымаў георгіеўскі штандарт з надпісам «За адзнаку ў Турэцкую вайну 1877 і 1878 гадоў»[56].

Камандзірамі Гродзенскага гусарскага палка былі генерал-маёры К. Г. Штрантдман (1824-1831), А. А. Эсен (1831-1837), князь Дзм. Р. Баграціён-Імерэцінскі (1837-1845), А. І. Брэверн (1845-1848), Р. Б. Берг (1848-1851), Р. В. Адэркас (1851-1856), М. А. Краснакуцкі (1856-1863), Дзм. А. Тацішчаў (1863-1865), граф А. В. Алсуф'еў (1865-1872), граф А. П. дэ Бальмэн (1872-1875), прынц Альберт Саксэн-Альтэнбургскі, герцаг Саксонскі (1875-1881), барон О. В. фон Вольф (1881-1884), У. М. Востраградскі (1884-1892), А. Я. Зандэр (з 1892 г.). Гэта не поўны спісак, але, на жаль, сёння па фінансавых умовах немагчыма папрацаваць у фондах ваенна-гістарычнага архіва ў Маскве.

У палку служыў дзекабрыст М. С. Лунін (1824-1826) — ротмістр, камандзір 4-га эскадрона («Лунінскага»), ад'ютант Канстанціна Паўлавіча. Цэсарэвіч лічыў яго эскадрон адным з найлепшых. Тут, у Варшаве, Лунін пакахаў Наталлю Патоцкую, перайшоў да каталіцкага веравызнання, а ў 1826 годзе быў арыштаваны за ўдзел у дзекабрысцкім руху. Сястра Луніна К. С. Уварава пісала, што гусары («гэтыя ўсачы») аплаквалі свайго камандзіра. З кастрычніка 1837 г. у полк быў пераведзены М. Ю. Лермантаў. 26 лютага 1838 г. ён прыехаў у Ноўгарадскую стаянку, у Селішчанскія казармы. У палку, дзе служыў да сакавіка 1838, Лермантаў напісаў асноўную рэдакцыю «Дэмана», працаваў над «Героем нашага часу», маляваў карціны «Чэркес», «Успаміны аб Каўказе» і інш. Разам з Лермантавым служыў карнет М. А. Краснакуцкі — лінгвіст, перакладчык, жывапісец. Спецыяльна для Лермантава пераклаў стансы А. М. Міцкевіча "Вид гор со степей Козлова». Служыў у палку скульптар і карыкатурыст М. І. Цэйдлер (1835-1836)[57].

У спісах Гродзенскага гусарскага палка лічыліся расійскія імператары Аляксандр II (у 1864-1881 гг.), Аляксандр III (1881-1894 гг.), Мікалай II (1894-1917 гг.), з аўгусцейшых асоб — вялікія князі Аляксандр Аляксандравіч (1875-1881 гг.), Мікалай Аляксандравіч

[56] Елец Ю. Указ соч. — С. 778—881; Цітоў А. Наш сімвал Пагоня. — Мн., 1992. — С. 33-35.

[57] Лінёў Л. Старонкі мінулага // Наднёманскія былі. Зб. артыкулаў і нарысаў. — Мн., 1968. — С. 118-123; Эйдельман Н. Обреченный отряд. — М„ 1987. — С. 72, 74, 76, 130.

(1868-1894 гг.), Канстанцін Мікалаевіч (1863-1892 гг.), Дзмітры Канстанцінавіч (з 1.06.1867 г.).

## «ЕХАЎ ДЗЕДКА НА КІРМАШ»

Ехаў Дзедка на кірмаш,
З ім на возе — Баба...

Хто не ведае са школьных гадоў гэтыя вядомыя радкі з басні Кандрата Крапівы? А ці ўсе ведаюць, што такое кірмаш (ці як яшчэ маглі гаварыць — ярмонка)? Дык вось, кірмаш — гэта перыядычны торг, які наладжваецца кожны год раз або некалькі разоў у пэўным месце і ў вызначаны час. Кірмашы бываюць сусветныя, міжнародныя, рэгіянальныя, нацыянальныя і мясцовыя; універсальныя і спецыялізаваныя.

Давайце падсядзем да Дзеда і Бабы на вазок і разам з імі пад'едзем на кірмаш, каб пабачыць зблізу, што гэта такое. Бо пра Сарочынскі кірмаш, дзякуючы М. Гогалю, ведаюць усе, а пра свае беларускія і не чулі, відаць. А пакуль дарога няблізкая, каб скаратаць час, пагаворым з Дзедкам, які шмат чаго ведае пра кірмашовы гандаль перыяду 30-50-х гадоў XIX ст.

Перш за ўсё нас цікавіць, куды ж едзе Дзедка. Адказ быў — у м. Зэльву, дзе з 25 ліпеня па 25 жніўня адбываецца Аненскі кірмаш. Прывілеем караля Рэчы Паспалітай Аўгуста II ад 20 мая 1721 г. уладальнікі Зэльвы князі Сапегі атрымалі права арганізаваць «ярмонку или торги в день Святой Троицы». З гэтага часу Аненскі кірмаш у Зэльве стане адыгрываць значную ролю ва ўнутраным гандлі Гродзенскай губерні і ў жыцці насельніцтва. Гісторык і падарожнік І. Крашэўскі ў сваёй брашуры «Зэльвенскі кірмаш», выдадзенай у 1840-я гады, напіша, што «з вельмі даўніх часоў Зэльва і яе жыхары падпарадкоўваюцца здзіўляючаму праву, калі 11 месяцаў у годзе яны марнеюць, а толькі месяц жывуць»[58].

Кірмаш мяняў увесь жыццёвы ўклад. Другі сучаснік Г. Астраменцкі пісаў, што ён «сапраўды ажыўляе прамысловасць, да надыходу яго ўсе ўжо падрыхтоўваюцца, кожны, здаецца, чакае яго з нецярпеннем; возчыкі на працягу ўсяго месяца не выпрагаюць сваіх коней, тракты напоўнены павозкамі з Гродна ў Зэльву, адгэтуль у Вільню,

---

[58] Цыт. Па: Козловский И. Зельвенская ярмарка // Неман - 1968. — № 5. — С. 184.

Рыгу, Слонім і назад, а таксама ў Бердычаў і Дубну; таму мясцовасці Зэльвы прымаюць у готы час выгляд шматлюднай вобласці»[59].

За гаворкаю час бяжыць хутчэй і вось мы ўжо пад'язджаем да Зэльвы. Здалёк відаць праваслаўную царкву, каталіцкі касцёл і яўрэйскую сінагогу. Чуецца песня, але не тутэйшая, на іншай мове. Дзедка тлумачыць, што гэта спяваюць вялікаросы, відаць з берагоў Клязьмы ва Уладзімірскай губерні. Потым, падумаўшы трохі, дадае: «Першай ластаўкай кірмашу з'яўляецца прыбыццё ў Зэльву маскоўскіх купцоў, якія закладваюць яго краевугольны камень і гэтак дакладна прытрымліваюцца даты свайго прыбыцця, як жаваранак вясны». Ну а нам трэба шукаць начлег, таму Дзедка накіраваў прама да двухпавярховага «кафэ-гаўза», які стаяў побач з гасціным дваром.

У Зэльве жыло каля тысячы чалавек, а ў час кірмашу насельніцтва павялічвалася ў 2-3 разы. На пастаялых дварах і ў «кафэ-гаўзе» мы маглі б сустрэць не толькі купцоў і гандляроў, але і рамеснікаў, сялян з навакольных вёсак, мяшчан з Ваўкавыска і Слоніма, розных вяльможных паноў з абслугаю, афіцэраў, чыноўнікаў, артыстаў розных жанраў. Павячэраць можна было ў карчме або шынку, але мы людзі маладыя і таму выбралі начное кабарэ, якое мясцовыя жыхары празвалі psia górka і дзе да раніцы граюць скрыпкі і не сціхае тупат ног.

Раніцаю спяшаемся ў цэнтр мястэчка, на гасціны двор — гэта вялікая плошча, на якой месціцца каля двухсот лавак, крытых чарапіцай, два леднікі для захоўвання прадуктаў, якія хутка псуюцца, а таксама калодзеж — немалаважная дэталь, паколькі ў сярэдзіне лета пажары былі даволі частай з'явай. Каго тут толькі ні ўбачыш? Найвялікшая колькасць гандлюючых прыехала з суседніх Віленскай, Мінскай, Валынскай, Ковенскай губерняў. Былі купцы з Украіны (Кіеўскай, Харкаўскай, Чарнігаўскай і інш. губерняў), расійскіх гарадоў (Калугі, Масквы, Тулы, Смаленска, Курска). Іншаземцы прыбылі з Аўстрыі, Прусіі, Італіі, Даніі, Швецыі і іншых краін. Ёсць таксама купцы з Каралеўства Польскага[60].

А тавараў столькі навязлі, што вочы разбягаюцца. Рознага сорту сукно з Масквы, Ніжняга Ноўгарада, скураныя вырабы з Пецярбурга, Масквы, Казані, бронзавыя, медныя і жалезныя вырабы тульскіх, цвярскіх, паўлаўскіх заводаў, фарфоравы і фаянсавы посуд, шкло са Смаленскай губерні. Вялікарускія купцы прывязлі таксама футры,

---

[59] Остроменцкий Г. Описание Зельвенской ярмарки // Журнал МВД. — 1831. — Кн. 2. — С. 155.

[60] Швед В. Зэльвенскі кірмапі // Праца — 1986 — 5 красавіка або Гродненская правда — 1985 — 31 августа.

цукар, чай, цыгарэты, мыла. Гэта пералічаны так званыя «расійскія» тавары. З «еўрапейскіх іншаземных» можна назваць ільняное, шаўковае, паўшаўковае і шарсцяное палатно, баваўняныя вырабы, швейцарскі сыр, турэцкі табак, напіткі, бакалейныя і хімічныя тавары. Да «азіяцкіх каланіяльных» тавараў адносіліся кітайскі чай і бухарскія вырабы з воўны. Усяго тавараў прывезлі ў час нашага знаходжання (1830 г.) на 748 тысяч рублёў асігнацый[61].

Гандлявалі на Анненскім кірмашы буйной рагатай жывёлай і коньмі. Іх пыганялі памешчыкі і гандляры Лідскага, Кобрынскага і Брэсцкага паветаў Гродзенскай губерні, часткова Валынскай і Люблінскай (Каралеўства Польскае) губерняў. Збывалі тут коней і Сапегі, якія мелі свой конны завод, дзе было каля паўтары тысячы коней англійскай, дацкай, турэцкай парод[62].

У сваей справаздачы за 1830 г. Гродзенскі губернатар напіша: «Па ліку купцоў, па колькасці тавараў і распрадаж оных перавялічыла ўсякія спадзяванні і былыя кірмашы. Каменныя лаўкі ўсе амаль былі занятыя і звыш таго мноства пабудавана балаганаў... цукру, кавы, перацу, тытуню, драўлянага масла і іншага, па здарэнню змяншэння на оныя кошту супраць былых гадоў, было недастаткова. Кава, мыла, васкавыя свечы, вырабы папяровыя і шоўкавыя, сукна з асабістых фабрык тутэйшай губерні, а найбольш з Царства Польскага, таксама пушны тавар, усё прадана. Рыбы, якой тут даволі абшарны робіцца гандаль, не даставала ўжо на першым тыдні кірмаша»[63].

Акрамя гандлю, падчас існавання кірмашу заключаліся кантракты на дастаўку ўсялікіх гандлёвых грузаў, на арэнду маёнткаў, фальваркаў, прамысловых прадпрыемстваў, лесу і г. д. Дробная шляхта шукала «шчасця і чыноў», прапануючы свае паслугі магнатам. Некаторыя прыязджалі ў пошуках грашовай пазыкі. Дваранства з'язджалася на свае саслоўныя з'езды, бавіла час у раскошы і забавах. У Зэльве выступалі жанглёры, фокуснікі, акрабаты, цыганы з дрэсіраванымі мядзведзямі, тэатральныя трупы. У Гродзенскім гістарычным архіве захаваліся праграмкі спектакляў 1844-1845 гг.; камедыя «Глухой или Полный заезжий дом», меладрама з французскага «30 лет жизни игрока», камедыі «Мирандолина или красивая хозяйка» і «Где наши мужья ходят», камедыйная опера «Обед с Магдолиною».

---

[61] Вишневский А. Ф. Ярмарочная торговля городов Белоруссии в период кризиса феодализма (30-50 гг, XIX в.) // Вопросы истории. — Мн., 1974. Вып. 1 — С. 28.
[62] Цітоў В. С. Зэльвенскі кірмаш // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. — 1978 — № 3 — С. 31.
[63] Журнал МВД. — 1831. — № 2. — С. 156-157.

Зрабіўшы ўсе патрэбныя закупкі, Дзедка з Бабаю ўладкавалі паклажу на воз і рушылі ў зваротную дарогу. Дзедка падзяліўся навіною, — чуў ён, што некаторыя гандлюючыя ў Зэльве купцы хадайнічаюць аб адкрыцці тут другога кірмашу з 2 па 20 лютага і што іх падтрымлівае нават падпалкоўнік корпуса жандараў Прасолаў. «А чаму ж і не?» — падвёў вынік Дзедка: і гандаль мясцовымі таварамі пашырыцца, і жыхарам гірыбытак ад здачы ў найм лавак, памяшканняў, жылля і іншае, і казне крыніца даходаў.

Але не такія радужныя перспектывы чакалі Аненскі кірмаш. У 1840-1850-я гады кошт прывозімых тавараў быў яшчэ высокі, але працэнт іх продажу скараціўся. У 1860-1870-я гг. кірмаш канчаткова страціў сваю былую веліч аднаго з буйнейшых гандлёвых цэнтраў у Беларусь У «Обозрении Гродненской губернии за 1890 год» гаворыцца: «Значащаяся по официальным сведениям месячная ярмарка в м. Зельве Волковысского уезда давно уже потеряла свое значение и в настоящее время заключается только в том, что по воскресным дням бывает более оживленный торг рогатым скотом, лошадьми и разными сельскохозяйственными произведениями»[64]. Гэта было заканамерным працэсам — на змену перыядычнаму гандлю, які абслугоўваў феадальную эканоміку і адносіны паміж вытворцамі і спажыўцамі, ішоў стацыянарны гандаль, больш адпавядаючы капіталістычнаму развіццю Расійскай імперыі.

## ЗНЕШНІ ГАНДАЛЬ ГРОДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ

Гродзенская губерня адыгрывала значную ролю ў агульнарасійскім знешнім гандлі, таму цікава будзе на фоне сённяшняга дня паглядзець, якія тавары ўвозіліся і вывозіліся з Гродзеншчыны.

Больш усяго экспартавалі за мяжу хлеб. Гаворачы аб значнасці гэтага, гродзенскі маршалак Чацвярцінскі пісаў губернатару, што ў 1830 г. ад забароны вывазу хлеба за мяжу многія ўладальнікі маёнткаў мелі страты і не маглі плаціць падаткі і ўтрымліваць сябе і павінны былі звярнуцца за пазыкай да Дзяржаўнага банка або прыватных асоб. Гандляры скупалі хлеб у сялян і памешчыкаў, купцы праз фактараў і падрадчыкаў — на кірмашах, базарах і проста па вёсках. Аптавікі везлі хлеб водным шляхам за мяжу, у асноўным у прускія парты Данцыг і Кенігсберг. Некаторыя памешчыкі дабіраліся сюды сваім транспартам. Напрыклад, П. Ельскі, Л. Пац, В. Пуслоўскі, Р. Тызенгаўз, М. Дзеконскі і

---

[64] Обозрение Гродненской губернии за 1890 год, — Гродно, 1891. — С. 40.

іншыя ў 1830 г. наладавалі свае судны і па Неману адправілі іх у Прусію[65].

У 1850-я гады ў сярэднім штогод вывозілася за мяжу ад 150 да 175 тыс. чацвярцей жытняй мукі, жыта, пшаніцы, аўса, ячменю, грэчневай і ячневай круп (усё гэта і называлася «хлеб»). Экспартавалі нават ва неўрадлівыя гады, толькі тады павялічваўся прыток на Гродзеншчыну хлеба з паўднёвых расійскіх губерняў[66].

Другім прадметам экспарту Гродзенскай губерні былі лясныя матэрыялы: будаўнічыя, дошкі, бярвенні, клёпка і іншае. Лес пастаўляўся ўладальнікамі прыватных дач і лесапрамыславікамі, якія набывалі яго з казённых фондаў з дазволу ведамства дзяржаўных маёмасцяў. У 1850-я гады з Гродзеншчыны па Неману, Бугу, Нарве сплаўлялася ў балтыйскія парты, а адтуль у Англію штогод да 40 тыс. бярвенняў, да 25 тыс. брусоў і болей 10 тыс. лежакоў — усяго на суму 200-250 тыс. руб. Гэта складала палову вывезенага хлеба і болей 21% усіх тавараў, адпраўленых з губерні вадою[67].

У Рыгу, Лібаву, Мемель, Кенігсберг вывозілі з Гродзенскай губерні лён і льнасемя. Туды ж ішлі ў значнай колькасці хмель, табак, спірт, каровіна масла, віно з хлеба і бульбы, макуха (жмыхі канаплі), сала, мяса.

З-за мяжы Гродзенская губерня атрымлівала соль, сыравіну, хімічныя рэчывы, машыны і абсталяванне для прадпрыемстваў, металы і вырабы з іх, мануфактурныя і «каланіяльныя» тавары, прадметы раскошы і моды. Асноўны артыкул імпарту складала пруская соль. Яна пападала ў губерню звычайна праз Кенігсберг. У 1832 г. у Гродна было прывезена 22782 пуды солі, а ў 1845 г. - 409310 п., ў 1860 г. - 405239 п. Павелічэнне ўвозу солі дыктавалася ростам насельніцтва губерні (асабліва гарадскога).

Для суконных і кортавых фабрык губерні прывозілі шэрсць, фарбу, машыны. У 1850-я гады прывоз шэрсці штогод дасягаў 65 тыс. пудоў на суму да 850 тыс. руб. З Бельгіі, Саксоніі і Прусіі везлі машыны, жалеза і металічныя вырабы, якія ішлі не толькі для ўнутранага спажывання, але і вывозіліся ў іншыя губерні Расіі. Напрыклад, у 1849 г. з Прусіі прывезлі жалезнай прадукцыі на 17665 руб.

---

[65] БДГА, ф. 1, воп. 5, сп. 780, л. 1; сп. 965, л. 5, 7, 20, 22, 40, 46, 67 і інш.

[66] Там сама, воп. 19, сп. 1299, л. 8 аб., сп. 1300, л. 68, 81; Бобровский П. МГСР. Гродненская губерния... — Ч. 2. — С. 401.

[67] БДГА, воп. 19, сп. 259, л. 1 аб., 3; воп. 13, сп. 777, л. 7; воп. 28, сп. 795, л. 54-55, 194 аб., 202, 217, 229; Бобровский П. МГСР. Гродненская губерния... Ч. 2. — С. 409, 416, 417.

Сярод імпартных прадметаў раскошы былі шаўковыя і шарсцяныя матэрыі, эстампы, прадметы моды, мастацтва, французскія і польскія кнігі, напіткі, «каланіяльныя» тавары перац, карыца, чай.

Значную ролю ў замежным гандлі Гродзенскай губерні адыгрывалі водныя шляхі. У яе межах было пяць судовых дыстанцый: Дабрамыслеўская, Слонімская, Брэсцкая, Мастоўская, Гродзенская. У 1840 г. грузазвароты на іх дасягнулі 240564 руб. серабром[68].

У замежным гандлі Гродзенскай губерні асабліваe месца займае ў 1830-1850-я гады Каралеўства Польскае — тады звязанае з Расійскай імперыяй рэальнай уніяй (рускі цар з'яўляўся адначасова і польскім каралём). Тавараабмен паміж Польшчай і Расіяй адбываўся на асобых умовах: з 1 студзеня 1820 г. уладкавалася новае мытнае ўпарадкаванне, згодна якому адчыніліся 16 мытняў (у тым ліку Гродзенская, Брэсцкая, Шчучынская); тарыфам 1822 г. паміж імперыяй і Каралеўствам Польскім зроблена мытная мяжа і ўказам ад 1 жніўня 1822 г. агаворваны ўмовы гандлю. Напрыклад, уся польская і руская (у тым ліку беларуская) сыравіна прапускалася бяспошлінна, вырабы з асабістай сыравіны абкладваліся пошлінай у 1% , а з імпартнай — у 3% ад кошту тавару. Новы тарыф 1850 г. мытную мяжу паміж Каралеўствам Польскім і Расіяй ліквідаваў і ўсталяваў адзіныя гандлёвыя правілы.

Асноўны паток грузаў з унутраных расійскіх губерняў у Каралеўства і наадварот ішоў праз 8 мытняў Гродзенскай мытнай акругі: Брэсцкую, Прыбораўскую, Гродзенскую, Жаткоўскую, Ганёдскую, Харашчанскую, Цеханавецкую і Нурэцкую (апошнія 5 знаходзіліся ў Беластокскай вобласці, якая ўваходзіла ў склад Гродзенскай губерні). Аналіз спіса асоб, гандлюючых праз гэтыя мытні, паказвае, што значную колькасць іх складаюць купцы і мяшчане з Брэста, Гродна, Мінска, Пінска, Бабруйска і іншых беларускіх гарадоў, гродзенскія памешчыкі. Так, сярод актыўных удзельнікаў замежнага гандлю ў 1830-1840-я гады называліся брэсцкія І гільдыі купцы Л. Вергафціг і І. Скварцоў, гродзенскі ІІ гільдыі купец Я. Фрумкін, памешчыкі Свечын, Пуслоўскі, Высоцкі, Твардоўскі і іншыя[69].

Звароты гандлю паміж Польшчай, Расіяй праз мытні Гродзенскай акругі залежалі ад тарыфнай палітыкі рускага ўрада: павялічваліся

---

[68] Виды внутреннего судоходства в России. — СПб., 1841. С. 399-445.
[69] РДГА, ф. 19, воп. 3, сп. 1078, л. 35; сп. 1081, л. 154-155; сп. 1083, л. 148; сп. 1084, л. 132 і інш.

пошліны — падалі звароты і наадварот. Напрыклад, у 1832 г. прывоз складаў 1266378 руб. серабром, вываз — 3364553 руб. ср., а ў 1839 г. адпаведна 696147 і 2315204 руб. ср. Найбольшыя звароты ў 1830-1850-я гады былі па Брэсцкай мытні, праз якую прывозілі болей 80% усіх тавараў з Каралеўства Польскага і вывозілі 30-60% . Экспартавалі скуру, баваўнянапапяровыя і льняныя вырабы, хлеб, канаплянае і каровіна масла, пеньку, мыла, жывёлу і коней. У 1830 г. кошт вывезенага дасягаў — 1118070, у 1845 г. — 655400 руб. ср. Сярод імпартных тавараў былі машыны і абсталяванне для суконных фабрык, рамёстваў і сельскай гаспадаркі, шэрсць-сырэц, металы і вырабы з іх, шкло і шкляны посуд, хімічныя тавары, фарба, цыкоры, кнігі, музычныя інструменты. У 1830 г. кошт прывезеных тавараў складаў 1695736, у 1845 г. — 731807 руб. ср.[70]

Вось такім быў знешні гандаль Гродзенскай губерні ў час апошняга трыццацігоддзя існавання прыгоннага права. Можа нейкія традыцыі памогуць нашым сённяшнім гандлярам?

## ПАДЗЕІ ПАЎСТАННЯ 1863 ГОДА Ў СЛОНІМСКІМ ПАВЕЦЕ

Напомню ўсім вядомы факт — аб распаўсюджванні Вікенціем-Канстанцінам Каліноўскім «Мужыцкай праўды» на Слонімшчыне. Вось што пісаў у сваім рапарде губернатару І. Галеру прыстаў 2-га стану Слонімскага павета Л. Ф. Агацін: «...З ліку сялян в. Шэйнякі Марцін Мікуцін, Антон Агіевіч і Міхаіл Лукашэвіч паяснілі, што 7 чысла бягучага кастрычніка месяца ў 5 гадзін папалудні падарожны, едучы паштовым трактам праз в. Шэйнякі ў гор. Ваўкавыск на пары паштовых коней, выкідваў скруткі папер на дарогу і названыя сяляне, падымаючы, звярталіся да пісьменных сваіх сабраццяў, прачытаць...

Вынікам такога растлумачэння сялян звярнуўся на Ражанскую паштовую станцыю і па запатрабаванай мною асабістай спраўцы выкрыў, што падарожным пасажырам быў, як бачна з кнігі, у 5 гадзін выехаўшы нехта дваранін Вікенці Каліноўскі, па падарожнай вашага правасхадзіцельства ад 5 кастрычніка за № 16668, яму выданай, вяртаючыся з гор. Слоніма ў гор. Ваўкавыск»[71].

Адбылася гэта падзея 19 кастрычніка 1862 г. (па новаму стылю). Цікава высветліць, чаму завітаў у Слонім Вікенці Каліноўскі? Справа

---

[70] Там сама, ф. 19, воп. 3, сп. 1017, л. 23-30; сп. 1027, л. 30-36; сп. 1077, л. 44-50; сп. 1092, л. 22-29.
[71] Шалькевич В. Ф. Кастусь Калиновский. Страницы биографии. — Мн., 1988. — С. 162.

больш складаная, чым толькі распаўсюджванне першай беларускамоўнай газеты.

Старажытны горад на Шчары быў адным з апорных пунктаў Гродзенскай рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыі, створанай у 1861 г. Слонімскі павет з'яўляўся яе часткай і меў свой павятовы камітэт: цывільным начальнікам павета быў доктар Уладзіслаў Генрыхавіч Сімановіч (1831, Вільна - 22.09.1890, Чэлябінск), а пасля яго арышту ў маі 1863 г. - Іосіф Стравінскі; вайсковым начальнікам стаў Францішак Юндзіл (1825-14.02.1865); начальнікам горада Слоніма — доктар Валяр'ян Антонавіч Вільчэўскі (1838-1916). Слонімскі павет дзяліўся на акругі, акругі — на прыходы, прыходы — на сотні, а апошнія — на дзесяткі. 3 лютага 1863 г. Слонімскі павет быў падпарадкаваны намесніку ўрадавага камісара Эразму Заблоцкаму.

Павятовае падполле знайшло сабе прытулак у Слонімскай грамадскай публічнай бібліятэцы, дзе бібліятэкарам быў будучы паўстанец Цэзар Казіградскі, і ў самадзейным тэатры, якім кіраваў доктар Антон Макржэцкі. На тайныя пасяджэнні прыходзіла прагрэсіўная частка інтэлігенцыі, дваранства і мяшчан. Сярод іх былі: Я. і В. Валовічы, Ф. Волбэіс, Я. Гарбоўскі, І. Герубовіч, К. Гнаінскі, А. і Э. Керсноўскія, Э. Корсак, С. Ліпскі, І. Лукашэвіч, К. Мацкевіч, В. Міўгер, Ф. Мікульскі, А. Незабытоўскі, П. Орда, Г. Палубінскі, К. Пілецкі, Ю. і Е. Пратасевічы, Э. Рагоза, У. Сімановіч, В. і І. Юндзілы і іншыя[72].

Гэтыя людзі збіралі зброю, порах, свінец, рыхтавалі запасы харчу, лекаў, вопраткі. Але галоўнай справай была арганізацыя баявых груп. Значную ролю адыграў у гэтай справе былы кавалерыст, штабротмістр засядацель Слонімскага павятовага суда Леў (Лявон) Чарняўскі. Ядро галоўнага атрада стварыў пад Мілавідамі Ісідар Лукашэвіч (Галоска), правая рука Ф. Юндзіла, камандзір атрада. Спачатку было толькі 30 чалавек, але хутка колькасць узрасла да 250-300 чал. Па даным следчай камісіі за верасень 1863 г. па г. Слоніму пад арыштам знаходзілася 128 чал., у тым ліку 74 селяніна, 6 дзяржаўных, свабодных і казённых сялян, 9 дваровых, 10 мяшчан, 4 шляхціцы, 2 памешчыкі, 13 дваран, 5 аднадворцаў, 3 стражнікі, бурмістр і наглядальнік Слонімскай бальніцы. Прыведзеныя лічбы гавораць аб пераважнай большасці ў атрадах і групах сялян, якія ведалі, што яны ўзяліся за зброю не толькі для таго, каб адстойваць незалежнасць айчыны, але і роўнасць усіх саслоўяў. Сялян як раз і абвінавачвалі ў актыўным удзеле ў паўстанцкіх атрадах,

[72] Кісялёў Г. Слонімскія інсургенты // Звязда. — 1993 — 12 лютага — с. 4; Супрун В. За смугою часу. — Мн., 1994. — С. 98.

а дваран і шляхту — «у зносінах з паўстанцамі і ўкрыванні, за выдачу харчовых прыпасаў». Прыгадаем сярод іх 23-гадовага Іосіфа Лазарчука, 20-гадовага Міхаіла Нагорнага і селяніна 60-гадовага Сцяпана Вікенцьевіча Хмеля[73].

Прывядзем адзін дакумент аб дзейнасці слонімскіх паўстанцаў: «1863 апрель 26. Рапорт слонимского земского исправника Порадовского И. В. Галлеру о нападении повстанцев на почтовую ст. Заполье.

Секретно

Во вверенном мне уезде 22 числа сего апреля в 11 час. пополудни появилась на Запольской станции, состоящей на Московско-Варшавском шоссе, партия инсургентов до 40 чел. вооруженных, которые приказали отпереть комнаты, где пили чай и ужинали, потом, забрав насильно из почтовой станции 22 лошади, 7 ямщиков, 7 бричек, 4 седла, 2 казенных пистолета, саблю, нагрудную сумку, 3 бочки овса, недалеко (от) станционного дома изрубили 4 телеграфных столба, прорвали проволоку, потом отправились из Запольской станции по шоссе по направлению к м. Березе, где на 60 пятой версте сожгли мост, состоящий на шоссе, и все почтовые брички.

О чем в. п. сим почтительнейше честь имею донести.

Зем. исправник Порадовский».

Прааналізаваўшы хроніку паўстання 1863 года на тэрыторыі Гродзенскай губерні, можна з упэўненасцю сказаць, што больш усяго баёў і сутычак паміж расійскімі ўрадавымі часткамі і атрадамі паўстанцаў адбылося на тэрыторыі Слонімскага павета — 18. Важную ролю слонімскіх інсургентаў разумеў, відаць, і сам кіраўнік паўстання ў Літве і на Беларусі В.-К. Каліноўскі. Нездарма ж ён 21 мая (1 чэрвеня) 1863 г., напярэдадні вядомай бітвы пад Мілавідамі, прыехаў да паўстанцаў, зрабіў агляд аб'яднанага войска, падбадзёрыў, даў указанні і парады.

Цікава паглядзець і на саму хроніку паўстання 1863 г. на тэрыторыі Слонімскага павета. Скласці яе было даволі нялёгкай справай — даныя раскіданы па розных крыніцах і літаратуры. Спадзяюся, што мясцовым краязнаўцам яна дапаможа ў распрацоўцы тэматыкі паўстання 1863 г. на Слонімшчыне[74].

---

[73] Дрозд С. З рэвалюцыйнай дзейнасці Кастуся Каліноўскага на Гродзеншчыне // Нёман. Сб. произведений писателей Гродненской обл. — 1958 — № 2 — С. 181.

[74] Выкарыстаны наступныя публікацыі: Восстание в Литве и Белоруссии 1863-1864 гг. - М. 1965. - С. 358, 363-370, 401; Зайкоўскі Э. За землю, за волю//Белар. мова і літаратура ў школе 1989 - № 2 - С. 54-55; Ігнатоўскі У. 1863 год на Беларусь Нарыс падзей. — Менск,

9.05. Пяскі (16 км ад Бярозы Картузскай), бой паміж паўстанцамі і карнікамі. Страты абодвух бакоў невядомы.

10.05. Янін (6 км на поўнач/усход ад Лыскова), сутычка паўстанцаў з царскімі войскамі.

12.05. (па некаторых крыніцах 13.05.) Смалярка. Бой атрада Ф. Уладака супраць карнікаў. Партызанскімі дзеяннямі ахоплены таксама Бяроза-Картузская і Шкляная Гута.

14.05. в. Міхалін (18 км паўн/зах. Бярозы Картузскай). У Міхалінскай карчмы адбыўся бой паміж атрадам пад кіраўніцтвам Г. Стравінскага (500-800 чал.) з царскімі войскамі (2 роты салдат і каля сотні каэакаў). Апошнія пад націскам паўстанцаў адышлі. Ад поўнага паражэння іх выратавала паспеўшая дапамога з м. Сельца і м. Картуз-Бярозы.

2.06. Урочышча Пагарэлае. У Ружанскай казённай дачы адбыўся бой паміж 2 ротамі Неўскага палка і 20 казакамі Данскога № 33 палка на чале з маёрам фон Крамерам з атрадамі паўстанцаў (да 750 чал.) пад кіраўніцтвам А. Лянкевіча (Ляндэра) і А. Духінскага. Апошнія страділі забітымі 127 чал. і палонным — 1. Карнікі — 4 забітымі, 8 параненымі.

3.06. в. Мілавіды. Тут адбылася найбольш буйная аперацыя 1863 г. у Гродзенскай губ. Ужо з канца мая ў Мілавіцкіх лясах пачалася канцэнтрацыя паўстанцкіх атрадаў з розных паветаў: з Ваўкавыскага — Г. Стравінскага (Млотка), з Гродзенскага — частка атрада А. Лянкевіча (Ляндэра), з Навагрудскага — В. Міладоўскага, з Пружанскага — Ф. Уладака (Владака), са Слонімскага — Ф. Юндзіла. Да паўстанцаў далучыліся ямшчыкі паштовых станцый, рабочыя Міхаліцкага шклозавода, дваровыя і батракі памешчыдкіх маёнткаў. Усяго набралася да 800 чалавек (па даных царскіх служачых — да 3 тыс.) пад агульным кіраўнідтвам Лянкевіча. На разгром паўстанцкіх узброеных сіл былі накіраваны са Слоніма тры роты Стараінгерманландскага палка, 30 коннікаў, 4 гарматы палкоўніка Булгарына, казакі — усе пад камандаваннем генерала З. С. Машокіна. Лянкевіч расставіў свае сілы наступным чынам: на правым баку ад шашы — Стравінскі і Хадакоўскі, на левым — Владак і частка атрада Юндзіла

---

1930. - С. 157, 234; Кашпераў В. Ф. Было гэта пад Мілавідамі//Помнікі гісторыі і культуры Беларусі - 1982 № 3 - С. 25; Кісялёў Г. Указ. сач. - С. 4; Миловидов А. И. Перечень боевых столкновений русских войск с польскими повстанцами в кампании 1863-1864 гг. в пределах Северо-Западнюго края... - Вильна, 1915; Філатава А. З. З хронікі баявых сутычак паўстанцаў // Беларускі гістарычны часопіс. - 1993 - № 3 - С. 59-60; Zieliński St. Spis chronologiczny i alfabetyczny bitw i potyczek 1863-1864. - Krakow, Rapperswil, 1913.

(каля 180 стральцоў), за імі касінеры на чале з Ельскім і ксяндзом Лашкевічам. У ноч на 3.06. Владак забраў сваіх людзей, не згадзіўшыся з прапанаваным планам бітвы, і пайшоў у бок Кобрына да Р. Траўгута.

Апоўдні царскія войскі атакавалі лагер паўстанцаў. Бой працягваўся да 9 гадзін вечара. Касінеры адбілі тры атакі карнікаў, вытрымалі бамбардыроўку. Урадавым часткам не ўдалося захапіць лагер і разграміць паўстанцаў, 10 чал. было забіта і 40 паранена. Але і паўстанцы ў ноч з 3 на 4.06. таксама адышлі, страціўшы 9 чал. забітымі, 5 параненымі, 2 палоннымі. Паўстанцкае кіраўніцтва разбурыла планы царскага камандавання, але не змагло свой поспех замацаваць смелаю атакаю на адыходзячых карнікаў. Гэта адбылося па прычыне адсутнасці еднасці і паразумення сярод камандзіраў-паўстанцаў: Лянкевіч не згадзіўся на наступление. Ініцыятыва і час былі страчаны, а да рускіх частак падыходзілі новыя атрады.

Войскі паўстанцаў пакінулі лагер пад Мілавідамі. Міладоўскі вярнуўся ў Навагрудскі павет, і хутка быў разбіты, Владак і Духінскі пайшлі ў Ваўкавыскі павет. Каля Мілавід засталася група каля 50 чал., якая праз некалькі дзён падверглася нападу войск генерала Эггера і, відаць, яна ж, ратуючыся ад пагрому, адышла бліжэй да Міншчыны і каля в. Чамялы была акружана і разбіта.

7.06. Сялец, Гора, Мышанка. Адышоўшыя ад Мілавід паўстанцы стаялі лагерам на ўзвышшы «Остров Гора» сярод балот, зарослых лесам. Іх атакавалі 3 роты генерала Эггера. Пасля перастрэлкі паўстанцы адышлі.

8.06. Мерачоўшчына (а таксама Бронзавае Балота, Ружаны, Ружанская пушча, Косава, Сярадаўскі лес). Як бачым, сутычкі адбываліся на радзіме Т. Касцюшкі: у Ружанскай казённай дачы, на ўчастку Пагарэлае, царскія войскі напалі раптоўна на паўстанцаў, якія ажыццяўлялі пераправу праз рэчку Сяродаў. Камандзірам атрада быў А. Духінскі, але казакі адрэзалі яго ад масы паўстанцаў і камандаваў імі В. Урублеўскі. Нягледзячы на колькасную перавагу праціўніка (3 роты), ён здолеў арганізаваць абарону, некалькі гадзін утрымліваў яе, тройчы контратакаваў рускія войскі і потым адышоў за рэчку. Паўстанцы страцілі 13 чал. забітымі і 8 параненымі.

9.06. в. Туравічы, в. Кулікі. Паміж дзвюма вёскамі, на р. Мышанка, у 12 в. ад Мілавід, 3 рота Рэвельскага пяхотнага палка пад кіраўніцтвам маёра Скарабагатава сустрэлася з атрадамі паўстанцаў (каля 600 чал.) на чале з Лукашэвічам, ксяндзом Лашкевічам, Лянкевічам (па некаторых даных — Юндзіла, Міладоўскага, Стравінскага). Страты паўстанцаў: забіта — 15 чал., колькасць загінуўшых у дрыгве — невядома. Карнікі страт не мелі.

10.06. (па іншым даным 9.06.) Сярадава. Пасля двухдзённага адпачынку атрад А. Духінскага — В. Урублеўскага зноў сустрэўся з царскімі войскамі.

13.06. в. Пескі (Чорнае возера). Каля вёскі ў некалькіх кіламетрах ад Чорнага возера адбыўся бой паміж аб'яднаных атрадаў Ф. Владака і Я. Ваньковіча (Леліва) — каля 600 чал. і дзвюма ротамі Рэвельскага пяхотнага палка і 15 казакамі на чале з падпалкоўнікам Гессельбергам. Страты паўстанцаў — «значительные», карнікаў — 2 чал. забітых. Пасля бою інсургенты разышліся групамі па лесе, а праз тры дні (15-16.06.) зноў злучыліся ў адзін атрад.

15.06. урочышча Янін. Атрад Духінскага-Урублеўскага нанёс страты царскім войскам (3 забіты, 2 паранены), а сам згубіў аднаго чалавека забітым.

16.06. м. Ражанка. Група паўстанцаў (80 коннікаў) заняла мястэчка, забрала з пошты зброю, грошы, коней, колы. Пераначаваўшы тут, пайшла на Слонім.

18.06, в. Караліны. Сутычка ў Мажаеўскім лесе паміж I ротай Стараінгерманландскага палка капітана Дзяканава (страціў 3 чал. забітымі і 3 параненымі) і атрадам паўстанцаў каля 200 чал. (страдзілі 2 чал. забітымі, 1 параненага і 1 палоннага).

21.06. Урочышча Пясец Кацюхова. Бой паміж дзвюма ротамі Стараінгерманландскага палка на чале са штабс-капітанам Шахавым (страты — 1 забіты, 8 параненых) і атрадам Духінскага-Урублеўскага ў колькасці да 800 чал. (забіта больш 40 чал., лічбы, відаць, перабольшаны).

5.07. Фальварак Раманаўка (Дварэцкая воласць). Адбылася перастрэлка паміж ротай Стараінгерманландскага палка капітана Дзяканава (страт не меў) і атрадам паўстанцаў, якія, адыходзячы, страцілі 5 чал. палоннымі.

18.07. в. Львоўшчына (мыза Харабровічы, в. Дзераўная). Сутычка атрадаў Лукашэвіча (Галоскі) і Міладоўскага — усяго 22 чал. з царскім атрадам (29 салдат Стараінгерманландскага палка) на чале з паручнікам Адулевічам і вайсковай вартай. Карнікі не страцілі ніводнага чалавека, а паўстанцы — 7 забітымі (сярод іх Лукашэвіч), 1 параненага і 4 палонных, астатнія адышлі да атрада Юндзіла. Лукашэвіч быў пахаваны каля Харабровіч і дарскія ўлады пільна сачылі, каб ніхто не падыходзіў пакланіцца магіле і ўскласці на яе кветкі. Калі лекар Антон Макржэцкі з жонкай зрабілі гэта, дык на яго завялі карную справу.

20.07. Урочышча Бярозавае балота (зах. 32 км ад Косава). Атрад Влодака сутыкнуўся з ротай капітана Штэкера і быў разбіты, Камандзір з 16 паплечнікамі схаваўся ў Белавежскай пушчы.

Такім чынам, на тэрыторыі Слонімскага павета дзейнічалі мясцовыя групы і атрады, а таксама з іншых паветаў на чале з Юндзілам, Лукашэвічам, Владакам, Стравінскім, Духінскім-Урублеўскім, Лянкевічам, Міладоўскім, Ваньковічам, Лашкевічам. Супраць іх найбольш актыўна дзейнічаў Стараінгерманландскі пяхотны полк, а таксама Рэвельскі і Неўскі пяхотныя палкі і казакі Данскога № 33 палка. Па няпоўных даных (бо царскія служачыя скрывалі свае страты і перабольшвалі сілы паўстанцаў) у Слонімскім павеце паўстанцы страцілі 208 чалавек забітымі, 14 параненымі, 9 палоннымі. Урадавыя войскі згубілі 23 чал. забітымі і мелі 61 параненага, палонных не было (што, мне здаецца, малаверагодна, бо вядома, што некаторыя салдаты самі пераходзілі да паўстанцаў).

Сёння, калі мы адбудоўваем незалежную Беларусь і аднаўляем гістарычную памяць, трэба ўспомніць героях 1863 г. Названыя мною імёны слонімскіх паўстандаў, месцы баёў і сутычак павінны знайсці месца на старонках гістарычнай хронікі «Памяць. Слонімскі раён». Мясцовым уладам, таварыству аховы помнікаў гісторыі і культуры трэба падумаць, як увекавечыць подзвіг тых, хто вёў барацьбу «за нашу і вашу вольнасць».

## ТАВАРЫСТВА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Семнаццатага лістапада (па новаму стылю трыццатага) 1900 года адбыўся ўстаноўчы сход сяброў Гродзенскага таварыства сельскай гаспадаркі. Дазвол на яго арганізацыю атрымаў губернскі маршалак шляхты Ян Урсын-Нямцэвіч. Але смерць не дазволіла яму закончыць справу. Першае ўрачыстае пасяджэнне адбылося 10 (23) лютага 1901 г. ужо пад старшынствам новага маршалка Пятра Вяроўкіна. Прысутнічала 78 чалавек. Жадаючыя запісваліся ў члены таварыства і ўносілі 10 рублёў.

Віцэ-старшынёю выбралі князя Станіслава Святаполка-Чацвярцінскага (ён згадзіўся толькі на шэсць месяцаў, спаслаўшыся на вялікую занятасць). Сябрамі Рады (выканаўчага органа таварыства) сталі: Юльян Урсын-Нямцэвіч, Дзмітры Карыбут-Дашкевіч, Канстанцін Скірмунт, князь Станіслаў Пузыня, Бартош Рашкоўскі, Вячаслаў Банькоўскі, Казімеж Волмер, Аляксандр Азнабішын, Станіслаў Сехеня. У рэвізійную камісію (кантрольны орган) увайшлі: Ячыноўскі, Шэмет, М. Урсын-Нямцэвіч, Баснін і Бельскі. Сакратаром таварыства прызначылі гродзенскага адваката Бяляўскага, а скарбнікам (казначэем) Коцела. Вырашылі, што агульныя сходы сяброў будуць адбывацца тры разы на год, а Рады — не менш аднаго раза ў месяц.

На агульным сходзе 4 красавіка (тут і далей даты прыводзяцца па новаму стылю) 1901 г. было прынята рашэнне аб стварэнні сельскагаспадарчай школы. Для гэтай мэты доктар Бітнер ахвяраваў 18 дзесяцін зямлі каля Ваўкавыска. Для сельскіх гаспадароў былі сфарміраваны дзве касы: пенсіённая і на выпадак хваробы. Вырашалася пытанне аб адкрыцці ў ваколіцы Гродна на зямлі, ахвяраванай князем В. Друцкім-Любецкім, станцыі кантролю насенняў і гною.

У тэты час у таварыстве было ўжо 150 сяброў. Пашырэнне кола дзеячоў сярод сялян было адной з важных праблем. Сучаснік з Сакольскага павета пісаў у часопісе «Kraj» (№ 4 за 1902 г.): «Павінны мы запрашаць сябрамі не толькі інтэлігентных і выбітных гаспадароў, але і сялян з тых аколіц, якія маюць добрыя водгукі, і нават дазволіць ім бясплатны ўдзел».

У 1904 г. таварыства падрыхтавала вялікую прамыслова-сельскагаспадарчую выставу ў беластоцкім звярынцу, але яна была перанесена на 1905 г. Пачаўшаяся рэвалюцыя не дала магчымасці ажыццявіць задуму. А пасля рэвалюцыі змяніўшаеся грамадска-палітычнае становішча прывяло да скарачэння дзейнасці таварыства[75].

Пасля «двухгадовага поўнага застою», у 1909 г. таварыства было адноўлена. На гэты раз заснавальнікамі стал і вядомыя на Гродзеншчыне памешчыкі і землеўладальнікі: князь С. К. Святаполк-Чацвярцінскі, барон М. Р. Манцейфель, К. Р. Скірмунт, Ю. І. Урсын-Нямцэвіч, С. І. Клімашэўскі і іншыя — усяго 12 чалавек. Згодна «Нормальному уставу для местных сельскохозяйственных обществ» ад 1910 г. мэтай таварыства было «садзейнічаць у Гродзенскай губерні злучанымі сіламі сваіх сяброў развіццю і ўдасканальванню сельскай гаспадаркі і сельскай прамысловасці»[76].

У 1909 г. у склад Рады ўвайшлі 12 чалавек: старшыня — Станіслаў Канстандінавіч Незабітоўскі, таварыш (намеснік) старшыні — Аляксандр Аляксандравіч Азнабішын (віцэ-губернатар Гродзенскай губерні), сябры — барон Ст. С. Брунаў, князь К. Ст. Святаполк-Чацвярцінскі, М. Ф. Адляніцкі-Пачобут, І. І. Біспінг (казначэй), М. А. Блаўдзевіч (сакратар) і іншыя[77]. Кантрольным органам была рэвізійная камісія з

---

[75] Waskiel M. Grodzieńskie Towarzystwo Rolnicze//Bialostoscyzna - 1990 - № 4120 - S. 11-12.

[76] БДГА г. Гродна, ф. 31, воп. 1, сп. 607, л. 13; Солоневич Л. Краткий очерк Гродненской губернии за сто лет ее существования. 1802-1902. — Гродно, 1911. — С. 93-94.

[77] БДГА, ф. 366, воп. 1, сп. 130, л. 178.

чатырох чалавек: С. А. Лямпіцкі, І. І. Урсын-Нямцэвіч, князь С. І. Пузыня, І. А. Скірмут.

У 1909 справаздаўчым годзе «сапраўдных» членаў таварыства налічвалася 68 чалавек, у 1910 г. — 75, у 1912 - 73 чалавекі. Сярод іх — браты Ф. У. і Л. У. Бутаўты-Анджэйкавічы; І. І., М. І., Ю. І. Урсын-Нямцэвічы; бацька і сын К. С. і С. К. Святаполк-Чацвярцінскі, граф І. Ст. Касакоўскі, князь У. А. Друцкі-Любецкі і толькі адна жанчына — графіня Надзея Аляксандраўна Бобрынская. У таварыстве былі чатыры «ганаровых» сябра — старшыня Савета міністраў Петр Аркадзьевіч Сталыпін (з чэрвеня 1902 г. па сакавік 1903 г. — гродзенскі губернатар), князь Станіслаў Канстанцінавіч Святаполк-Чацвярцінскі, Мікалай Аляксандравіч Дабравольскі (з 17 лютага па 1 лістапада 1990 г. — гродзенскі губернатар), А. Е. Ярмолаў.

Бюджэт таварыства складаўся з гадавых сяброўскіх складак (узносаў), даходаў ад праводзімых мерапрыемстваў, ахвяраванняў грамадскіх установ, субсідый дэпартамента земляробства Упраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцяў, урадавага агранома Гродзенскай губерні і дзяржаўнай казны. Напрыклад, у снежні 1913 г. Упраўленне дало 4 тыс. руб. на мерапрыемства па паляпшэнню жывёлагадоўлі. Дапамога ад казны ў 1911 г. — 4.500 руб., у 1912 г. - 5.700 руб., у 1913 г. - 8.000 руб.[4]

Пры таварыстве існавалі камітэты: агранамічны, па вінакурэнню, па конегадоўлі, па крухмальнай вытворчасці (з 1903 г.), па жывёлагадоўлі (з 1903 г.). У 1911 г. быў створаны «Саюз жывёлаводаў і жывёлазаводчыкаў». Гродзенскае таварыства сельскай гаспадаркі мела сваё памяшканне і ўказвала свой адрас такім чынам: чыгуначная станцыя, пошта, тэлеграф, тэлефон — г. Гродна. На жаль, пакуль што мне невядома, у якім гарадскім будынку збіраліся сябры таварыства. Раён жа яго дзейнасці ў 1900 г. ахопліваў дзевяць паветаў. Гэта значыць, што амаль на ўсю Гродзенскую губерню, акрамя Брэсцкага, Кобрынскага, Пружанскага, Бельскага паветаў, дзе дзейнічала Брэсцкае таварыства сельскай гаспадаркі. Так, напрыклад, існавалі аддзяленні Гродзенскага таварыства ў м. Лунна, Заблудава, Кузніца, г. Ваўкавыск, Слонім, м. Скідаль, Маеты, Індура, Крынкі.

Уся дзейнасць таварыства была накіравана на перабудову сельскай гаспадаркі і прамысловасці. Успомнім, што ў гэты час у Беларусі праходзіць сталыпінская аграрная рэформа. Паводле указу ад 29 мая 1911 г. землеўпарадкавальныя камісіі атрымалі права прымусова выдзяляць сялянам зямлю ў адным участку і перасяляць іх на хутары. Таварыства дапамагала рэалізоўваць гэты ўказ. У «Запісцы Рады Гродзенскага таварыства сельскай гаспадаркі» яшчэ ў 1903 г.

(калі гродзенскім губернатарам быў Сталыпін) падкрэслівалася, што «ва ўладкаванні хутарнага валодання сялян і ў рассяленні шматдворных вёсак павінен быць цэнтр цяжару мерапрыемстваў, накіраваных для развіцця сельскагаспадарчай прамысловасці ў сялянскім свеце. Без гэтага ўсё астатняе будзе толькі шэрагам паўмер і насіць чыста паліатыўны характар»[78].

Перш за ўсё таварыства даследавала становішча гаспадарак сваіх членаў. Для гэтага былі складзены «вопросные листки», збіраліся статыстычныя звесткі, ажыццяўляліся экскурсіі па ўзорных гаспадарках (каля 1905 г. іх было 15). Дармова або за меншы кошт сябры таварыства забяспечваліся насеннем хлябоў, траў, тэхнічных раслін і агародніны (такім чынам укараняўся шматпольны севазварот), пасадачным матэрыялам пладовых дрэў, племянной жывёлай, угнаеннямі, тахнікай (жняяркі, маслабойкі, сепаратары, пралкі, лядоўні). Значную ўвагу ўдзяляла таварыства барацьбе з рознымі ворагамі сельскай гаспадаркі, такімі як: пяскі, яры, дрыгва, эпізаотыі, шкоднікі раслін, хваробы жывёл. Сябры таварыства скасоўвалі цераспалосіцу, урэгулёўвалі лясную і водную гаспадаркі, арганізоўвалі кааператывы, наладжвалі народны дробны крэдыт, садзейнічалі мерам па развіццю кустарнай прамысловасці, змяншэнню пажараў і лепшага захавання мясцовых дарог.

У функцыі таварыства ўваходзіла і распаўсюджванне сельскагаопадарчых ведаў. З гэтой мэтай на агульных сходах чыталіся рэфераты. Напрыклад, у 1911 г. сябар Магілёўскага таварыства сельскай гаспадаркі К. Свяцкі выступіў на таму «Дацкі спосаб кармлення малочнай жывёлы і выкарыстание яго ў нашых гаспадарках», а С. К. Вільпішэўскі — на тому «Аб нітрабактэрыі з насенняў і глебы для павелічэння ўраджаю матылкавых раолін»[79]. Арганізоўваліся выстаўкі, фарміраваліся бібліятэкі, друкаваліся плакаты, праводзіліся курсы. У Гродне існавала сярэдняе сельскагаспадарчае вучылішча, а ў 1913 г., было дазволена стварыць падобную школу.

У справаздачы таварыства за 1911 г. адзначалася «здавальняючае з'яўленне, якое заключаецца ў там, што дзейнасць таварыства ў бягучым годзе не абмяжоўвалася кабінетнымі заняткамі, а прыняло жывы, практычны накірунак, захопліваючы шырокія грамадскія і

---

[78] Там сама, ф. 361, воп. 1, сп. 16, л. 1; ф. 1, воп. 27, сп. 2946, л. 13.
[79] Записка Совета Гродненского общества сельского хозяйства//Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности. Т. XI .Гродненская губерния. - СПб., 1903.- С. 224.

сельскагаспадарчыя інтарэсы»[80]. З галоўных мерапрыемстваў называліся сельскагаспадарчыя курсы, выставы ў Гродне і ўтварэнне даследчага поля «Цагельня». Пра апошняе скажам трошкі больш. Пытанне аб адкрыцці даследчага поля стаяла яшчэ на пасяджэнні агульнага сходу сяброў таварыства 18.09 (1.10) 1910 г. І вось нарэшце яно было арганізавана ў маёнтку Будоўля (цяпер веска ў Абухаўскім с/с Гродзенскага р-на), дзе быў ахвяраваны ў дваццаціпяцігадовае бясплатнае карыстанне ўчастак зямлі памерам у 21 дзесяціну 1920 квадратных сажэняў. Загадчыкам быў Казімір Генрыхавіч Урублеўскі. Ён меў двух асістэнтаў, тэхнічнага памочніка, трох батракоў, служачага лабараторыі і «кароўніцу».

Першыя пробныя пасевы аўса, ячменю, гароху, 20 сартоў бульбы былі зроблены на доследным полі вясною 1911 г. Праз чатыры гады доследы вяліся ўжо па ячменю (10 сартоў), аўсу (15 сартоў), капусце (20), кармавым (13) і цукровым (29) буракам, бульбе (50), жыту і г. д. У 1915 годзе ў «Цагельні» існавалі дзве лабараторыі — хімічная і батанічная, метааралагічная станцыя, батанічны сад, дзе высявалі некалькі дзесяткаў сартоў траў, лекавых і прамысловых раслін. Вяліся вегетацыйныя доследы з калійнымі, фосфарнымі, азотнымі ўгнаеннямі, дзеяннем вапны на глебу. «Цагельня» мела свіран, хлеў для жывёлы, ляднік, калодзеж з помпаю, сховішча гною, сельскагаспадарчыя машыны і інвентар[81].

У 1915 г. Таварыства сельскай гаспадаркі перастала існаваць, бо на Гродзеншчыну набліжалася першая сусветная вайна. На жнівень была спланавана эвакуацыя даследчага поля «Цагельня».

## «ЧОРНЫ ВОРАН»
## (з гісторыі гродзенскага рэкета)

Першага мая 1908 года паліцэйскі ротмістр даносіў гродзенскаму губернатару: «Па атрыманым агентурным сведчанням у г. Гродне створана тэрарыстычная група «Чорны воран», паставіўшая сваёю мэтаю вымаганне грошай у жыхароў, а хто не будзе згаджацца на іх патрабаванні, на тых дзейнічаць тэрорам». У групу ўваходзілі тры маладыя чалавекі: васемнаццацігадовы Хаім Кулік, дзевятнаццацігадовы Эйна Панямунскі і дваццацігадовы Лейба Мараш. У 1906 г.

---

80 Журнал общего собрания Гродненского общества сельского хозяйства. — Гродно, 1914. БДГА, ф. 361, воп. 1, сп. 48, л. 173.
81 Там сама, ф. 361, воп. 1, сп. 47, л. 5—14.

Панямунскі быў сябрам Бунда, а Кулік — сябрам групы анархістаў і меў сувязі з беглым у Амерыку Юдэлем Шарашэўскім. Усе «вораны» былі нежанатыя[82].

Сваёй дзейнасці група спрабавала надаць палітычны характар. У восем гадзін раніцы 21 лютага 1908 г. гарадавы Панцэвіч знайшоў у Хлебным перавулку, каля брамы дома Чартка, «Заявление» гэтай «рэвалюцыйна-тэрарыстычнай» групы. У ім гаварылася, што «Чорны воран» не мае нічога агульнага з групамі «Самаабарона» і «Тэрарысты», вядзе непрымірымую барацьбу супраць палітычнага шантажу, па справах сябры групы ідуць не меней, як удвая, і заўсёды маюць адбітак пячаткі «Група» чырвонага колеру.

Палітычнае афарбаванне «Чорнага ворана» не можа схаваць сапраўдных спраў групы — рэкет. Паліцэйскі ротмістр пісаў: «...сябры азначанай групы патрабавалі ад некаторых мясцовых купцоў-яўрэяў даволі значныя сумы грошай, але калі прыходзілі атрымліваць, дык таргаваліся і згаджаліся на значна меншую суму, але асобы, у якіх група патрабавала грошы, катэгарычна адмаўляюць гэты факт, палохаючыся помсты, і, нягледзячы ні на якія меры, нічога не гавораць». Вымагалі рэкеціры грошы пісьмова альбо на кватэры. Купцы, якія падвергліся прымусу, баяліся даносіць паліцыі, але тая ўсё ж такі адзін выпадак выявіла. Заможны купец Пінхус Іосем атрымаў ад групы пісьмо з патрабаваннем прынесці або выслаць да кафедральнага сабора 300 рублёў. Ён гэтага не выканаў, і тады Панямунскі зрабіў бомбу і потым разам з Кулікам і Марашам 7 сакавіка 1908 г. падкінулі яе Іосему.

На наступны дзень Панямунскі быў арыштаваны, а 9 сакавіка — яго сябры, а таксама нейкім чынам звязаны з імі Аркадзь Шахнаровіч. У час вобыску на двары дома, дзе жылі Панямунскі і Мараш, у пустым хляве знайшлі пячатку групы з падушкай для мастыкі, на гары хаты Куліка — рэвальвер. Пакуль ішло следства, рэкеціры сядзелі ў Гродзенскай турме. Губернатар у сваёй пастанове ад 15 ліпеня хадайнічаў перад Віленскім, Ковенскім, Гродзенскім генерал-губернатарам, каб той узбудзіў справу аб высылцы ўсіх «чорных воранаў» на пяць год перад міністрам унутраных спраў.

Усе намаганні бацькоў арыштаваных не прынеслі пазбаўлення ад кары. Асаблівая нарада пастанавіла выслаць Панямунскага ў паўночныя раёны Табольскай губерні, Мараша і Куліка — у Архангельскую губерню, кожнага на тармін тры гады з 25 жніўня. Да месца ссылкі

[82] Усе матэрыялы гэтага нарыса ўзяты з БДГА, ф. 1, воп. 27, сп. 2919.

рэкеціры былі адпраўдены з этапам, які адышоў з Гродна 11 кастрычніка 1908 г.

Як чытач здагадаўся, акрамя «Чорнага ворана» існавалі і іншыя групы. Дзве з іх мы назвалі. Мэты «Самаабароцы» і «Тэрарыстаў» былі такімі ж самымі. Аб дзейнасці іх у дакументах, якія знойдзены намі ў Беларускім дзяржаўным гістарычным архіве, нічога не гаворыцца. Ды і зразумела чаму, людзі баяліся тэрору: прыклад з купцом Іосемам не спрыяў развязванню языка.

## АПОВЯДЫ СТАРЫХ ГАЗЕТ

У 1979-1982 гадах мне давялося працаваць настаўнікам гісторыі ў Гарадзішчанскай сярэдняй школе Баранавіцкага раёна, Правіла «ад званка да званка» на мяне не распаўсюджвалася — увесь вольны час я аддаваў дзецям і займаўся з імі краязнаўствам. Вынікам нашай плённай працы было стварэнне школьнага краязнаўчага музея.

У час нашых вандровак і пошуку матэрыялаў мне пашчасціла знайсці няпоўную падшыўку газеты «Kurjer Baranowicki» («Кур'ер Баранавіцкі») за 1933/34 гады. Належалі яны гарадзішчанскаму карэспандэнту газеты Леанарду Савіцкаму. Лёс яго мне невядомы, спецыяльна ім я не займаўся, бо цікавіла мяне больш пытанне: што пісалася ў газеце пра жыццё на Гродзеншчыне «за польскім часам»?

На жаль, я не захаваў самыя падшыўкі, а толькі зрабіў выразкі з газет, ды і тыя фрагментарна. Таму гэты нарыс не трэба разглядаць як поўны агляд «Kurjera Baranowickiego» за 1933/34 гады па тэме «Населеныя пункты Гродзеншчыны». Гэта толькі асколкі люстэрка, у якім можна было б убачыць не асобнае, а цэлае.

Некалькі слоў пра саму газету. Пошукі ў архіве і розных энцыклапедычных выданнях пакуль што нічога не далі. На № 1 газеты за 1934 г. ёсць надпіс «Rok III» («Год III»), таму можна вылічыць, што сваё жыццё «Kurjer Baranowicki» пачаў у 1932 г. Гэта быў «незалежны орган дэмакратычны», адказным рэдактарам якога з'яўляўся Вітольд Кішкіс. Рэдакцыя і адміністрацыя газеты знаходзіліся ў г. Баранавічы па вул. Міцкевіча, 9/в, а друкавалася газета ў Вільні на вул. Біскупскай у друкарні «Znicz» («Свяшчэнны агонь»). Выдаўцам газеты быў «Kurjer Wileński» («Віленскі кур'ер») — таварыства з абмежаванай адказнасцю.

А цяпер пагартаем старыя газеты. Аб чым цікавым пісалі яны 60 год назад? Што хвалявала тагачасных жыхароў чытачоў газеты? Паколькі галоўную ролю ў жыцці грамадства адыгрывае эканоміка, таму і мы пачнем з яе.

Найбольш матэрыялаў прысвечана Навагрудскай зямлі - ваяводству, у якім было 1 млн. насельніцтва (46 чалавек на 1 м$^2$). 1/4 тэрыторыі ваяводства, увесь абшар якога 22668 км$^2$, — лясы: сталярная і будаўнічая сасна, фанерная альха, дрэва для вытворчасці паперы, асіна. Вельмі добрая для ільна глеба — ён мог стаць крыніцай дабрабыту і багацця зямлі Навагрудскай. Вялікія абшары лугоў па берагах Нёмана, Шчары, Мышанкі, Сервеча, Молчадзі і г. д. спрыялі для гадоўлі жывёлы і рабалоўства, вытворчасці малака і сыра. Найбольш папулярнымі рамёствамі былі на Навагрудчыне: кравецтва, выраб і рамонт абутку, кавальства, сталярныя працы, вытворчасць мясных і кандытарскіх вырабаў, цырульнік — вартасць прадукцыі ўсіх іх у 1932 г. склала каля 20 млн. злот., што на 20-30% меней папярэдняга года, бо ў Рэчы Паспалітай быў агульны крызіс. Каб палепшыць якасны склад рамеснікаў, у 1930 г. упершыню былі створаны экзаменацыйныя камісіі для здачы экзаменаў на дыплом майстра (краўца, пекара, каваля і г. д.). У склад камісіі ўваходзілі дырэктары або настаўнікі публічных палітэхнічных школ. Экзамены былі па польскай мове, вядзенню фінансавых і вытворчых кніг, тавазнаўству, веданню сацыяльных законаў і г. д. У 1932 г. здавалі экзамен 98 чалавек, хаця ўсіх рамеснікаў у Навагрудку значна болей — проста яны не бачылі розніцы паміж атрымаўшымі дыплом і тымі, у каго яго няма. Такія ж экзамены адбыліся таксама ў Слоніме, Лідзе, Баранавічах.

Значныя функцыі ў эканоміцы адыгрываюць шляхі зносін. У 1934 т. у Стаўбцах узводзіўся стапяцідзесяціметровы мост праз Нёман, у Шыдловічах Слонімскага павета — мост праз Шчару (70 м). У Лідскім павеце для злучэння трактаў Вільна — Гродна і Ліда — Гродна будавалася дарога Мыта — Забалаць, Ліда звязалася з Вільна праз Беняконы. У Шчучынскім павеце будавалася шаша Шчучын — Астрына і да Беліцы. Усяго за першыя дзесяць гадоў пасля 1921 г. было пабудавана 900 км брукаваных дарог, за 1933 г. — 90 км, спланавана на 1934 г. — каля 120 км.

Але не ўсё было так добра ў эканамічным стане. У адным з артыкулаў пра Навагрудак гаварылася, што там няма ніводнай падабаючай крамы, а ўсюды маламесныя крамкі з ненайлепшым асвятленнем, малымі і часта бруднымі вокнамі. Не хапае вялікай галантарэйнай крамы — у суботу няма дзе купіць хустачкі або каўняра. Патрэбны таксама больш вялікія харчовыя і мясная крамы і кравецкая майстэрня.

У Слоніме (гміна Навагрудскага ваяводства) «гаспадарка стаіць ніжэй усякай крытыкі». Не хапала ўласных гадавальнікаў саджанцаў, а

на падмурках «вечна» будуемага будынку мясцовага кіравання зрабілася «сажалка». Праўда, вельмі падобна на нашу рэчаіснасць?

Па матэрыялах газет можна прадставіць выгляд тагачасных гарадоў і мястэчак. У там жа Слоніме на прадмесцях коні вязлі ў балоце, хаця каштоўная маёмасць Слонімскай гміны складалася ў 1934 г. з 6 млн. злот. (а запазычанасць была болей 70 тыс. злот.). Гарадская ўласнасць Навагрудка складала 1778559 злот.: будынак магістрата, тэатр, лазня, аўтобусны вакзал, кінатаатр, электрастанцыя і інш. Найважнейшай справай навагрудскага магістрата было фінансаванне грамадска-гуманітарных мэтаў: утрыманне ў адпаведных установах старых і дзяцей, яўрэйскага шпіталя, лячэнне некаторых бедных і інш. — на што затрачана каля 20 тыс. злот. Ці ні добры гэта прыклад сённяшнім мясцовым уладам?

Пра Ліду аўтар артыкула «Ліда і лідчанкі» піша: «Ліда — мініяцюра Вільні. Такія ж мае шматлікія вузкія вуліцы, вулачкі і брудныя завулкі, малую «Вільню» і «Вілейку». Ёсць таксама сажалкі і басейны. У дужым і прыгожым будынку былога кляштара па вул. Сувальскай знаходзілася староства. Паміж ім і вул. 3 Мая — сквер, дзе адпачывалі старэйшыя, гулялі дзеці і прагульваліся сабакі. Дарэчы, пра апошніх гэты ж аўтар напісаў асобны артыкул пад назваю «Ліда — горад псоў». Іх бегала па вуліцах горада столькі, што аўтар не мог не звярнуць на іх увагу. А сквераў у Лідзе было два — каля староства і на пл. Вызвалення або Вольнасці, а трэці праектаваўся на Выгане, дзе дагэтуль пасвілі жывёлу.

У Лідзе было шмат рэстаранаў. Адзін з іх называўся «Пупко» і карэспандэнт, шуткуючы, напісаў, што «Ліда ёсць Пупко першы, Пупко другі, Пупко чацвёрты, Пупко пяты, Пупко шосты і г. д.». Вось што ўяўляў сабою рэстаран «Брыстоль»: замежны повар, у піўніцы багата розных напояў, ёсць асобныя кабінеты і більярд, добры абед з трох блюдаў каштуе 1 злоты, рыхтуюць групавыя прыёмы па невысокіх цэнах (з рэкламы ад 28 мая 1934 г.). А вось што падалі на абед у рэстаране «Resursa Polska»: на першае — гарохавы суп, на другое — два шніцэлі (па выбару) і на трэцяе — варэнікі.

Галоўнай плошчай Ліды была плошча Славы. Тут адбываліся народныя святы. Напрыклад, святкаванне 3 Мая, калі быў вайсковы парад, іграў аркестр і назбіралася шмат народу. Каля плошчы знаходзіўся сквер і аўтобусны вакзал. Аўтар артыкула «Плошча Славы ў Лідзе» Гегіжын турбаваўся аб уладкаванні клумбаў, траўнікаў, агароджы, бо і тады знаходзіліся «зверы на дзвюх нагах» і «вулічныя героі», якія выломвалі дошкі з плоту і ламалі дрэвы.

У Лідзе можна было ўбачыць шмат маленькіх жабракоў. Звычайна яны круціліся каля ўваходу ў цукершо або кінатэатр, былі кепска адзетыя, брудныя, з сінякамі і гузамі. Дзеці-жабракі былі без торбаў, бо прасілі болын грошай, якія трацілі на білеты ў кіно, ці неслі іх бацькам — а тыя іх прапівалі, а потым п'яныя білі дзяцей. Аўтар артыкула «Аб перамозе жабрацтва сярод дзяцей у Лідзе» заклікаў прымусіць гэтых дзяцей-жабракоў хадзіць у школу, дзе дзяржава апякуецца імі, корміць і нават дае адзежу. Гэта будзе лепш, чым кідаць грошы ў працягнутую дзіцячую руку.

Аднаму з аўтараў артыкулаў Навагрудак паказаўся горадам чыноўнікаў. Ен прыводзіць прыблізныя падлікі па дзяржаўных органах упраўлення і самакіравання: ваяводскае ўпраўленне — 120 сямей, акруговы суд — 100, фінансавае ўпраўленне — 50, ваяводская каманда — 50, разам 320 сямей; павятовае, гарадское і іншыя ўпраўленні (староства, шпіталь, пошта, гарадскі суд, упраўленне фінансаў, школы) — столькі ж. Усяго не менш, як 640 сямей канцылярскіх служачых.

Некалькі слоў пра адукацыю. Вось што ўяўляла сабой гімназія імя Адама Міцкевіча ў Навагрудку ў 1933/1934 навучальным годзе. Дырэкцыя, якую ўзначальваў Вітольд Віткоўскі, паставіла сваёю мэтай удасканальванне сутнасці духоўнагарманізаванай асобы з пастулатамі агульнага дабра і дзяржаўна-грамадскага выхавання. Для рэалізацыі гэтай мэты дырэкцыя зрабіла шмат новага. Былі створаны чытальня і радыё. У рамках узаемапрацы школы і сям'і былі арганізаваны класныя патранаты э бацькоў аднаго класа. Дзеці, якія мелі кепскія ўмовы жыцця ў хаце, адпраўляліся ў бурсу, а тым, хто меў праблемы з харчаваннем, давалі ежу ў гімназіі. Стварылі праблемныя камісіі: гуманітарную, матэматычна-прыродазнаўчую, тэхнічна-артыстычную і фізічнага выхавання. У іх адбываліся дыскусіі па дыдактычна-выхаваўчых праектах. Звярнулі ўвагу на эстатычны выгляд класаў. Сёмы год працягваецца выпуск газеты «Нашае жыццё». Паміж лекцыямі праводзяцца фізічныя практыкаванні.

Адбываліся цікавыя вечары: святы патрона школы і лесу, памяці А. Міцкевіча і А. Скварчынскага, сустрэча 19 сакавіка. Развівалася школьнае самакіраванне, якое наладзіла збор складак «Братняй дапамогі» і кантралявала ўсе вучнёўскія арганізацыі. Існавалі гурткі: паланістычны, краязнаўчы, аматараў аховы прыроды, Чырвонага Крыжа, гістарычны. Гімназісты ездзілі ў вандроўкі да Гдыні, Варшавы, Гданьска, у Белавежскую пушчу, на Свіцязь, хадзілі па Навагрудку (на фабрыку кафлі, мылаварню, прадзільню і інш.). Аматарская група «Папярэдняя ахова» ў канцы школьнага года аб'ехала Любчу, Шчорсы, Карэлічы, дзе прадставіла спектакль «Першы лепшы» Фрэдра і

наладзіла асветніцкую святліду для вясковага насельніцтва. Дзесяць сяброў «Аховы» за актыўную дзейнасць былі пасланы ў лагеры пад Нарач. Для харцэраў быў арганізаваны лагер у Круцілавічах.

Шмат увагі звяртала рэдакцыя газеты на гістарычную і краязнаўчую тэматыку. Настаўнік Баярскай школы Ю. Дубіцкі напісаў пра знаходкі каменных сякер у вакольных в. Баяры і Закаменка Дакшанскай гміны. Мясцовае насельніцтва лічыла іх стрэламі Пяруна. Жанчыны ўжывалі іх як «лекавы сродак»: націралі малочныя барадаўкі карове, калі яна не давала малака. Дубіцкі арганізаваў збор сякер і аб'явіў, што будзе плаціць па 1 злоту за кожную. Мясцовыя каменячосы ў адказ заявілі, што зробяць падобныя за 80 грошай — такі быў узровень гістарычнай адукацыі. Пра яго нізкі стан гаворыць і тое, што наведвальнікі гістарычных месцаў стараліся пакінуць сабе штонебудзь на памяць — адрывалі кавалкі ад паганскага слупа (каменнага алтара каля в. Закаменка), сяляне бралі з курганоў чарназёмную глебу, а адзін прыцягнуў у стадолу вялізны камень з паганскіх могілак (каля в. Баяры) і ўжываў яго як аснову пад стоўб. Разам з вучнямі Дубіцкі перавёз камень на кані ў Баярскую школу. Цікава, дзе гэты помнік гісторыі і культуры цяпер?

Па артыкулу Ю. Жмігродскага «З мінулага Навагрудка» можна скласці кароткую хроніку горада:

XI-XII ст. - заснаванне Навагрудка кіеўскімі князямі;

XIII ст. - паход Батыя, напад на горад, заняцце краю літоўскім князем Эрдзівілам, які будуе тут замак;

1252 - каранаванне ў замку Міндоўга (па дадзеным В. Чаропкі «Імя ў летапісе» яно адбылося 6 ліпеня 1253);

1314, 1391, 1394 - крыжацкія напады;

1415 - Вітаўт збірае ў замку сабор грэка-праваслаўных епіскапаў, каб пазбегнуць залежнасці ад Масквы (В. Чаропка — 15 лістапада 1415 г.);

1422 - кароль Ягайла бярэ шлюб з Сафіяй Гальшанскай у Навагрудскай фары (В. Чаропка — 24 сакавіка 1422);

1503-1504 - татарскія наезды;

1511 - прывілей Жыгімонта I на магдэбургскае права Навагрудку;

1616 - дыскусія кальвіністаў на чале з Янам Зыгровьючам з езуітамі на чале з Бенедыктам Брывіліасам;

1799 - у Навагрудскай фары хрысцілі А. Міцкевіча;

1812 - Навагрудак сустракае напалеонаўскія войскі: у Метраполі (фальварак на канцы вул. Гродзенскай) гасціў Ю. Панятоўскі, у Гарадзілаўцах - генерал Дамброўскі;

1831, 1863 - навагрудчане прымаюць удзел у паўстаннях супраць расейскай улады;

1915 - Навагрудак захапляе 1-я сусветная вайна;

1918, 1920 - бальшавіцкая навала, пасля руска-польскай вайны горад пераходзіць да Рэчы Паспалітай.

Аўтар артыкула «Аб патрэбе манаграфіі г. Ліды» піша, што мае надзею на тое, што новы склад магістрата паставіць на першы план сваёй працы падрыхтоўку кнігі пра горад і яго ваколіцы. Ён даказвае, што яна патрэбна, бо Лідская зямля мае багатую гісторыю: помнікі дагістарычнага чалавека, Балценікі, звязаныя з А. Міцкевічам і М. Верашчакай (Путкамеравай), шматлікія засцянковыя лямусы і калоны, архітэктура касцёлаў, ратуш, гандлёвых радоў і іншае. За напісанне манаграфіі павінен узяцца чалавек «з вялікай скрупулёзнасцю, ведамі і асаблівым закаханнем». Кіраваць падрыхтоўчай працай магло б існуючае Лідскае краязнаўчае таварыства, якое мае добрых аматараў мясцовай гісторыі, некаторыя з якіх назбіралі шмат цікавых матэрыялаў. Таварыства магло б арганізаваць спецыяльныя вечары, прысвечаныя гісторыі Лідскай зямлі (нешта накшталт нашых сённяшніх краязнаўчых канферэнцый). На іх маглі б выступаць і сябры Саюза настаўнікаў, кожны з якіх узяў на сябе збор пэўных матэрыялаў.

У артыкуле «Што адбываецца ў Гродне» Х. Ромер, са слоў Ю. Ядкоўскага — ваяводскага кансерватара, ахоўніка і дырэктара музея — піша, што робіцца па ахове помнікаў гісторыі і культуры. У Старым замку («Літоўскім Вавелю» па словах аўтара) ідзе падрыхтоўка памяшканняў пад музей (ён быў адчынены ў Гродне ў 1922 г., а ў 1930-я пераехаў у Стары замак), кансерватарскія працы. На гэта патрэбна 15 тыс. злот., а грошай не хапае. З гэтай прычыны скарацілі і праграму святкавання 400-годдзя Стэфана Баторыя (яно адбудзецца ў Гродне 25-26 лістапада 1933 г.). Рыхтавалася ў яго гонар памятная дошка, якая будзе замуравана ў замкавай браме. Невядома ці была яна зроблена, а калі была, то дзе яна цяпер? З фінансавай дапамогай ваяводы Касцялкоўскага (2 тыс. злот.) было ўпарадкавана падзамкавае ўзвышша і пабудаваны сцёк пад замкавы мост да Немана. У час гэтых прац былі знойдзены рэшткі забудовы XII ст. Пра раскопкі, якія вялі з 1931 г. Ю. Ядкоўскі, З. Дурчэўскі, падрабязна можна прачытаць у кнізе М. М. Вароніна «Древнее Гродно».

Адбудоўвалася з руін фара Вітаўта. У 1933 г. збіраліся зрабіць гатыцкія вокны па ўзору знойдзеных першапачатковых, а да восені скончыць 15 вітражоў. Ушаноўваўся слаўны 1863 г. Афіцэры штаба III акругі апрацоўвалі карту баёў. У палове чэрвеня ў «Святым балоце», дзе 4 мая адбылася самая зацятая на Гродзеншчыне бітва паміж

паўстанцамі А. Лянкевіча і царскімі войскамі, збіраліся ўстанавіць памятны Крыж.

Ромер піша, што неўзабаве выйдзе кніга прафесара Т. Карбоўскага пра ўраджэнца Гродзеншчыны, сына гісторыка Тэадора Нарбута Людвіка — паўстанца 1863 г. Адзначым, што яна сапраўды выйшла ў 1933 г., прычым у серыі «Гістарычная бібліятэка г. Гродна». На маю думку, вельмі добра было б адрадзіць гэтую серыю. Есць праекты плана выпуску літаратуры пра Гродна і Гродзеншчыну, але няма грошай для іх рэалізацыі. Дабавім ад сябе, што ў 1933 г. на месцы смерці Л. Нарбута, пад Дубічамі (недалёка ад Ліды), 76-ы полк пяхоты імя Нарбута і паставіў крыж у яго гонар. Была ўшанавана тады і памяць Зыгмунта Урублеўскага — таленавітага фізіка, сакратара паўстанцкага начальніка Гродзенскага ваяводства ў час 1863 г., ураджэнца Гродна (1845-1888), сябры польскай Акадэміі ведаў. Яго імя атрымала адна з вуліц Гродна (цяпер — вул. Калюцінская), а ў езуіцкім касцёле ўмаравана памятная дошка.

Сёння ідзе праца над распрацоўкай Міцкевіцкага шляху. Вазьміце брашуру Б. Клейна і Ю. Марошака «Szlak Mickiewiczowski» («Міцкевічаўскі шлях») або публікацыю з газеты «Glos znad Niemna» (1994, 25-31 ліпеня, 1-7 жніўня) і вы даведаецеся пра намаганні і праекты вучоных, краязнаўцаў з Беларусі, Расіі і Польшчы, фонда Міцкевіча і Саюза палякаў на Беларусі. Цікава, што пра Міцкевічаўскі шлях пісалася і 60 год назад. Тады гэты турыстычны шлях ішоў з Навагрудка да Баранавіч: Чамброва – Варонча - возера Свіцязь – Туганавічы – Гарадзішча - Калдычэўскае возера - Завосье - Сталовічы. У 1934 г. будавалася нават палепшаная дарога: з двух бакоў — з Навагрудка і Баранавіч.

Некалькі нумароў газеты было прысвечана турыстычным маршрутам Віленшчыны і Навагрудчыны. Назавём некаторыя з іх, разлічаныя на 2-3 дні, можа нешта спатрэбіцца сённяшнім арганізатарам турызму:

Ашмяны – Баруны – Гальшаны – Крэва – Багданаў - Пушча Налібокская;

Смаргонь – Будлаў – Докшыцы - Пушча Галубіцкая;

Ліда – Навагрудак – Карэлічы – Мір – Ішкальдз - Нясвіж – Стаўбцы - Клецк;

Навагрудак - Міцкевічаўская Навагрудчына – Туганавічы – Варонча – Чаброва - воз. Свіцязь – Заоссе – Сваятычы – Гарадзішча - Баранавічы;

Баранавічы – Жыровіды – Сынкавічы – Альбярцін - Слонім.

Тады ў гэтых населеных пунктах было шмат помнікаў гісторыі і культуры: касцёлы і кляштары ў Ашмянах, Гальшанах, Барунах; замкі ў Лідзе, Навагрудку, Крэве; базыліянская школа ў Барунах, дзе вучыліся браты Ігнаці і Леанард Ходзькі, Антоні Эдвард Адынец. Налібокская пушча, якая раскінулася на 82000 га, была месцам жыцця ласёў, рысяў, кабаноў, аленяў і вельмі рэдкага чорнага бусла.

Вось і ўсё найбольш цікавае з таго, што захавалася ў мяне са старых падшывак газеты «Kurjer Baranowicki». Цяпер я больш уважліва раблю выразкі з газет, бо яны сапраўды могуць многае расказаць.

## «ЛЁС МОЙ - НЁМАН»

Не обмелев, как и прежде
ты катишь вольные волны
Путь моих предков
моею судьбою полный.
(Д. Бічэль-Загнетава)

«Пра Неман расказваюць так. Даўно гэта было. Каля дзярэўні Забалацце, што на нашай Уздзеншчыне, з-пад вярбы выбілася крынічка. Вада ў ёй была халодная, як лёд, а чыстая, як раса. Вада тая ўсё прыбывала, большала, аж пакуль не пабегла па двух рачаінах. Так вось нарадзіліся рэкі Неман і Лоша». Гэтае паданне запісаў у 1982 г. А. І. Гурскі ў г. п. Узда Мінскай вобласці ад Аляксандра Іванавіча Мяцельскага[83].

Энцыклапедычная даведка сведчыць, што Неман (па-руску Неман, па-літоўску Nemunas, у II-XVI ст.ст. Chronon, Ghronus або Chronius) мае плошчу вадазбору — 98,2 тыс. кв. км, з іх 35 тыс. кв. км на тэрыторыі Беларусі; працягласць — 937 км, з іх па Беларусі — 462 км, па мяжы паміж Рэспублікай Беларусь і Літоўскай Рэспублікай — 17 км, па тэрыторыі Літвы — 359 км, па мяжы паміж Літоўскай Рэспублікай і Калінінградскай вобласцю Расіі — 99 км. Нёман упадае ў Куршскі заліў Балтыйскага мора і мае 180 прытокаў, сярод якіх: Шчара, Зэльва, Свіслач, Чорная Ганча і іншыя. Агінскім каналам Нёман злучаны з Дняпром, Аўгустоўскім — з Віслай, Клайпедскім — з Куршскім залівам каля Клайпеды[84].

---

[83] Легенды і паданні / Склад. М. Я. Грынблат і А. І. Гурскі Мн., 1983. — С. 373, 513.
[84] Литва. Краткая энциклопедия. — Вильнюс, 1989. — С. 439

У песні «Нёман» (аўтар вершаў А. Астрэйка, музыка Н. Сакалоўскага) пяецца:

Ой, Нёман, і песня і слава
Народа майго і зямлі,
Магілаю ворагам цеснай
Не раз твае хвалі былі.
Рака наша слаўная Нёман,
Чысцейшая чэрвеньскіх рос,
Хто мар не ўплятаў у твой гоман,
Табе хто пашаны не нёс.
Ой, Нёман, ой, бацька наш родны
Як сонца, як дзень дарагі,
Садамі цудоўнай Радзімы
Твае расцвілі берагі.

Здаўна Нёман быў для гродзенцаў ракой-карміліцай, калыскай, песняй. Цяжка не пагадзіцца з У. М. Кісялёвым, які піша: «Пра Нёман можна гаварыць як пра раку-увасабленне лёсу беларускага народа, як пра раку-помнік, раку-сведку»[85].

Ведае Нёман наш гора былое,
Слёзы людскія, праклён рыбака,
Песні гаротныя, скаргі народныя,
Панскі прыгнет помніць Нёман-рака, —

пяецца ў песні «Наш Нёман» (словы Г. Цітовіча, муз. П. Шэўко). З рэчкай звязана культура старажытных плямёнаў, якія жылі на яе берагах. Многія падзеі, як.ія адбыліся ў слаўнай гісторыі нашай Радзімы, звязаны з Прынёманскім краем, Прынямоннем, гэта значыць з Гродзеншчынай.

Ой, Нёман цячэ, Нёман плыве
Ад нас у літоўскія зямліцы,
А хто там пойме, хто разбярэ
Шопат і гоман нашай рачыцы.
Ой, многа ж яна
З сабой унясла
Нашага шчасця, славы і гора
З сваёй вадой,
З нашаю слязой
З краю ў край аж да сіня мора.

[85] Кісялёў У. М. Пуцявінамі Наднёмання. — Мн., 1994. — С. 9.

Так пісаў Карусь Каганец. Нёман для беларуса, відаць, тое ж самае, што для рускага — Волга, для паляка — Вісла. Гэта рака — сімвал беларускага адраджэння, бо, па словах Аркадзя Смоліча, «то яго хвалі моліць-просіць вуснамі свайго песняра абуджаны Беларускі Народ, каб расказалі чужому краю пра жыццё сваіх сыноў. І Нёман зрабіўся сімваламсувязі нашага адраджэнскага руху з Заходам, з шырокім светам»[86].

Сёння запаскуджаная і згвалчаная рака стала яшчэ і сімвалам нашай злачыннай абыякавасці. Жудасна чытаць такія вось радкі з артыкула ананімнага аўтара «Дзеці памойніцы»: «...монстр «Хімвалакно», падобны на бяздумнае быдла, якое бессаромна спаражняецца ў бацьку-Нёман. З усходу гадзіць яго, абплёўваючы, як цмок, сваім атрутным дыханием «Азот». На поўначы дарабляе іх справу камбінат будаўнічых матэрыялаў. Але і гэтага мала. Дабываючы жвір, зьнішчылі вякамі створаны нёманскі краявід. Зьнішчаюць і далей, і нікому ад гэтага не баліць»[87].

Баліць! І можа мае краязнаўчыя нарысы пра Нёман і прынёманскую гісторыю абудзяць яшчэ чыісьці душы?

### «Стаўся граніцай для ўсіх недаступнай»

Вынесеныя ў загаловак словы ўзяты з паэмы Адама Міцкевіча «Конрад Валенрод» (пераклад Я. Купалы):

Так Нёман,
З даўняй гасціннасці рупны,
Сялібы лучачы братніх народаў,
Стаўся граніцай для ўсіх недаступнай,
І той мог толькі прайсці яе смела,
Каму на волі жыццё надаела.

Углядаюся ў гравюру І. Клаўбера па малюнку Д. Бажэці «Пераход французскай арміі праз Нёман 12 чэрвеня 1812 г.» і чытаю словы ад'ютанта Напалеона Філіпа дэ Сепора аб першым дні ўварвання ў Расійскую імперыю: «У трохсот кроках ад ракі, на самым узвышаным пункце, бачылася палатка імператара. Вакол яе ўсе пагоркі, усе схілы і даліны былі пакрыты людзьмі і коньмі. Як толькі сонца асвятліла ўсе гэтыя рухомыя масы і бліскучае ўзбраенне, хутка быў дадзены сігнал да выступлення, і імгненна гэтая маса прыйшла ў рух і, падзяліўшыся на

---

[86] Смоліч А. Геаграфія Беларусі. — Менск, 1993. — с. 66-68.
[87] Пагоня — 1994 - 4-10.11 - С. 3.

тры калоны, накіравалася да трох мастоў. Відаць было, як гэтыя калоны, выгінаючыся, спускаючыся па невялікай раўніне, якая аддзяляла іх ад Немана, і набліжаючыся да ракі, выцягваліся і скарачаліся, каб перайсці праз маеты і дасягнуць чужой зямлі, якую яны збіраліся спустошыць, і хутка самі павінны былі пасеяць сваімі астанкамі»[88].

10 (22) чэрвеня 1812 г., знаходзячыся ў м. Вільковышкі, каля Коўна, Напалеон напісаў адозву да «Вялікай арміі». На наступны дзень перадавыя часці напалеонаўскай арміі падышлі да Немана і, калі стала цямнець, паміж 8 і 9 гадзінамі, пачалі пераправу на пантонах, плытах, лодках. Французскія пантанеры на чале з інжынерам генералам Ж.-Б. Эбле ў сціслы тэрмін узвялі пад Коўна тры новых масты ў дапаўненне да старога.

Чатыры ночы і чатыры дні з 12 (24) па 15 (27) чэрвеня чатырма плынямі ішлі праз Нёман войскі. Ф. І. Цютчаў, які пабываў тут праз сорак год, у вершы «Нёман» пісаў:

Победно шли его полки,
Знамена весело шумели,
На солнце искрились штыки,
Мосты под пушками
гремели—
И с высоты как некий бог,
Казалось он
парил над ними
И двигал всеми всё стерег
Очами чудными своими...

Так, Напалеон мог быць задаволены. «Ягоная армія,— піша гісторык М. А. Троіцкі, — ішла на вайну, як на парад, шчыльнымі радамі, з разгорнутымі знамёнамі, ва ўзорным, да аутаматызму, парадку, мерным поступай конскіх капыт і салдацкіх сапог. Вусачы-грэнадзёры ў мядвежых шапках з чырвонымі султанамі, волаты-кірасіры ў нагрудных латах, прыбраныя гусары ў алых менціках, строгія драгуны ў касках з конскімі хвастамі, артылерысты, пантанёры, музыканты ішлі міма імператара і захоплена яго віталі. Яны верылі ў ягоную зорку, звыкнуўшыся з тым, што там, дзе Напалеон заўсёды перамога, і адпраўляліся ў чарговы паход з натхненнем і самаўпэўненасцю»[89].

---

[88] Бородино, 1812. — М., 1987. — С. 38.
[89] Троицкий Н. А. 1812. Великий год России. — М., 1988. С. 45.

Хто мог падумаць, што дзень пераходу праз Нёман стане ракавым і для французскай арміі і для самаго Напалеона?

«Ад Немана да Барадзіна» — так большасць гісторыкаў называе першы этап вайны 1812 года. З цяжкімі ар'ергарднымі баямі адступала руская армія, але ўжо ў першыя месяцы быў сарваны напалеонаўскі план маланкавай вайны. Злучыўшыся, рускія арміі далі Барадзінскі бой і засталіся непераможнымі. Пасля бітвы пад Малаяраслаўцам пачаўся каранны пералом: рускія воіны, партызаны і апалчэнцы пагналі Напалеона па старой Смаленскай дарозе. Бярэзінская аперацыя паставіла яго перад катастрофай. «Напалеон, які прыйшоў тыграм, бяжыць зайцам», — пісаў у той час М. М. Карамзін.

Да Немана французы выйшлі ў тым самым месцы, дзе пераходзілі на тэрыторыю Расійскай імперыі. К. М. Бацюшкаў, як відавочца, пісаў:

Снегами погребен, угрюмый
Неман спал.
Равнину льдистых вод и
берег опустелый,
И на брегу покинутые села
Туманный месяц озарял.
Все пусто... Кое-где на снеге
труп чернеет,
И брошенных костров огонь,
дымяся, тлеет,
И хладный, как мертвец,
Один среди дороги,
Сидит задумчивый беглец
Недвижим, смутный взор
вперив на мертвы ноги.

2/14 снежня вярталася дадому праз Нёман не тая «Вялікая армія», а, як пісаў генерал са світы Напалеона Філіп дэ Сегюр, «некалькі тысяч гаротнікаў, апранутых у лахманы, з панурымі галовамі, патухлым позіркам, мярцвецка – зямлістымі тварамі і доўгімі, касматымі ад марозу бародамі... Гэта, была ўся «Вялікая армія»!»[90]

За Нёманам колькасць цэнтральыіай групоўкі французаў вызначалася ў 14-20 тыс. чалавек. Кутузаў прывёў да Нёмана 40 тыс. чалавек са 120 тыс., вышадшых з Таруціна. «Галоўная армія, — даносіў фельдмаршал Аляксандру I з Вільні, — прыйшла ў такі стан, што бяссілле яе ў колькасці людзей трэба было ўтойваць не толькі ад ворага,

[90] Цыт. па: там сама. — С. 299.

але і ад саміх чыноўнікаў, у арміі служачых»[91]. Але як бы там ні было — «загінула ўсё нашэсце», як скажа ў сваім вялікім рамане «Вайна і мір» Л. М. Талстой.

Удзельнік вайны палкоўнік М. М. Пятроў успамінаў, як весяліліся ў Тыльзіце палкі яго грэнадзёрскага корпуса, тры дні стаяўшыя бівакамі па абодвух берагах Нёмана. У тым самым Тыльзіце, дзе ў 1807 г. Расія далучылася да кантынентальнай сістэмы пасля беспаспяховых войн з Францыяй у 1805-1807 гг., цяпер рускія салдаты віншавалі перамогу. Тут, пісаў Пятроў, «граф Міларадавіч зрабіў спачатку малебен з гарматнаю, ружэйнаю стральбою і воклічамі войска свайго пры батальённым агні: «Ура! Ура! Ура!» стократна, а потым даў абед, і вечарам быў на дарскі рахунак усім генералам, штаб- і обер-афіцэрам і ўсяму гарадавому знатнаму грамадству абодвага пола з ілюмінацыяю двух берагоў і маста р. Немана»[92].

Так, шмат пабачыў Нёман у 1812-1813 гг. Калі М. Глінка вяртаўся ў армію, якая ўдзельнічала ў замежным паходзе, дык не ўтрымаўся, каб не напісаць усхваляваны гімн «рацэ вялікай»: «Сколькім дзіўным, сколькім няслыханым падзеям быў ты сведкаю велічны Нёман! Шырокая і шумлівая твая плынь цяпер, а прыйдзе час, калі сальюцца гады ў стагоддзі і вехі ўцякуць у вечнасць, што і ты, рака вялікая, зробішся малым ручайком і, можа быць, знікнеш у глыбокіх пясках! Але не знікне слава маёй Айчыны...»

...Памяць аб далёкіх падзеях 1812 г. на Немане знайшла сваё адлюстраванне ў мастацкіх вобразах. На барэльефе Аляксандраўскай калоны на Дварцовай плошчы ў Санкт-Пецярбурзе, размешчаны дзве фігуры, якія ўяўляюць Віслу і Нёман. Апошні выяўлены паўляжачым над вытокам атлетычным мужчынай. В. Глінка адзін са сваіх медальёнаў таксама прысвяціў уцёкам Напалеона праз Нёман у 1812 г.

«Ой Нёман цячэ, Неман плыве»

Каго толькі не натхняў Нёман? Хто толькі не прысвяціў яму палымяных слоў вершаў або прозы? Я прапаную ўспомніць толькі літаратараў XIX — пачатку XX ст. Кожны з іх мог бы падпісацца пад словамі А. Міцкевіча «Да Немана»:

Нёман, прытулак мой хатні! Празрыстай вадою
Ты абмываў мне калісьці маломy далоні,
Плыў па табе я, пакінуўшы родныя гоні,
У землях далёкіх шукаць свайму сэрцу спакою.

---

[91] Цыт. па: там сама. — С. 304.
[92] Гл.: 1812 год. Воспоминания воинов русской армии. — М., 1991. — С. 296.

Нёман, рака мая! Вечна імклівыя хвалі!
Дзе тое шчасце? Лепшыя нашы намеры?
Шчырасць дзяцінства, поўная радаснай веры?
Узлёт маладосці арліны ў прыгожыя далі?...

«Над Нёманам» называецца найбольш буйны твор Элізы Ажэшкі. Падзеі яго адбываюцца ў Прынёманскіх мясцінах: Багатырэвічах, Корчыне. І Нёман, яго навакольныя лугі, бары ў рамане не просты фон, праз іх пісьменніца падае лірычныя і пераломныя моманты ў настроі і лёсе дарагіх для яе герояў. Вось першае з'яўленне прыгажуні-ракі (пераклад мой): «З аднаго боку гарызонта цягнуліся невялікія ўзгоркі, на якіх цямнелі хвойныя і ліставыя лясы, з другога — як бы вырастаючы з зелені лугоў, пясчанай сцяной падымаўся высокі бераг Нёмана. Перасякаючы блакітны купал неба цёмнай паласой пакрываючага яго дрымучага бору, ён магутнай дугою агібаў шырокую і гладкую раўніну, на якой толькі дзе-нідзе віднеліся каравыя ствалы дзікай грушы, старыя, крывыя вербы і адзінокія таполі. У гэты дзень залітая сонцам пясчаная сцяна з праслойкай чырвонага мергеля, здавалася залатым абручом, перавязаным алаю стужкаю».

Вясенні перад паводкай Нёман апісвае Максім Багдановіч:

І над птушыны крык і гоман
Даўшы хвалям вольны ход
Прыпадыме бацька Нёман
На хрыбце магутны лёд.
Зазвіняць жалобна крыгі
і бурлівая вада
Снег, размокшы ў час адлігі
Змые з луга без сядла.
Дык разлійся-жа раздольна
У чыстым полі і гаю
І красой паводкі водьнай
Душу выпрастай маю!

У 1861 г. у Вільні выйшла кніжка Уладзіслава Сыракомлі «Нёман ад вытокаў да вусця». Аўтар лічыць, што «адна з самых вялікіх геркулесавых жылаў нашай Літвы — гэта рака Нёман». Сыракомля імкнуўся напісаць пра яго так, як гэта зрабіў пра Вілію граф Канстанцін Тышкевіч, які «здолеў улавіць і выкласці на паперы і рух паветра, і гульню хваль, напевы і говар з берагоў, народныя паданні». Сыракомля хацеў даць цэласны вобраз Нёмана, звяртаючы ўвагу на ўсялякія падрабязнасці: глыбіню вод, вышыню ўзгоркаў, ручаі і прыстані, прыбярэжныя гарады і вёскі, мясцовыя замкі, курганы,

этнаграфію прынёманскага насельніцтва, яго сельскагаспадарчыя і прамысловыя заняцці.

Сыракомля выкарыстаў пры напісанні кнігі ўспаміны літоўскага падарожніка з Коўна да Краляўца на віціне. Шкадаваў, што хворы і сам не можа здзейсніць падарожжа. А вось Францішак Багушэвіч, маючы 57 год, з групай інтэлігентаў-віленчукоў у ліпені 1897 г. прыняў удзел у падарожжы па Неману і Віліі:

Сабраўшыся на тры чоўна
Вяславалі мы да Коўна.
Праз тры дні і праз тры ночы
Дождж мачыў, а вецер у вочы!
Усе нашы панічыкі
Зрабіліся, як бічыкі:
На далоньках мазолікі
Чырванелі, як волікі...

Якуб Колас у трылогіі «На ростанях» таксама не прамінуў Нёман і яго прыбярэжныя лясы і лугі: «Срэбнаю стужкаю вывіваўся Нёман, то падыходзячы пад самы лес, падразаючы карэнне дрэвам, то бягучы сярэдзінаю лугу, то падступаючы да поля, апяразваючы бліскучым жывым паскам яго пясчаныя схілы. Сям-там па лугавых грудах раскідаліся бародкі-кудзеркі астраўкоў, дзе буяў малады, сакавіты дубняк, кусты арэшніку, брызгліны, чаромхі і крушыны, а самая понізь засцілалася мяккаю лугавою канапелькаю, што зацвітае летам такімі прыгожымі сіненькімі кветкамі...»

Прынёманскія песні збіраў Ян Чачот. У 1837 г. ён выдаў у Вільні «Сялянскія песні з-над Нёмана. У двух частках». Вось урывак адной з іх:

Ой, не шуміце лугі;
Не задавайце тугі;
Бо я і так тугу маю,
Што мілога не прычакаю.
Эй, пайшоў мілы за лес,
Чорны очкі занёс,
Усе жартанькі забраў,
Тугу сэрданьку задаў.

У 1844 г. Чачот выдае «Сялянскія песні з-над Немана і Дзвіны, з далучэннем іх арыгіналаў на славяна-крывіцкай мове». У зборніку было 10 песень з-над Немана, сабраных у Навагрудскім павеце Шчорсаўскай воласці. У 1846 г. выходзіць наступная кніга «Сялянскія песні з-над Немана і Дзвіны, некаторыя прыказкі і ідыёмы на славяна-крывіцкай мове, з учынёнымі над ёй назіраннямі». 50 песень з-над Немана былі сабраны ў Стоках, Беліцы, Навагрудку, Шчорсах,

Прасліцку, Лаўрышаве, Еленках. Чачот у прадмове напісаў: «Як бы я быў шчаслівы, калі б гэтыя песні былі скарыстаны ў нас на святкаванні дажынак, Купалы і павялічылі тую ўзаемную прыхільнасць пана і селяніна, ад якой так многа залежыць!»[93]. А ў адной з песень гэтага зборніка як раз і пяецца:

Да ў нашага пана
Да не добрая слава:
Па месяцу жыта жалі
Па зорам копы клалі
Цёмна ў полі, цёмна,
Бадай таму цямней было,
Хто да хаты не пушчае,
Да на полю нас трымае.
Да мы позна з поля ідзем,
Да прыганятага клянём.

Нёман-бацька ўваходзіў у лёс на ўсё жыццё. Ён утаясабліваўся з Радзімаю і ўспамінаўся, дзе б чалавек ні знаходзіўся. Багдановіч у «Эміграцкай песні» пісаў:

І на вуліцы пад грукат, пад гоман,
Дзе натоўп закруціўся рухавы,
Нам маячыцца вёсачка, Нёман
І агні партавыя Лібавы.

І Міцкевіч у «Пане Тадэвушы» просіць «заступніцу прачыстую над намі» вярнуць яго з выгнання:

З'яві свой цуд, каб зноў сустрэцца з родным краем,
Дазволь душы маёй, ахопленай адчаем,
Пераляцець туды, дзе поясам блакіту
Над Нёманам лясныя ўзгоркі апавіты...

А чаму так хацелася вярнуцца ў гэты Прынёманскі край, да Немана? Паэтка Адэля з Устроні, пад Лідай, адказала на гэта пытанне вельмі трапна. У вершы «Мачаха» Нямночак гаворыць дзяўчыне, якая баіцца, што віхор утопіць яе каханага:

О! Не знала, то пазнае
Яку ваду Нёман мае!
Я ж у лужах купаюся,
Па ніўках расцілаюся,
З віцінамі праплываю
Літоўскае сэрца маю!...

---

[93] И. Чачот Ян. Гіавагрудскі аамак. Творы. — Мн., 1989. — С. 172.

«Да Кралеўца, Клайпеды!»

У сярэдзіне XVI ст. вядомы паэт-лацініст Шротор выдаў у Кракаве «Песні пра Нёман». Ён адзначаў ролю ракі як важнага воднага і гандлёвага шляхоў: «Што мае Захад і Ўсход добрых купцоў, якія плённа служаць дзяржаве, вялікая заслуга ў гэтым свабоднага і раскутага Немана»[94]. Пра гандаль па рацэ пісаў і Вінцэсь Каратынскі:

Сонца хмары адправіць,
І вясна загаварыць
З Нёманам мовай ласкавай —
Будзе неба і мір.
Мы там шляхам-пуцінай
Паплывем на віціне.
Нам змагацца з вадою,
Не спалохаюць беды!
Хто адважны — стралою.
Да Кралеўца, Клайпеды!
Як пра ластавак весніх
Пра віціны нам песняць.

У вершы нагадваецца віціна, але хадзілі па Нёману і іншыя судны: байдакі, баркі (або паўбайдакі, паўбаркі), баты або галеры, вялікія лодкі, а таксама звычайныя плыты, прыстасаваныя для перавозкі розных грузаў. Віціна — судна, якое мае даўжыню 17-20 сажаняў, шырынёй — 2,5-4 фута, заглыбленнем — да 1,5 аршына, грузападымальнасцю — да 9 тыс. пудоў[95]. Хуткасць па цячэнню 50 вёрст у суткі, супраць — 25 в. Патрабавалася да 15 рабочых і лоцман. Каштавала віціна ад 600 да 1000 руб. серабром. Служыла 6-10 гадоў. Барка мела даўжыню 14-16 сажаняў, шырыню — 17 футаў, заглыбленне — 12-16 вяршкоў, грузападымальнасць — да 2 тыс. п. Для суправаджэння патрабавалася 8-10 рабочых. Паўбарка — гэта тое ж самае, што і барка, толькі ў меншых памерах. Вялікая барка каштуе каля 400 руб. серабром, малая — каля 250 р. е., але да гэтых сум трэба дадаць кошт снасцей і рагож: адпаведна 60-70 р. е., або 80-100 р. с. Хуткасць баркі — да 80 в. у дзень. Бат меў заглыбленне 24-30 вяршкоў і грузападымальнасць да 4 тыс. п. На вялікіх лодках перавозілі да 200 пудоў грузаў. Плыты мелі барты і былі падобны на скрынку — на іх

---

94 Цыт. па: Кісялёў У. М. Указ. сач. — С. 16.

95 Сажань = 2,13 м; фунт = 30,48 см; аршын = 0,71 м; пуд = 16,3 кг; вяр- ста = 1,06 км; вяршок = 4,4 см.

перавозілі пяньку, ільняное семя і іншыя грузы да 4-5 тыс. п. Для гэтага патрабавалася да 15 рабочых[96].

Усе судны былі пласкадоннымі і прыводзіліся ў рух наступнымі спосабамі: ялінамі, калі на малой вадзе рабочы адпіхваўся ад дна шастом; завозам — гэта калі ўперад завозілі якар цяжкасцю да 20 пудоў, а потым выбіралі канатамі; бічавы з дапамогаю бічэўніка з коньмі; парусны. Будавалі баркі ў асноўным на Агінскім канале, віціны і баты — у м. Новы Свержань і ў Стаўбцах, лодкі — па Агінскаму каналу, рэкам Шчара і Нёман, плыты — у розных месцах па Неману, яго прытокам, каналам. Напрыклад, у 1854 г. на Немане былі пабудаваны 7 віцін і 7 батаў.

У першай палове XIX ст. пачало нараджацца параходства. У Беларусі першы параход з'явіўся ў 1823 г., па Неману ў 1855-1859 гг. плаваў «Нерис», у 1856-1869 гг. — «Кейстут», у 1856 г. — «Вильно». Усе яны належалі купцу Нейману і графу Тызенгаўзу. У 1855, 1859, 1860 гадах па Неману хадзіў параход купца Фельша «Тыльзіт».

Суднаходства на Немане пачыналася пасля крыгалому, які звычайна быў у канцы сакавіка - пачатку красавіка, і працягвалася да позняй восені. Рака была суднаходнай ад м. Новы Свержань Мінскай губерні на працягу 730 вёрст. Прытокі Немана - Шчара была суднаходнай, а Вілія - сплаўной. Каб палепшыць суднаходнасць рэк, іх прыходзілася ачышчаць ад меляў, каменняў, карчоў і парогаў, будаваць шлюзы і каналы. Напрыклад, у 1846 г. калежскі асэсар Юр'еў падаў праект расчысткі Немана ад прыстані Стаўбцы да Коўна і Шчары ад апошняга шлюза Агінскага канала да ўпадзення ў р. Нёман. Асабліва Юр'еў звяртаў увагу на небяспечныя месцы, якія знаходзіліся бліз фальварка Дзярэжын Лідскага павета Віленскай губ., Мастоў, Гродна (насупраць Каложы) Гродзенскага павета. На жаль, мне невядома, ці быў прыняты гэты праект[97].

Аблягчэнню транспартыроўкі грузаў спрыялі каналы. Прыток Немана Шчара была злучана з прытокам Прыпяці Ясельдай Агінскім каналам. Будаўніцтва яго пачалося ў 1765 г. на сродкі М.-К. Агінскага паводле ідэі пінскага купца М. Бутрымовіча, а закончылася ў 1804 г. Даўжыня канала раўнялася 54 км. Штогод па яму праходзіла да 50 суднаў і да 2.300 плытоў. У 1824-1838 гг. будаваўся Аўгустоўскі канал,

---

[96] Аб суднах гл.: Военно-статистическое обозрение Российской империи. Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы, ф. 380, воп. 3, сп. 1725, л. 4, 4 аб, 6 аб.

[97] Бобровский 11. Материалы для географии и статистики России... Гродненская губерния. — СПб., 1863. — Ч. 2. — С. 374, 378.

які злучыў рэкі Нёман і Віслу. Даўжыня яго каля 102 км, з іх 22 км на тэрыторыі Гродзеншчыны.

Па Неману ў межах Гродзенскай губерні знаходзілася пяць суднавых дыстанцый: Дабрамысльская, Слонімская, Брэсцкая, Мастоўская, Гродзенская. Самая буйная прыстань знаходзілася ў губернскім цэнтры, г. Гродне. Гэтаму спрыяў геаграфічны стан горада — ён быў недалёка ад межаў заходнееўрапейскіх краін і апошнім портам на Немане. Сярэднія штогадовыя грузазвароты па Неману і Шчары былі наступныя: у 1802-1842 гг. кошт тавараў, якія грузіліся, раўняўся 650 тыс. руб., у 1843-1860 гг. - 564 тыс. руб., кошт тавараў, якія разгружаліся, дасягнуў у гэтыя гады адпаведна 320 і 422 тыс. руб.

Што ж везлі праз суднавыя дыстанцыі Гродзенскай губ.? На гэта пытанне дапамагаюць адказадь матэрыялы зборніка «Виды внутреннего судоходства» (СПб., 1841). У ім грузы иадзяляюцца на чатыры групы: I — «К жизненным припасам принадлежащих», II — «К рукоделиям и фабрикам служащих», III — «Обработанных», IV — «Разных». Сярод I групы тавараў, якія вывозіліся з губерні, можна назваць зерневы хлеб (жыта, пшаніца, ячмень, авёс, гарох, грэчка), муку, крупы, мёд, рыбу, соль, табак. У II групу тавараў уваходзілі ільняное і канаплянае семя, пакля, пенька, смала, дзёгаць, воск, паташ, скура, косць, драўняная кара. У III групе знаходзіліся рагожы, канаты, паруснае палатно, мыла, шкло, вяроўка, гліняны і шкляны посуд, у IV групе — лес (карабельны, бярвенні, брусы, дошкі, дранка, дровы), вапна, цэгла, каменні, вугаль.

Прывозіліся ў губерню наступныя тавары: з I групы — соль, хлеб, селядцы, рыба, вінаградныя віны, свежыя і сушаныя фрукты; з II — жалеза, хімічныя тавары, драўлянае масла, пража, сала, алебастр, дрэва для мэблі; з III — вырабы з чыгуну, жалеза, упакованная папера, шкло; з IV — розныя лясныя матэрыялы, цэгла, вапна. Зразумела, што значная частка названых тавараў ішла праз Гродзеншчыну транзітам у суседнія губерні або за мяжу.

***

У завяршэнне свайго невялікага цыкла нра Нёман я хачу падтрымаць ідэю У. М. Кісялёва. У кніжцы «Пуцявінамі Наднямоння» ён прапанаваў стварыць музей ракі Нёман, які павінен мець дзве часткі: на вытоках ракі (хутчэй за ўсё на сядзібе Я. Наркевіча-Ёдкі) і ў Гродне. Мне здаецца, што гэта слушная прапанова. У размове з А. В. Хамко, начальнікам упраўлення па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры Гродзенскага гарвыканкама, я пазнаёміўся з праектам стварэння «Старога горада» — гандлёва-культурнага цэнтра Гродна. У культурнай частцы плануюцца выставачныя залы, музеі,

установи для адпачынку і г. д. Чаму ж не з'явіцца сярод іх і невялічкаму музею гісторыі ракі Нёман у Прынямонні?!

## ЧАСТКА 2. ПОСТАЦІ

### “ПОЙДЗЕМ ЖЫВА ДА КАСЦЮШКІ”

Доўгі час паўстанне 1794 г. лічылі польскім, літоўскім, але толькі не беларускім. А паколькі яно чужое, дык і не ставілі помнікаў паўстанцам, а, нават, наадварот — ушаноўвалі А. В. Суворава і «сувораўцаў», якія за пралітую кроў беларускую атрымалі беларускія ж маёнткі і прыгонных. Гэта пра іх расказвалі, а часам і цяпер расказваюць, матэрыялы музейных экспазіцый. І да сённяшняга дня не стаяць памятныя знакі на месцах паўстанцкіх баёў.

Нашых нацыянальных герояў літаральна ўтаплівалі ў бяспамяцтва, але Віленскія званы 1794 г. абуджаюць гістарычную памяць. У той час паўстанцы спявалі:

Возьмем косы ды янчаркі
Пойдзем гордыя гнуць каркі.
Няхай Москаль уступае,
Няхай Беларусаў знае.

...24 красавіка 1794 г. Ратушавы пляц у Вільні. Абвяшчаецца «Акт паўстання Народу Вялікага княства Літоўскага». Потым кіраўніцтва і 2328 чалавек прымаюць прысягу: «Мы прысягаем Пану Богу Усемагутнаму ў Тройды Святой Адзінаму ў тым, што Бацькаўшчыне жыццём і маёнткам найадданей служыць будзем, уладам, Актам паўстання Народу прызначаным, найвярней паслушнымі будзем і тое ўсё, што ад нас залежыць будзе да моды абароны гэтага. Акту Паўстання Народу, аддана і пачціва выканаць не замарудзім, і што нам ад улады якой-небудзь гэтым Актам утворанай, даручаным стане, не толькі сакрэту захаваем, але ва ўсім паўстанні нашым ніколі асабісты інтарэс, але агульнае дабро краю медь будзем, так нам, Пане Божа, дапамажы і бязвінная пакута Сына Яго»[98].

На абарону «вольнасці, роўнасці, незалежнасці» з красавіка да верасня 1794 г. падняліся на землях Беларусі звыш 30 тыс. чалавек. Гэта былі жаўнеры рэгулярнага войска ВКЛ (10-11 тыс. чал.), міліцыя і касінеры. Прадстаўнікі шляхецтва, сялянства, мяшчанства розных канфесій. Пад Касцюшкавы харугвы ўсталі гарадзенцы, берасцейцы, слонімцы, навагарадзенцы, кабрынчане, лідчане, ашмянцы. Нашы землякі аказалі супраціўленне рускім войскам пад вёскамі Паляны на

---

[98] Гл. пераклад У. Емяльянчыка ў яго кнізе "Паланез для касінераў" (Мн., 1994). — С. 51.

Ашмяншчыне і Солы на Смаргоншчыне, каля Крупчыцкага манастыра пад Кобрынам і пад Бярэсдем (в. Коршын і Добрын).

Ну жа хлопцы, ну жа жыва,
Цяпер маем для нас жніва
Господзь бог нам у помац стаець,
Нашу славу нам вяртаець.
Ну жа жыва вы, сотнікі,
Вы малойцы-дзесятнікі
Дамо сабе рукі ўзаем
Бацькаўшчыну адзыскаем...

Такія словы былі ў «Песні беларускіх жаўнераў», але адзыскаць Бацькаўшчыну — гэта значыць адрадзіць самастойнае ВКЛ у складзе вольнай і незалежнай Рэчы Паспалітай — не ўдалося. На алтар волі былі пакладзены тысячы чалавечых жыццяў. Пра ўсіх расказачь няма магчымасці, таму наш нарыс пра ўраджэнцаў Гродзеншчыны - удзельнікаў паўстання і тых паўстанцаў, хто прымаў удзел у дзеяннях на тэрыторыі Гродзеншчыны. Звесткі аб кожным будуць давацца ў алфавітным парадку і будуць абмежаваны падзеямі паўстання.

**Агінскі Міхал Клеафас** (7.10.1765, Гузаў пад Варшавай - 15.10.1833, Фларэнцыя) — нашчадак старажытнага княскага роду беларускага паходжання. У 1788-1792 гг. быў дэпутатам Чатырохгадовага сейма, у 1793 г. — Гродзенскага сейма, падскарбіем вялікім літоўскім (1793-1794 гг.). Падтрымліваў Канстытуцыю 3 мая 1791 г. Паведамленне аб паўстанні атрымаў 30 сакавіка на Кантрактах у Навагрудку.

Пасля павешання гетмана С. Касакоўскага вырашыў збегчы з Літвы ў адзін са сваіх маёнткаў пад Варшавай. Быў затрыманы шляхціцам Гушчай і апраўдваўся спачатку ў Гродне, а потым у Вільні. За ўласны кошт сфарміраваў і экіпіраваў 480-асабовы атрад егераў. Сто тысяч злотых ахвяраваў на ўзбраенне паўстанцкага палка К. Нагурскага. Міхал Клеафас быў сябрам Літоўскай Рады — Часовага ўрада ВКЛ у 1794 г. Прадставіў Я. Ясінскаму план «уварвання на Беларусь», гэта значыць на Міншчыну і Магшёўшчыну, якія былі ў той час у складзе Расійскай імперыі. У сваіх успамінах Агінскі пісаў: «Калі б мне ўдалося беспарашкодна дабрацца туды, я наважыўся б глыбей уварвацца на Белую Русь, каб там узняць на паўстанне 12 тыс. сялян, якія знаходзіліся ва ўладаннях маёй сям'і і дадь ім свабоду». 12-16 чэрвеня разведвальна-дыверсійны рэйд Агінскага адбыўся сіламі 500-асабовага аддзела: 300 стральцоў на чале з не маючым ваеннага вопыту Агінскім і 200 чалавек кавалерыі пад кіраўніцтвам маёра С. Корсака. Аддзел разбіў рускія часці пад Валожынам і захапіў тут

значныя запасы амуніцыі і харчавання. У Іванцы Агінскі абвясціў зварот да жыхароў Мінскага ваяводства: «... Скіньце з сябе ганебнае гэта ярмо, якое вас з непадуладных палякаў (тут маецца на ўвазе не нацыянальнасць, а падданасць Рэчы Паспалітай — В. Ш.) робіць няшчаснымі нявольнікамі тырана, возьміце ў рукі вашыя зброю, якого продкі вашыя так умела маглі ўтаймоўваць ворагаў айчыны, далучайцеся з вашымі сіламі да сілаў вашых братоў, як і добрыя сэрцы вашыя сапраўды з імі злучаныя». 16 чэрвеня пад Вішнёва царскія войскі разбілі аддзел Агінскага і С. Корсака, астаткі якога (150 чал. кавалерыі і частка стральцоў) дабраліся ў Крэва, дзе быў Я. Ясінскі.

Пасля рэйда Агінскі быў накіраваны да Т. Касцюшкі, які ўхваліў партызанскія метады і адзначыў, што ён «заслужыў сабе ўдзячнасць ад народу». 1-13 жніўня Агінскі здзейсніў другі рэйд — на гэты раз праз Браслаўшчыну на Дынабург (цяпер Даўгаўпілс). Вызваліць горад не ўдалося, а вестка аб захопе расійцамі Вільні прымусіла паўстанцаў адступіць.

Як кампазітар Міхал Клеафас напісаў у час паўстання музыку і тэксты шэрагу маршаў і баявых песень, якія, па яго словах, узбуджалі храбрасць, энергію і энтузіязм маіх таварышаў па зброі». Пасля задушэння паўстання жыў у эміграцыі (Вена, Венецыя, Парыж). У 1802 г. вярнуўся на бацькаўшчыну і да 1822 г. жыў у Залессі пад Смаргонню. Тут устанавіў вялізны валун з надпісамі па-польску «Ценям Касцюшкі», напісаў свой знакаміты паланэз ля-мінор, які паўстанцы 1830-1831 гадоў назвалі «Развітанне з Радзімай». У 1811 г. прапанаваў Аляксандру І план адраджэння ВКЛ у складзе Расійскай імперыі. У 1823 г. выехаў з сям'ёй у Італію, а ў 1826-1827 гг. выдаў у Парыжы 4 тамы «Мемуараў пра Польшчу і палякаў з 1788 да 1815 г.», дзе ўспамінае між іншым і падзеі 1794 г.[99].

**Боўфал Францішак** 9 мая ў Сакулцы ўзначаліў мясцовых жыхароў і прадстаўнікоў гродзенцаў, якія абвясцілі акт далучэння да паўстання і выбралі свой орган кіравання — Гродзенскую парадкавую

[99] Гл.: Багадзяж М. Міфы і праўда аб кампазітару //Чырвоная змена — 1990 — 13.XI. — С. 4; Беларуская мінуўшчына — 1994 № 1 — С. 17; Дадзіёмава В. Паланез для касінераў //Культура 1994 — № 36 — С. 4; Емяльянчык У. Дыверсійныя рэйды ў паўстанні 1794 года на Беларусі // Весці АН Беларусі. Серыя гуманітар. навук. — 1994 — № 2 — С. 13; Яго ж. Паланез для касінераў. Мн., 1994. — С. 25; Суднік Ст. Постаці на фоне паўстання 1794 года // Гродзенская праўда — 1994 — 14.06 — С. 3; Сяльверстава С. Я. Міхал Клеафас Агінскі // Гродз. праўда — 1993 — 29 чэрвеня — С. 3; Тронет Л. В. Там, дзе гучалі паланезы. Мн., 1990. — С. 6; Юхо Я., Емяльянчык У. «Нарадзіўся я ліцвінам...» — Мн., 1994. — С. 41; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі Т. І. — Мн., 1993. — С. 31—32, 34; Ogiński M. Pamiętniki o Polsce i polakach. T. I. — Poznan, 1873. — S. 321.

камісію. Боўфал стаў яе старшынёю і вызваліў назаўжды ад прыгону сваіх сялян, якія далучыліся да паўстання. 14 верасня ён звярнуўся да Касцюшкі з хадайніцтвам за «нешчаслівых» жыхароў «вольнага мяшчанства Саколкі», за сялян, якія адбываюць усе варты на карысць паўстання, але «нягледзячы на правы свае, да паншчыны выганяюцца». Боўфал прасіў Касцюшку да «паслаблення іх уціску»[100].

**Важынскі Антоні** — падкаморы Ашмянскі, увайшоў у Дэпутацыю Скарбу Публічнага Літоўскай Рады[101].

**Ваўжэцкі Тамаш** (1753, в. Відзы Лаўчынскія, Браслаўскі павет — 5.08.1817, м. Відзы) — харунжы вялікі літоўскі, пасол ад Браслаўскага павета на Чатырохгадовы сейм, прыхільнік і абаронца Канстытуцыі 3 мая 1791 г. У час паўстання быў генералам жмудцкай міліцыі і кіраўнікам вайсковага аддзела ў ВКЛ, а з 29.09. разам з Р. Гедройцам узначальваў адну з «літоўскіх дывізій». Ваўжэцкі стаў сябрам Літоўскай Рады, а са стварэннем Найвышэйшай Нацыянальнай Рады для Польшчы і ВКЛ — радцай ад княства. Ажыццяўляў дыверсійныя рэйды ў Курляндыю. Падчас адступлення прывёў ацалелыя аддзелы з Жамойціі ў Гродна. Пасля бітвы пад Мацяевіцамі, 12 кастрычніка выбраны Найвышэйшай Радай Начальнікам паўстання. Пасля бітвы на Пражскім прадмесці Варшавы з часткай войск адышоў на поўдзень і 16 лістапада быў разбіты пад Радошыцамі. Адмовіўся падпісаць прапаноўваемую Суворавым капітуляцыю і быў узяты ў палон. Да 1796 г. сядзеў у Петрапаўлаўскай крэпасці Пецярбурга. Падчас Каралеўства Польскага быў сенатарам, ваяводай, першым міністрам справядлівасці. Памёр пасля цяжкай хваробы, магіла знаходзіцца ў Відзах, а ў Кафедральным саборы Вільні ёсць памятны знак, які паставіў Тамашу брат Юзаф, генерал расійскіх войск[102].

**Вісліцкі Фёдар** — ігумен супрасльскага манастыра, сябра Гродзенскай парадкавай камісіі, ініцыятар выдання ў супрасльскай уніяцкай друкарні паўстанцкай літаратуры: прамоў, універсалаў і

---

100 Емяльянчык У. Паланез... — С. 128; Саламевіч Я. Хроніка нацыянальна-вызваленчага паўетання 1794 г. у Польшчы, на Беларусі і ў Літве// Роднае слова — 1994 — № 1 — С. 74.

101 Емяльянчык У. Паланез... — С. 54.

102 Там сама. — С. 50, 54, 61, 77, 99; Саламевіч Я. Хроніка нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 г. у Польшчы, на Беларусі і ў Літве// Роднае слова - 1994 - № 1 - С. 75; Юхо Я., Емяльянчык У. Указ. сач. - С. 47; Кулік Я., Сіцько 3. Экспедыцыя// Культура - 1994 - № 10 - С, 7; Ціыдлоўскі К. Аб слядах адной экснедыцыі...// Культура - 1994 - № 14 - С. 8; Toll. S-Ch. Powstanie kościuszkowskie w świetle korespondencji posła szwedzkiego w Warszawę. – W., Kr., 1989. - S. 136.

адозваў Касцюшкі і Найвышэйшай Нацыянальнай Рады ВКЛ (інакш — Літоўскай Рады)[103].

**Вярэйскі Адам** — пісар навагрудскі, быў цесна звязаны са «спіскоўцамі» Вільні, арыштаваны напярэдадні паўстання[104].

**Гарадзенскі Тадэвуш** — шляхціц Ашмянскага павета (Віленскага ваяводства), сабраў войтаў і ўсіх сялян свайго і некаторых суседніх маёнткаў і прымусіў іх прыняць прысягу на вернасць Касцюшцы. Заклікаў усіх узброіцца пікамі і косамі, аддаў свае сродкі на ўзбраенне атрада. Помсціў шляхце, якая супрацоўнічала з рускімі ўладамі, чым нарабіў значную паніку ў павеце. Потым перайшоў мяжу і пайшоў — на падтрымку да Вільні. Ажыццявіў дыверсійны рэйд з Вільні на Паставы, які заняў 20 чэрвеня. Тут абвясціў Віленскі акт паўстання і набраў добраахвотнікаў колькасцю ў 200 чалавек «шляхты і ўзброеных сялян». Узмоцнены накіраваўся ў Полацкае ваяводства, але набліжэнне значных расійскіх сіл перапыніла рэйд. У жніўні эскадрон Гарадзенскага прымаў удзел у другім рэйдзе Агінскага. Вызначыўся тым, што ўварваўся на ўскраіну Дзвінска (цяпер Даўгаўпілс), але пасля кароткага бою быў вымушаны адысці. Па дарозе захапіў у палон двух расійскіх афіцэраў з сакрэтным пасланнем галоўнакамандуючаму М. Рапніну і пераправіў яго Касцюшцы. Пасля паразы паўстання Гарадзенскі атрымаў у Варшаве пашпарт, вызваляючы ад кары, але Рапнін даў загад на яго арышт. Згодна з праектам Смаленскай следчай камісіі прыгавораны да смяротнай кары. Але ці быў ён пакараны? Нейкі палкоўнік Гарадзенскі з Міншчыны сустракаецца на імянінах каменданта г. Іркуцка[105].

**Гарноўскі Юзаф** — падпаручнік артылерыі, масон, сябра «Віленскай змовы» Ясінскага, бліжэйшы яго паплечнік і ад'ютант[106].

**Гарноўскі Я.** (?) — паручнік, у Гродне 30 верасня атрымаў ад Касцюшкі ганаровы пярсцёнак з надпісам «Айчына — абаронцу свайму» за мужную абарону Вільні падчас першай атакі 18-19.07.

**Гедройц Рамуальд** (1750-1824) — былы барскі канфедэрат і генерал Войска Польскага (1792), падрыхтаваў паўстанне ў Шаўлях і

---

[103] Емяльянчык У.«За адну толькі шляхту ваяваць не буду»// Беларуская мінуўшчына - 1994 — № 1 — С. 28.

[104] Емяльянчык У. Паланез... — С. 30.

[105] Там сама. — С. 67, 130, 140, 152; Емяльянчык У. Дыверсійныя рэйды... — С. 14, 15; Кулік Я., Сіцько З. Указ. сач. - С. 7; Janik M. Dzieje polakow na Syberji. - Krakow. 1928. - S. 74.

[106] Емяльянчык У. Паланез... — С. 12, 16, 46; Грыцкевіч А. Паўстанне 1794 г.: перадумовы, ход і вынікі // Бел. гістарычны часопіс. - 1994. — № 1. - С. 40.

быў стваральнікам акта, які прызнаваў паўнамоцтва Літоўскай Рады. Яго аддзел павінен быў з Жамойціі падысці на дапамогу Вільні не пазней раніцы 23 красавіка, але Гедройц спазніўся і артылерыі Тучкова ўдалося ўцячы ў Гродна. Спроба 26 красавіка захапіць яго на марты не ўдалася. Сябра Літоўскай Рады атрымаў званне генералмаёра і з 29 кастрычніка разам з Ваўжэцкім узначаліў адну з «літоўскіх дывізій». У Гродне 30 верасня атрымаў ганаровы пярсцёнак ад Касцюшкі. На абарону Варшавы прывёў дывізію ў колькасці 5 тыс. чалавек. Пасля паразы паўстання эмігрыраваў у Францыю, уваходзіў у Дэпутацыю, якая прадстаўляла «польскіх якабінцаў»[107].

**Грабоўскі Павел** — прадстаўнік вядомага ў ВКЛ пратэстанцкага «дысідэнцкага» роду, масон. Разам з Ф. Сапегай рыхтаваў паўстанне ў Ваўкавыскім старостве, а потым камандаваў аддзелам пад Вільняй. Выказаў у перапісцы з Ясінскім ідэю марша паўстанцкіх атрадаў на Гродна, але ён не адбыўся. У верасні Грабоўскі адвёў свой аддзел з-пад Вільні да Гродна. Загінуў пры абароне Варшавы[108].

**Грабоўскі Стэфан** (24.06.1767, Асташын пад Навагрудкам - 4.06.1847) — сын генерала войск ВКЛ Тамаша Грабоўскага і, відаць, брат вышэйназванага Паўла, бо пра яго таксама гаворыцца, як пра прадстаўніка вядомага ў ВКЛ пратэстанцкага «дэсідэнцкага» роду і сябра масонскай ложы ў Вільні. Крайчы літоўскі ўсёй душою дапамагаў тайнаму таварыству, падтрымліваў ягоныя кантакты ў Польшчы і з эміграцыяй у Дрэздэне. У кампаніі 1792 г. быў падпалкоўнікам, камандзірам 7-га пяхотнага палка і вызначыўся ў баях пад Мірам і Тэрэспалем. 18 красавіка 1794 г. у Смаргоні заклікаў свой полк да выступлення супраць расійцаў, непадпарадкавання здраднікам - братам Касакоўскім. На Рынку была ўзведзена шыбеніца з надпісам «для здраднікаў». Праз два дні Стэфан на чале 800-асобавага атрада і пры 2 гарматах ужо ішоў праз Жупраны і Ашмяны на Вільню. Сваімі рашучымі тут дзеяннямі прымусіў батарэю Тучкова адступіць на Гродна. Кіраваў паўстанцкімі атрадамі ў бітвах пад Нямечынам, Палянамі, Соламі. Ажыццявіў дыверсійны рэйд на тэрыторыю Міншчыны: 15 жніўня перамог рускіх каля Іўя і спаліў масты праз Нёман. Але далейшае разгортванне барацьбы ў Цэнтральнай і Ўсходняй Беларусі было спынена падышоўшым 8-тысячным вайсковым злучэннем рускіх войск. 24 жніўня адбыўся бой аддзела Грабоўскага ў 10 в. ад Мінска на Ракаўскім гасцінцы — паўстанцы вымушаны былі

[107] Емяльянчык У. Паланез... - С. 13,- 48, 50, 74, 135-137.
[108] Там сама. — С. 12, 41, 81, 82, 85, 86, 137; Юхо Я., Емяльянчык У. Указ сач. — С. 47.

павярнуць на Койданава - Пухавічы, а потым на Глуск - Любань - Слуцк. Генерал П. Цыцыянаў перагарадзіў Грабоўскаму шлях і 4 верасня даў бітву пад Любанню, дзе акружыў яго і прымусіў капітуляваць. Грабоўскі папаў у палон і смаленскай следчай камісіяй быў сасланы ў Кастрамскую губерню. Павел І вызваліў яго 29.11.1796 г. або 27.11.1797 г. у Герцагстве Варшаўскім быў сакратаром агульнай Рады міністраў, графам. Зімою 1811/1812 гг. Грабоўскі разам з А. Чартарыйскім распрацоўваў праект аднаўлення ВКЛ. У жніўні 1812 г. Стэфан быў маршалкам Брэсцкага ваяводства, займаўся аднаўленнем войска ВКЛ, у званні генерал-маёра ўзначальваў вайсковы камітэт у Вільні. Пасля амністыі жыў у Пецярбурзе. У 1815 г. стаў дырэктарам ваеннага дэпартамента, у 1818-1825 гг. — статс-сакратар, міністр Каралеўства Польскага, у 1825 г. падтрымаў на Сенацкай плошчы Мікалая І. У 1826-1829 гг. Грабоўскі ў чыне генерала дывізіі ўдзельнічаў у руска-турэцкай вайне. У 1832-1839 гг. — сябра Дзяржаўнай Рады Расійскай імперыі[109].

**Даўкша** — гродзенскі шляхціц, гарачы патрыёт ВКЛ, свядомы рэспубліканец і прыхільнік французскай рэвалюцыі. 16 верасня «Вольная газета Варшаўская» надрукавала пісьмо-зварот ад «грамадзяніна Даўкшы» да «грамадзяніна Коцела» (сябры Літоўскай Рады і памяркоўнага патрыёта): «Калі ёсць такія грамадзяне, што ўцякаюць з Горадні, я паскудна ўцякаць не буду. Калі падасіся, як павінен, да войска, вазьмі мяне з сабою, я аб званнях не амбіцыяную... а месца для таго за Бацькаўшчыну знайду». Далей Даўкша пісаў: «Усё сэрца мае поўнае нянавісці да дэспатаў... Сапраўдны рэспубліканец не патрабуе ніякіх выгад; сухары і трохі саломы пад бок павінны гартаваць яго цела»[110].

**Касцюшка-Сяхновіцкі Андрэй Тадзвуш Банавентура** — (4.02.1746, фальварак Марачоўшчына каля Косава — 15.10.1817, м. Салюр, Швейцарыя) паходзіць са старажытнага брэсцкага шляхецкага роду, вядомага з часоў Вітаўта. Аўтарытэтны біёграф Касцюшкі Т. С. Корзан падкрэсліваў, што ён належаў да «русінаў племені беларусаў». Аб гэтым не аднойчы сведчыў і сам Касцюшка. Напрыклад, у лісце за

---

[109] Саламевіч Я. Указ. сач. - С. 75; Емельянчык У. Дыверсійныя рэйды... - С. 18; Суднік Ог. Указ. сач. – С. 3; Емяльянчык У. Паланез... - С. 12, 41; Крывальцэвіч М. Баронячы сваю волю і годнасць. Паўстанцы 1794 года на Міншчыне// Беларусь - 1994 - № 5. - С. 22; Гужалоўскі А. Войска ВКЛ: апошнія старонкі гісторыі// Бел. гістарычны часопіс. - 1994. - № 1. - С. 52; Военский К. Император Николай I и Польша в 1830 г. - СПб., 1905; Мемуары князя Л. Сапегі. - Петроград, 1915. - С. 90; Ogiński M. Opis. cit. T. IV. - S. 35, 37; Reymont. Wl. Rok 1794. T. II. Nie Desperandum - W„ 1914. - S. 324.

[110] Цыт. па: Емяльянчык У. Паланез... — С. 126.

генерала Ю. Несялоўскага (1790 г.) ён пытаўся: «Кім жа я з'яўляюся? Хіба я не ліцвін, Ваш зямляк?» або ў звароце «Да грамадзян літоўскіх і парадкавых камісій» (2.07.1794): «Хто ж я ёсць, як не ліцвін, зямляк Ваш, Вамі абраны?»

У 1792 г. Касцюшка прыняў удзел у ваенных дзеяннях супраць войск Таргавіцкай канфедэрацыі. Вызначыўся ў баях пад Жаленцамі, Уладзімірам-Валынскім, Дубенкай — за што быў узнагароджаны Залатым крыжам «Віртуці Мілітары» і стаў генерал-лейтэнантам. Калі даведаўся, што кароль Аўгуст IV здрадзіў і далучыўся да канфедэратаў, падаў у адстаўку (30.04) і выехаў у эміграцыю. У пачатку ліпеня 1793 г. прыхільнікі Канстытуцыі 3 мая 1791 г. звярнуліся да Касцюшкі з прапановаю ўзначаліць паўстанне ў Польшчы і Літве. 11 лістапада ён згадзіўся, узяўшы на сябе абавязкх яго «дыктатара» з тытулам «найвышэйшага начальніка». На Рынку Кракава Касцюшка даў прысягу: «Я, Тадэвуш Касцюшка, прысягаю перад Богам, усяму польскаму народу (г. зн. жыхарам Рэчы Паспалітай — В. Ш.), што давераную мне ўладу на ніякі асабісты прыгнет не выкарыстаю, толькі для аховы цэласці межаў, звароту самадзейнасці народу і ўмацаванне сучаснай вольнасці ўжываць буду. Так мне Пан Бог дапамажы і Бязвінная мука Сына Яго».

На пасадзе Начальніка Касцюшка ўвесь час імкнуўся пашырыць сацыяльную базу паўстання, рашуча адмовіўся ад ідэі паўстання, як «выключна вайсковага» — усе жыхары, якія здольныя трымаць зброю, павінны адстайваць «волю, цэласць, незалежнасць». Тадэвуш Касцюшка заявіў: «Толькі за шляхту ваяваць не буду. Жадаю свабоды для ўсяго народа і толькі для яго гатовы ахвяраваць жыццём».

М. К. Агінскі пісаў, што Касцюшка «карыстаўся вялікай пашанай усёй Еўропы, быў гразой для ворага і бажаством для народа і, узвышаны да рангу Начальніка, не ведаў іншага гонару як служыць Айчыне і змагацца за яе, заўсёды сціпла сябе паводзіў..., не насіў ніякіх знакаў вышэйшай улады, хадзіў у сурдуце з простага шэрага сукна і сталаваўся так, як звычайны афіцэр». Упэўнены, што «воля не можа быць абаронена толькі рукамі людзей вольных...», Касцюшка выдаў Паланецкі ўніверсал (7.V.1794 г.), у якім спрабаваў вырашаць сялянскае пытанне. Сяляне — удзельнікі паспалітага рушэння — на час паўстання вызваляліся ад працы на свайго пана, кантаністам паншчына зменшана на адзін дзень у тыдзень.

Незадоўга да смерці Касцюшка склаў тэстамент, у якім былі такія словы: «Глыбока адчуваючы, што прыгонны стан супярэчыць закону прыроды і дабрабыту народаў, я сведчу гэтым, што знішчаю яго цалкам і на вечныя часы ў маім маёнтку Сяхновічы Брэст-Літоўскага

ваяводства як ад уласнага імя, так і ад імя наступных яго ўладальнікаў. Я прызнаю жыхароў вёскі, што належаць да маёнтка, вольнымі грамадзянамі і нічым не абмежаванымі гаспадарамі зямель, якімі яны валодаюць». Але апошняя воля Касцюшкі не была выканана, бо Аляксандр І дазволіў гэта яго пляменнікам[111].

10 кастрычніка ў трагічнай бітве пад Мацяёвіцамі Касцюшка быў моцна паранены і трапіў у палон. З 19 снежня 1794 г. па 27 лістапада 1796 г. сядзеў у Петрапаўлаўскай крэпасці. Потым жыў у эміграцыі. Прах яго знаходзіцца з 1818 г. на Вавелю ў Кракаве. У Гродзенскім фарным касцёле кляштара езуітаў ёсць памятная дошка Касцюшцы. Ён не толькі нацыянальны герой Беларусі, але і Злучаных Штатаў Амерыкі і Польшчы, ганаровы грамадзянін Францыі (1792 г.).

З малавядомых бакоў жыцця Касцюшкі хацеў бы адзначыць яго мастацкі і музыкальны дар. Здольнасці да малюнку праявіў Тадэвуш яшчэ ў кадэцкім корпусе, а потым вучыўся ў Парыжскай акадэміі жывапісу і скульптуры. Ён выдатна іграў на клавіры, яго лічаць аўтарам папулярнага ў свой час Паланэза для голасу і фартапіяна (1792), двух вайсковых маршаў[112].

**Корсак Каспер** — паручнік 2-й літоўскай брыгады, расквартэраванай у Лідскім павеце. У красавіку 1794 г. горача заклікаў усіх прыняць удзел у паўстанні. У час адступлення П. Цыцыянава з Гродна Каспер на чале 130-асабовага атрада сваімі манеўрамі перашкаджаў яму і прымусіў затрымацца на некалькі дзён у дарозе. Па загаду Ясінскага з Іўя перайшоў праз Нёман і сілаю 60-асабовага атрада разбіў невялікі атрад рускіх карабінераў у в. Мікалаева (гэта «за кардонам»), захапіў палоннага і вярнуўся назад[113].

**Корсак Самуэл (Самуль)** — адзін з паслоў ВКЛ на сейме 1773 г., які хацеў сарваць зацвярджэнне падзелу Рэчы Паспалітай. У час паўстання маёр, сябра Літоўскай Рады, вызначаны ў Суд Крымінальны. У дыверсійным рэйдзе Агінскага на Мінск камандаваў дзвюма сотнямі кавалерыстаў. У Гродне 30 верасня атрымаў з рук Касцюшкі ганаровы

---

111 Гл.: БДГА, ф. 1, воп. 1, спр. 893; воп. 12, спр. 123.

112 Там сама. - С. 19, 80, 115; Касцюк М. За волю, роўнасць, незалежнасць // Белар. думка. - 1994. - № 7. - С. 71-74; Дадзіёмава В. Паланез... - С. 4; Ростаў А. "Русін плямені беларусаў"// Белар. мінуўшчына. - 1994. - № 1. - с. 18-20; Дадзіёмава В. Нарадзілася ў асяроддзі Касцюшкі // Маладтва. - 1994. - № 1. - с. 36; Тарасаў К. І. Начальнік паўстання // Тарасаў К. І. Памяць пра легенды. – Мн. 1990. - с. 199; Юхо Я. Емяльянчык У. Указ. сач. - С. 34; Б. С. Клейн. Найдено в архиве. Мн., 1968. - С. 13-16.

113 Емяльянчык У. Паланез... — С. 84-96.

залаты пярсцёнак з надпісам «Айчына — абаронцам сваім». Быў забіты пры абароне Варшавы[114].

**Матакевіч Дамінік і Мушынскі Францішак** — прадстаўнікі Гродзенскага павета ў Літоўскай Радзе.

**Нарбут Дамінік** — вайсковы лідскі, абраны ў Літоўскую Раду, Суд Крымінальны. Быў адным з кіраўнікоў спецыяльнай камісіі (22.05), якая прыводзіла Віленскі акт паўстання ў адпаведнасць з Кракаўскім[115].

**Несялоўскі Ксаверый** (1771, Ляхавічы Навагрудскага ваяводства — 1845) — былы шэф 6-га палка пяхоты войск ВКЛ, удзельнік баёў з Таргавіцкай канфедэрацыяй у 1792 г. пад Брэстам і Кабылянамі. Узнагароджаны Залатым крыжам «Віртуці Мілітары». 30 красавіка 1794 г. далучыўся са сваім палком да паўстання і атрымаў ад Касцюшкі званне генерал-маёра. Вызначыўся ў баі пад Палянамі, каля Ашмян. Пасля паразы паўстання быў арыштаваны, але не пайшоў на кампраміс з Рапнінам, калі той у Гродне прапанаваў яму за дазвол сустрэцца з бацькам прынядь прысягу на вернасць Кацярыне II. Відаць, нейкі час Ксаверый знаходзіўся ў Расіі, у прыватнасці ў Маскве, а потым жыў у эміграцыі. У час вайны 1812 г. у званні брыгаднага генерала быў членам вайсковага камітэта ў Вільні, які фарміраваў войска ВКЛ для напалеонаўскай арміі. Прымаў удзел у паўстанні 1830-1831 гг., за што быў сасланы ў Волагду. На радзіму вярнуўся ў 1837 г. хворы і сляпы[116].

**Несялоўскі Юзэф (Язэп)** — ваявода навагрудскі, бацька Ксаверыя, меў каля 70 гадоў, быў сябрам Літоўскай Рады (абраным у Суд Крымінальны). Рапнін лічыў яго «душою і кіраўніком апошняга літоўскага паўстання». Пасля паразы паўстання Несялоўскі хаваўся ў лясах пад Гродна, але быў злоўлены і жыў пад наглядам у Вільні. Рапнін прымусіў старога чалавека напісаць прашэнне Кацярыне II аб памілаванні і гатоўнасці прыняць прысягу[117].

**Нямцэвіч Юльян Урсын** (16.02.1758, маёнтак Скокі Брэсцкага павета — 21.05.1841, Парыж) вучыўся ў Брэсцкай калегіі езуітаў і ў Варшаўскім кадэцкім корпусе, пасля якога быў асабістым ад'ютантам князя А. Чартарыйскага. У 1788-1792 гг. з'яўляўся інфлянцкім паслом

---

114 Емяльянчык У. Паланез... - С. 50, 53, 97, 136, 137: Юхо Я., Емяльянчык У. Указ. сач. - С. 11.

115 Емяльянчык У. Паланез... - С. 76.

116 Гужалоўскі А. Указ. сач. - С. 51-52; Janik M. Dzieje polakow na Syberji. - Krakow, 1928. - S. 76.

117 Емяльянчык У. Паланез... - С. 53, 141.

на Чатырохгадовым сейме. Выступаў супраць магнацкага самадурства і вольнай элекцыі, за прадстаўніцтва ў сейме мяшчан, за суровае пакаранне здраднікаў Радзімы. Нямцэвіч выказваўся ў абарону сялян і быў супраць прыгнёту, гарачым прыхільнікам рэформ, адным з аўтараў майскай Канстытуцыі 1791 г. Са студзеня 1791 па красавік 1792 г. займаў пасаду рэдактара «Газеты Народнай і Агульнай» — першай палітычнай газеты ў Рэчы Паспалітай, органе патрыётаў, Нямцэвіч выступіў у ёй як аўтар палітычных памфлетаў супраць таргавічан. Праславіўся вершаванымі байкамі, палітычнай камедыяй «Вяртанне пасла» (1790).

У Саксоніі Нямцэвіч пазнаёміўся з Касцюшкай, а калі пачалося паўстанне 1794 г. стаў яго ад'ютантам і кіраўніком канцылярыі (ад бітвы пад Шчакоцінам да Мацяёвід). Быў сааўтарам многіх вызванняў, адозваў, маніфестаў і г. д., вышадшых у час паўстання. 30 верасня знаходзіўся ў Гродна падчас інспекцыі войск разам з Касцюшкай. З ім жа ён быў паранены і ўзяты ў палон пасля бітвы 10 кастрычніка пад Мацяёвіцамі. Два гады прасядзеў у Петрапаўлаўскай крэпасці, дзе дарэмна час не губляў — напісаў каля 20 казак, некалькі патрыятычных элегій. Суправаджаў хворага Касцюшку ў Амерыку.

З 1807 г. вярнуўся на радзіму, стаў сакратаром Сената і сябрам Эдукацыйнай камісіі. У 1810-1813 гг. — першы прэзідэнт Урадавай дырэкцыі Народнага тэатра. У 1816 г. друкуе свае «Гістарычныя песні». Нямцэвіч, нягледзячы на свае 70 год, прыняў актыўны ўдзел у паўстанні 1830-1831 гг.: уваходзіў у склад Народнага ўрада, быў рэдактарам шэрагу палітычных актаў (напрыклад, аб дэтранізацыі Мікалая I). 22 ліпеня 1831 г. выехаў з дыпламатычнай місіяй у Лондан. Пасля паразы паўстання застаўся за мяжой. З 1833 г. жыў у Парыжы, быў звязаны з дзеячамі патрыятычнага руху («Гатэль Ламберт»). Пасля смерці Нямцэвіча былі апублікаваны яго «Дзённік маіх часоў» (1848) і «Гістарычныя падарожжы на польскіх землях, якія адбыліся ад 1811 г.» (1858)[118].

**Патоцкі Станіслаў** (1778 або 1776, м. Рось — 29.XI.1830) далучыўся да Касцюшкі яшчэ зусім маладым, але ў 1794 г. ужо меў званне капітана. Аб яго дзеянні ў паўстанні нічога невядома, а весь аб далейшым лёсе нейкія факты ёсць. У часы княства Варшаўскага быў ад'ютантам князя Ю. Панятоўскага. Вызначыўся ў кампаніі 1809 г. у

---

[118] Там сама. — С. 135; Literatura Polska. Przewodnik encyklopedyczny. T. II. — W., 1985. — S. 23—25; Sulima M„ Kupcowa W. Nie ciezarem, podpora mi staniesz // Znad Niemna — 1994 — 31 pazd. 6 listopada — S. 6; Клейн Б. С. Взгляд из прошлого. Мн., 1989. — С. 3-27.

бітвах пад Замосцем і Сандамірам. У 1812 г. ваяваў на баку французаў, быў генералам і ўзначальваў брыгаду польскіх войск, удзельнічаў у Барадзінскай бітве. У 1828 г. Патоцкі камандаваў пяхотай Каралеўства Польскага. Прыняў удзел у паўстанні 1830 г. і быў забіты расійцамі[119].

**Рушчыц Казімір** — генерал-маёр, кіраўнік Кобрынскай павятовай міліцыі (каля 400 чал.), якая ўлілася ў корпус К. Серакоўскага і прыняла ўдзел у пераможнай бітве 2 жніўня пад Слонімам. Аддзел Рушчыца быў у Кобрыне, калі яго атакаваў Сувораў, 15 верасня пацярпеў паражэнне.

**Сапега Казімір-Нестар** (1750—1797, Вена) — граф, вялікі магістр масонаў ВКЛ, маршалак літоўскай канфедэрацыі на Чатырохгадовым сейме, у якім займаў актыўную патрыятычную пазіцыю. 9 мая 1794 г. у Врэсце пад старшынствам Сапегі адбыўся сход, які абвясціў далучэнне Брэсцкага ваяводства да паўстання[120].

**Сапега Францішак** (1772-1829) — генерал артылерыі літоўскай (1793), які ў красавіку 1794 г. узначаліў літоўскае войска (каля 3 тыс. чал.), сабраўшаеся ў Бельску, і далучыўся да паўстання згодна Кракаўскаму акту. Таму нячынна падпарадкоўваўся Ясінскаму, сапернічаў з ім за пост галоўнакамандуючага войск ВКЛ. У маі сарваў план паходу на Гродна, бо з Бельска пайшоў на Слонім — гэта дазволіла Цыцыянаву адысці ад Гродна і выратавацца ад акружэння. З канца мая Сапега, спаслаўшыся на хваробу, пакінуў камандаванне і фактычна адышоў ад удзелу ў паўстанні[121].

**Серакоўскі Караль** (1750-1817) — палкоўнік, шэф літоўска-беларускага корпуса інжынераў (1789). 25 мая 1794 г. атрымаў ад Касцюшкі званне генерал-маёра. З пачатку ліпеня пачаў дзейнічаць на Брэстчыне і Гродзеншчыне, у канцы месяца меў ужо болей 4 тыс. чалавек і 26 гармат. 2 жніўня Серакоўскі даў бой пад Слонімам, пасля якога склаліся спрыяльныя ўмовы для далейшага наступления, але ён адышоў спачатку да Ружан, а потым да Бярозы. 17 верасня падярпеў паражэнне ад Суворава пад в. Крупчыцы, а 18-19 верасня — пад Брэстам, каля в. Коршын і Добрын. 10 кастрычніка ў бітве пад Мацяёвіцамі трапіў у палон.

---

[119] Суднік Ст. Указ. сач. — С. 3; Kozłowski E., Wrzosek M. Historia oreza Polskiego. 1795—1939. — W., 1984. — S. 115, 162.
[120] Суднік Ст. Указ. сач. — С. 3; Саламевіч Я. Указ. сач. — С. 74.
[121] Емяльянчык У, Паланез... С. 82—83, 85—86, 91; Buchholtz L. Powstanie kościuszkowskie w świetle korespondencje posła pruskiego w Warszawie. — W„ 1983, — S. 138.

З далейшага лёсу Серакоўскага вядома, што ў 1814 г. ён уваходзіў у Вайсковы камітэт, скліканы ў Парыжы Аляксандрам I для арганізацыі польскага войска. Да смерці быў камандуючым артылерыі і корпуса інжынераў у чыне генерала артылерыі.

**Солтан Станіслаў** -- адзін з кіраўнікоў, падрыхтоўваючых паўстанне ў Навагрудскім ваяводстве. Быў арыштаваны яшчэ да пачатку паўстання, у другой палове сакавіка 1794 г. Знаходзіўся ў Мінску, а потым праходзіў праз Смаленскую следчую камісію.

**Тызенгаўз Ігнаці (Ігнат)** — малады граф, камандзір гвардзейскага пяхотнага палка. 9 красавіка 1794 г. па загаду І. А. Ігельстрома быў арыштаваны ў Гродна. Абвінавачваўся ў прыналежнасці да змовы. Смаленская следчая камісія вызваліла яго ад пакарання, бо Ігнат даў падпіску аб лаяльнасці[122].

**Франкоўскі М.** — прывёў у корпус Серакоўскага каля 500 чалавек добраахвотнікаў з Брэсцкага павета. 2 жніўня ўдзельнічаў у бітве пад Слонімам.

**Ясінскі Язэп** — малодшы брат Якуба Ясінскага, удзельнік бітвы пад Солямі 26 чэрвеня, у якой і загінуў.

**Ясінскі Якуб** (24.07.1761, Венглёва Познанскага ваяводства — 4.11.1794, Варшава) родам з беларускай шляхты, вучыўся як Нямцэвіч і Касцюшка, у Варшаўскім кадэцкім корпусе (1773-1780). У 1790 г. стаў падпалкоўнікам, камендантам створанага корпуса літоўскіх інжынераў у Вільні. У чыне палкоўніка прыняў удзел у ваеннай кампаніі супраць Расіі ў 1792 г. Ваяваў пад Мірам і Брэстам, Зелянцамі і Дубенкай — за гэта ўзнагароджаны Залатым Крыжам «Віртуці Мілітары». 3 мая 1793 г. пачаў актыўную падрыхтоўку да паўстання і стварыў тайную арганізацыю «віленскіх якабінцаў» («Віленская змова»). Ясінскі, відаць, яшчэ ў Варшаве быў масонам, таму пры стварэнні таварыства выкарыстаў вопыт і атрыбутыку масонскіх ложаў. Спіскоўцы збіраліся ў віленскім доме Ясінскага, паступова выпрацоўвалі план будучага паўстання. Якуб вызначаўся радыкальнымі поглядамі, быў палымяным дэмакратам і патрыётам, выказваўся за скасаванне саслоўных размежаванняў і роднасць усіх людзей.

10 жніўня 1793 г. па службовых справах (ён быў сакратарам Літоўскай Вайсковай камісіі) накіраваны ў Гродна. Тут Ясінскі сустракаецца з адным з кіраўнікоў «Варшавскай змовы» палкоўнікам Дзялынскім і генерал-маёрам Я. Ціхоцкім, камендантам варшаўскага гарнізона. Абмяркоўваўся план сумеснага выступлення кароннага і

[122] Там сама. — S. 104; Емяльянчык У. Паланез. — С. 29; Анішчанка Я. Указ. оач. — С. 56.

літоўскага войска. У свой другі прыезд у Гродна ў кастрычніку Ясінскі даведаўся, што тэрмін паўстання перанесены на вясну 1794 г.[123]

12 красавіка 1794 г. віленскія спіскоўцы правялі нараду, на якой абмяркоўвалі сумесныя дзеянні з Варшаваю і зацвердзілі прапанаваны Ясінскім план узброенага вызвалення Вільні. Відаць, хтосьці данёс гетману Касакоўскаму, бо 13 красавіка ён пагражаў Ясінскаму расстрелам «кал і зробіцца ў горадзе ўзбунтаванне». Прыйшлося Якубу выехаць на некаторы час у Шаўлі, адкуль вярнуўся назад 18 красавіка. У ноч з 22 на 23 красавіка правёў апошнюю нараду з афіцэрамі ў прадмесці Вільні. У час паўстання кіраваў ходам бітвы і з'яўляўся на кані ў самых небяспечных месцах, напрыклад, пры нападзе на дом генерала Арсеньева і яго арышце. Ясінскі стаў камендантам Вільні, сябрам Літоўскай Рады. З 3 мая па 14 чэрвеня быў Начальнікам узброеных сіл ВКЛ.

4 мая Ясінскі звярнуўся з адозваю да «ўсіх грамадзян, цывільных і вайсковых» ВКЛ, у якой выклаў асноўныя намеры паўстанцкіх улад, абвясціў, што не складзе зброі, пакуль «зямля літоўская поўнасцю ад іншаземнага салдата не вызваленая будзе» і заклікаў усіх «годных жыхароў зямлі літоўскай» да ўсеагульнага ўзбраення. У пачатку мая Ясінскі выказаў ідэю марша на Гродна, каб адсекчы сілы Цыцыянава. 7 мая ён даў бой пад Палянамі і прымусіў царскія войскі пакінуць подступы да Вільні. За гэта атрымаў ад Касцюшкі званне генерал-лейтэнанта.

14 чэрвеня Ясінскі выдаў «Універсал» да павятовых генерал-маёраў аб тэрміновай арганізацыі дыверсійных 300-асабовых конных атрадаў, якія павінны былі ўвайсці на тэрыторыю Беларусі, захопленую пасля першых двух падзелаў Рэчы Паспалітай. Была падрыхтавана таксама «Інструкцыя для ўваходзячых у кардон расійскі», дзе асноўная ўвага звярталася на прыцягненне да паўстання мясцовага насельніцтва (шляхту і люд). Гаварылася, што з сялянамі трэба абыходзіцца па-людску, а рабаваць маёнткі толькі той шляхты, якая «ўпарта ад сядання на каня ўхіляецца».

26 чэрвеня Ясінскі кіраваў войскам у бітве каля в. Солы. Пасля зацятага пяцігадзіннага бою вымушана адышоў. Быў выкліканы ў Варшаву, дзе вельмі клапаціліся «літоўскім сепаратызмам» і радыкалізмам Ясінскага. Тут Якуб падумаў пра адстаўку, у газеце «Народава Віленска» ад 22 ліпеня, нават, з'явіўся развітальны ліст. Але

---

123 Пра Ясінскага ў Гродне гл.: Реймонт В. Последний сейм Речи Посполитой. - Мн., 1914 г. - С. 42-44, 51-54 і інш.

вырашыў застацца на службе і ў пачатку жніўня атрымаў ад Касцюшкі новае прызначэнне — камандаванне «ўсімі атрадамі добраахвотнікаў і рэгулярнага войска ВКЛ для дзеянняў на мяжы з Польшчай і Прусіяй» (наднарвянскай дывізіі).

29-30 верасня Ясінскі сустрэўся ў Гродне з Касцюшкай і атрымаў ад яго залаты пярсцёнак № 37 з надпісам «Айчына — абаронцу свайму». Ясінскаму было даручана камандаванне адной з літоўскіх дывізій (29.X), адступаючых на Варшаву. Ён апошнім пакінуў Гродна. Кіраваў паўночным крылом фронту абароны Варшавы і загінуў з шабляю ў руцэ.

Ясінскі быў таленавітым літаратарам. З сярэдзіны 1780-х гадоў пісаў байкі, вершы, ідыліі, героіка-камічныя паэмы, у якіх высмейваў духавенства, феадальныя прывілеі. Пісаў таксама палітычныя творы якабінскага напрамку. У Гродне меў сваю друкарню, выдаў у 1793 г. «Do exulantow polskich o stalosci».

***

Адзін з удзельнікаў касцюшкаўскага паўстання Антоні Тызенгаўз у пісьме да прэзідэнта Варшавы Закжэўскага пісаў, што Літва — «Бацькаўшчына і калыска Тадэвуша Касцюшкі» і «народ Літоўскі» будуць рабіць усе разам са сваімі братамі ў Польшчы, каб быдь годнымі свайго земляка». Як бачым, так яно і было!

## МАСТАК З АШМЯНШЧЫНЫ ЮЛІЯН КАРЧЭЎСКІ

З мастацкім жыццём Беларусі, Літвы і Польшчы звязаны лес выхаванца Віленскай школы жывайісу, маладога таленавітага жанрыста і выдатнага каларыста Юліяна (Юльяна) Юзэфавіча Карчэўскага. Яго можна назваць адным з заснавальнікаў беларускага жанравага жывапісу. Карчэўскі сам не жадаў, каб яго творчасць прылічылі да польскай або рускай нацыянальнай культуры і называў сябе «літвінам».

Знайсці матэрыял аб жыцці і творчасці Ю. Карчэўскага было нялёгка, бо пісалі аб ім нямногія і вельмі мала. Кароткія біяграфічныя звесткі ёсць у «Большой энциклопедии», польскіх энцыклапедыях С. Оргельбранда і Гутенберга, у I томе энцыклапедыі «Искусство стран и народов мира», у кнізе Бялінскага пра Віленскі універсітэт, манаграфіі М. С. Кацер і ў артыкуле А. Уса[124]. Больш за ўсіх пісаў пра Ю. Кар-

---

[124] Wielka ilustrowana Encyklopedja powszechna / Wyd. Gutenberga. — W., 1863; Encyklopedja powszechna / Druk Olgelbranda S. — W., 1859—1868; Большая

чэўскага даследчык беларускага мастацтва Л. Н. Дробаў, але, як мы потым заўважым, у яго ёсць недарэчнасці і памылкі, адсутнічае цікавы матэрыял аб жыцці і творчасці мастака, яго бацьках[125].

Юліян нарадзіўся ў снежні 1806 г. Л. Н. Дробаў піша, што месцам нараджэння будучага мастака былі Ашмяны, але гэта не так. У кнізе Ч. Янкоўскага «Powiat Oszmianski...» ёсць цікавыя звесткі пра бацьку — Юзэфа Карчэўскага (1781 — паміж 1850-1855 гг.). Гэта быў вядомы і паважаны людзьмі ашмянскі адвакат, які адзначаўся разумовымі здольнасцямі і бездакорнай справядлівасцю. У 1806 г. ён атрымаў у арэнду ад ашмянскага прабошча (ксяндза) Казяны пад Ашмянамі, дзе, відаць, і нарадзіўся хлопчык. Маці Юліяна ў хуткім часе памерла, бо ў 1812 г. бацька ажаніўся на Тэадоры з Бучынскіх у трэці раз і пасяліўся ў Бянюнах. Займаўся сельскай гаспадаркай, ужываў пладазменную сістэму. У 1829 г. быў абраны ашмянскім межавым суддзёй, а ў 1835 г. — куратарам сельскіх магазінаў (складоў). Юзэф Карчэўскі пакінуў пасля сябе ўспаміны (100 аркушаў). Цікава было б іх пагартаць (як гэта зрабіў Ч. Янкоўскі), бо можна было б знайсці тут шмат падрабязнасцей з прыватнага жыцця Карчэўскіх і іх знаёмых. Але дзе ж знойдзеш рукапіс, які захоўваўся ва Уладзіслава Селанкі ў Багумілішках Лідскага гіавета?[126]

Юліян вучыўся ў Віленскай гімназіі, а потым у Віленскім універсітэце. Бацька-юрыст жадаў, каб сын пайшоў па яго слядах і вывучаў юрыдычныя навукі. У той час ва універсітэце было чатыры факультэты: фізіка-матэматычны, медыцынскі, літаратуры і вольных мастацтваў, маральных і палітычных навук[127]. На апошнім як раз і вучыўся Юліян, а не на філасофскім, як піша ва ўсіх сваіх публікацыях Л. Н. Дробаў. На факультаце маральных і палітычных навук выкладаліся курсы філасофіі, грамадзян- скага, крымінальнага, натуральнага і кананічнага права і іншыя правазнаўчыя навукі. У 1821-1823 гг. расійскае права вёў Даніловіч, грамадзянскае і кананічнае — італьянец

энциклопедия. Т. 10. - СПб., б, г.; Искусство стран и народов мира. Краткая художественная энциклопедия. Т. L — М., 1962; Беларускае выяўленчае мастацтва у мастацтвазнаўчай літаратуры // Беларускае мастацтва. 36. артыкулаў, матэрыялаў. — Мн., 1960; Кацер М. С. Изобразительное искусство Белоруссии дооктябрьскою периода. — Мн, 1969.

[125] Дробов Л. Н. Живопись Белоруссии XIX—нач. XX вв. Мн., 1974; яго ж артыкулы ў выданнях: Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 3. — Мн., 1987; Бел, СЭ. Т. 5, — Мн., 1972; Энцыклапедыя Літаратура і Мастацтва Беларусі. Т. 3. — Мн, 1986. С. 5—6; Искусство народов СССР. Т. 5. — М, 1979.

[126] Jankowski Cz. Opis. cit. — S. 32, 212, 251—252.

[127] Belinski S. Opis. cit. — S. 7; Литва. Краткая энциклопедия. Вильнюс. 1989. — С. 188.

Капеллі, усеагульную гісторыю — І. Лелевель, маральную тэалогію — Хадані, свяшчэннае пісанне - М. Баброўскі. Такія выдатныя настаўнікі, безумоўна, мелі значны ўплыў на выхаванне жыццёвай і грамадзянскай пазіцыі і поглядаў Юліяна Карчэўскага.

Юліян, відаць, з дзяцінства меў талент ды жывапісу і ахвотней пайшоў бы вучыцца на факультэт літаратуры і вольных мастацтваў. Але ў колах тагачаснага дваранства выяўленчае мастацтва было не ў пашане і заняцце ім лічылася другарадным. Вось што пісаў Ю. Крашэўскі: «Шляхта, нават думаю, мела акрамя самой назвы вольнага мастацтва, нейкую агіду ад жывапісу і разьбярства»[128]. Таму Юзэф Карчэўскі хацеў даць сыну юрыдычную прафесію. Але Юліяна цягнула да жывапісу, у вольны час ён амаль кожны дзень прыходзіў у залу на трэцім паверсе універсітацкага будынка, недалёка ад астранамічнай лабараторыі, садзіўся на нізкую скамейку, клаў на калені паперу і маляваў, уважліва слухаючы парады настаўніка — вядомага мастака Яна Рустэма (1761-1835).

Рустэм працаваў у Віленскім універсітэце з 1798 па 1832 г., у 1811 г. стаў прафесарам. Адукацыю атрымаў у Варшаве ў надворнага мастака караля Станіслава Аўгуста Яна Петра Норбліна (1745-1830). Галоўнымі тэмамі твораў настаўніка і вучня былі пейзажы, сцэны жыцця вёскі і мястэчак, гарадскога прадмесця. Рустам стаў майстрам жанравага партрэта і яго творчасць мела ўплыў на Карчэўскага. Ва універсітэце Рустэм меў свой клас малюнка і жывапісу, вучні якога і склалі віленскую мастацкую школу. Ян Рустэм адносіўся да сваіх вучняў па-бацькоўску добразычліва і, як мастак, карыстаўся іх каханнем і даверам. Ён быў стараннымі настаўнікам, нярэдка прыносіў са сваіх асабістых збораў прадметы для малявання, здольных вучняў запрашаў да сябе ў майстэрню (мабыць, і Юліян не раз прыходзіў сюды). Аб папулярнасці Рустэма сярод студэнтаў піша А. Шэмеш: «У класе заўсёды стаяла глыбокая цішыня, таму што прысутнічаў Рустэм, якога ўсе паважалі. Ён любіў таварыства студэнтаў, даваў ім шмат карысных парад»[129]. Школа Рустэма пакінула значны след у гісторыі беларускага выяўленчага мастацтва і падрыхтавала шмат здольных

---

[128] Athenaeum. T. IV. - Wilno, 1844. - S. 170-172.

[129] Szemesz A. Wspomnienia o Damelu // Athenaeum. T. II - Wilno, 1842. - S. 171; Аб Рустаме гл. таксама: Szemesz A. Wspomniene o Szkole malarskej Wielenskie (1826-1829) // Athenaeum. T. 6. - Wilno, 1844. - S. 209-230; Rastawecki E. Słownik malarzow polskich. T. II W, 1851. - S. 145-150; Костина Е. Искусство Белоруссии // Всеобщая история искусств. Т. 5. - М, 1964. - С. 243-245.

жывапісцаў і выкладчыкаў малюнка для беларускіх навучальных устаноў.

Успомнім аднаго з такіх рустэмаўскіх вучняў, Вікенція Ігнатавіча Дмахоўскага (1807-1862) — ураджэнца в. Самішцы (Самцы) Ашмянскага павета. Ён вучыўся на факультэце літаратуры і вольных мастацтваў і сустракаўся са сваім земляком Юліянам Карчэўскім. Амаль што аднагодкі хлопцы маглі сябраваць паміж сабой. Да і цікавіла іх прырода і быт Гродзенскай і Віленскай губерняў. Юліян, як і Рустэм, любіў мастацтва «малых галандцаў», захапляўся творамі Тацыяна, Рафаэля, Тэнерса. Яны ўплывалі на творчасць Карчэўскага. Напрыклад, Давыд Тэнерс-малодшы, які славіўся сцэнамі з жыцця сялян: вясковыя забавы, кірмашы, карчмы. З яго карцінамі Юліян бліжэй пазнаёміцца ў Эрмітажы і Луўры.

Кожныя два гады студэнты Я. Рустэма выстаўлялі свае працы ў зале для публічных пасяджэнняў універсітэта. Першая выстава адбылася 15-30 чэрвеня 1820 г. (ст.ст.). Большасць прац з'яўлялася копіямі твораў вядомых італьянскіх майстроў, але сустракаліся і арыгінальныя. Былі прадстаўлены В. Ваньковіч, К. Рыпінскі, М. Кулеша і іншыя, а вось Ю. Карчэўскага ў спісе ўдзельнікаў няма[130]. Л. Н. Дробаў памыляецца, калі піша, што ён экспанаваў два арыгінальныя творы, якія, па словах А. Шэмеша, «напаміналі жывапіс Тэнерса». Юліяну было ў 1820 г. 14 год і ён не мог быць студентам універсітэта. І тое, што Дробаў адносіць да першай выставы, відаць, на самой справе адбылося праз два гады.

У 1824 г. Карчэўскі скончыў універсітэт і для працягу вучобы паехаў у Пецярбургскі універсітэт. Паспяхова завяршыў юрыдычную адукацыю, стаўшы ў 1826 г. кандыдатам права. Гэта не перашкаджала Юліяну ўдасканальваць сябе ў жывапісе. Шмат гадзін правёў ён у Эрмітажы, дзе вывучаў творы рускага і сусветнага жывапісу. У сталіцы Карчэўскага апякаў «рысавальнік пецярбургскага люду», акадэмік Акадэміі мастацтваў (1809) Аляксандр Восіпавіч Арлоўскі (1777-1832). Гэта чалавек вялікага кругагляду, шырокіх грамадскіх інтарэсаў і вольналюбівых ідэй. Яго ведалі і цанілі Кіпрэнскі, Ф. Талстой, браты Бястужавы, А. Міцкевіч, А. С. Пушкін і іншыя. Цікава адзначыць, што Арлоўскі, таксама як Я. Рустэм, быў вучнем Норбліна. Асноўныя сюжэты яго твораў на момант сустрэчы з Карчэўскім — жанравыя сцэны з народнага жыцця: паштовая тройка, гандляры, базары,

---

130 Pierwsze wystawienie dzieł sztuk pięknych w cesarskim uniwersytecie wileńskim // Dziennik Wileński. T. II. — Wilno, 1820. S. 362—363

фурманы, катаржнікі, селянін, які просіць міласціну і г. д. Усе малюнкі Арлоўскага набліжаліся да дарожных замалёвак, бо перадаюць тое, што ўбачыў мастак на вуліцы або на дарозе ў час вандровак[131].

Такая тэматыка мела ўплыў на падрыхтаванага ў гэтым жа творчым напрамку Карчэўскага. У час знаходжання ў Пецярбурзе ён, відаць, напісаў наступныя карціны: «Расійская хуткая пошта», «Яўрэйскае пахаванне», «Яўрэйская карчма», «Яўрэі ў дарозе», «Пастой». Творы Карчэўскага адзначаліся прыгожым каларытам і праўдзівасцю. Па словах Ю. Вільчынскага, яны «сваім каларытам, кампазіцыяй, выразнасцю вобразаў заваявалі ўсіх. Яны былі напісаны шырокім і смелым пэндзлем»[132]. Вы звярнулі ўвагу, што значная частка твораў Карчэўскага прысвечана яўрэям. Гэта нездарма, таму што сам мастак паходзіў з тэрыторыі, якая ўваходзіла ў межы аседласці яўрэйскага насельніцтва. Відаць, сюжэты напісанага ён не аднойчы бачыў у жыцці і вырашыў аддаць свае сілы на адлюстраванне жыцця і быту гнанага ў той час народа.

У 1826 г. Юліян Карчэўскі пакінуў Пецярбург і за кошт бацькі паехаў удасканальваць сваё майстэрства спачатку ў Францыю, а потым у Англію і Італію. Здаецца, Юзэф Карчэўскі зразумеў, што нельга стрымліваць талент сына і пачаў яму дапамагаць. На шляху да Парыжа Юліян пабываў у Дрэздэне, Амстардаме. У Луўры ён капіраваў творы выдатных майстроў заходнееўрапейскага жывапісу. Галоўным чынам той тэматыкі, якой сам сябе прысвяціў. Многія копіі пасылаў да бацькі на Ашмяншчыну. У Парыжы настаўнікамі Карчэўскага сталі вядомыя французскія мастакі: творца новага накірунку французскага жывапісу, акадэмік (1827) Орас Верне (1789-1863) і барон (1827) Антоні Жан Грос (1771-1835). Першы з названых пісаў выключна сцэны з непасрэдна ўбачанага ў жыцці (каня лепш за яго не пісаў ніхто). Другі маляваў напалеонаўскія бітвы і партрэты. Відаць, пад уплывам іх Карчэўскі напісаў карціны: «Ян III пад Венай» (другая назва «Сабескі пад Венай»?) і «Турак на кані» (іншая назва «Турэцкі коннік»?).

З Францыі Юліян Карчэўскі паехаў у 1829 г. на кароткі час у Лондан, а потым у Рым. Тут ён пражыў апошнія свае гады. З 1828 г. кіраўніком французскай акадэміі ў Рыме быў Верне і, можа быць,

---

131 Аб Арлоўскім гл.: Коваленская Л. И. История русского искусства первой половины XIX в. - М, 1951. - С. 101-103; Русская жанровая живопись XIX-начала XX в. Очерки. - М, 1964. - С. 20-24; История русского и советского искусства / Под ред. Д, В. Сарабьянова. – М. 1989. - С. 197-198; Polska, jej dzieje i kultura czasów chwili obecnej. T. 3. - W, б. г. - S. 225-226.

132 Athenaeum. T. 1 — Wilno, 1851. — S. 116—124.

Карчэўскі паехаў асабіста да яго? У любым выпадку яны не маглі не сустракацца. Тут пазнаёміўся Юліян з Адамам Міцкевічам, які, як вы памятаеце, ведаў і цаніў яго настаўніка Арлоўскага. Пад уплывам Міцкевіча Карчэўскі напісаў некалькі новых палоцен з народнага жыцця Беларусі. Напрыклад, «Яўрэйскі фурман у літоўскай карчме» (іншая назва «Яўрэйскі возчык перад карчмой у Літве»?). У пачатку 1830-х гадоў Юліян захапіўся гістарычным жанрам і напісаў шэраг карцін.

Юліян Карчэўскі быў летуценнікам, чалавекам жывога характару, неўціхаміраваных пачуццяў, але любіў адзіноцтва, меў нямногіх сяброў. У таварыстве быў вясёлым і дабрадушным. Як артыст, Карчэўскі вызначаўся ўлюбёнасцю ўдасканальвання, гарачнасцю дайсці да самай вышэйшай ступені, якой адзначаюць Майстроў. Як чалавек сціплы, ён лічыў сваю творчасць недасканалай, таму выстаўляўся мала. Але выстава 1830 г. у Капітоліі прынесла яму еўрапейскую вядомасць. Яго пейзаж (ці пейзажы?) атрымаў грамадскае прызнанне і пахвалу знаўцаў. Англійскія крытыкі змясцілі ў прэсе захапляючыя водгукі аб яго творах. Аб ім пісалі як аб выдатным каларысце. Карціны Карчэўскага падабаліся дасканаласцю каларыту, закончанасцю і дакладным прытрымліваннем натуры. Англічане, якія адпачывалі ў Рыме, ахвотна плацілі за іх грошы.

Калісьці Юліян Карчэўскі толькі падаваў вялікія надзеі, а цяпер ступіў на шлях прызнання і славы. Ён быў у росквіту творчых магчымасцей і ўзросту, але цяжкая хвароба (тубуркулёз) давяла ў студзені 1833 г. да раптоўнай смерці.

Акрамя ўжо названых карцін, Карчэўскі напісаў партрэт прафесара Якава Брыале, «Матка Боская», «Яўрэйская пошта» (ці гэта не блытаніна з «Расійскай хуткай поштай»?). На жаль, захаваліся толькі ў Нацыянальным музеі ў Варшаве «Яўрэйскае пахаванне», ды партрэт Брыале. У XIX ст. у галерэі А. Храптовіча ў Шчорсах знаходзіліся карціны: «Ян III пад Венай» і «Турак на кані», а ў калекцыі Томаша Зялінскага — «Матка Боская». Чытач можа паглядзець пейзаж Карчэўскага ў кнізе Л. Н. Дробава «Живопись Белоруссии XIX —начала XX вв.» (Мн. 1974. - С. 101).

## СПРАВА ВОРАНАЎСКАГА ЖЫВАПІСЦА ЯНА ТРАЯНОЎСКАГА

У гэтым нарысе хочацца расказаць чытачу яшчэ пра аднаго малавядомага мастака Яна (Івана) Траяноўскага. У сваёй першай кніжцы «По следам Гродненской старины» я ўжо аб ім пісаў, але засталося шмат белых плямаў. Той нарыс «Вороновского двора

живописец Иван Трояновский» я закончыў словамі: «Давядзецца... знайсці яго творы, як мастака, вершы, якія ён пісаў, удакладніць характар сувязей з дзекабрыстам Поджыа і вызваленчым рухам у Беларусі»[133]. Знойдзеныя ў апошні час матэрыялы дазваляюць паглыбіць нашы веды пра мастака з Гродзеншчыны. Каб вобраз быў цэльны, прыводзяцца факты і з першай кнігі, якая, дарэчы, напісана на рускай мове і стала бібліяграфічнай рэдкасцю.

...4 студзеня 1827 года лідскі земскі спраўнік Тамашэвіч чытаў данос ксяндза Вікенція Скібінскага. У ім гаварылася, што нараджэнец Воранаўскага маёнтка жывапісец Ян Траяноўскі «распаўсюджвае розныя супраць прастола Яго Імператарскай Вялікасці і супраць рэлігій звесткі». Скібінскі паведамляў, што ён «мае даручэнне ад улад, каб на такіх даносіць» і папярэджваў, што, калі своечасова не будуць прыняты адпаведныя меры, дык ён пачакае толькі адну пошту, а наступнай накіруе рапарт на імя ваеннага губернатара.

Працуючы над даносам, ксёндз безумоўна ўспамінаў як Траяноўскі «некалькі разоў, узяўшы яго за грудзі, кідаў на зямлю». Помста валодала Скібінскім: «Няхай будзе пакараны вальнадумец за свае мяцежныя і разбэшчаныя размовы аб свабодзе, за абразу мяне, як пастыра і начальніка прыхода. Гэта будзе навука для іншых, каб не асмельваліся гаварыць і рабіць падобныя рэчы. Калі не будуць пакараны злачынцы, дарэмнымі будуць указы і прадпісанні ўрада, накіраваныя супраць вальнадумства і мяцяжу».

Якія ж думкі Траяноўскага так хвалявалі і непакоілі Скібінскага? Перш за ўсё — адносіны да рэлігіі: доўгі час не ходзіць у касцёл і не спавядаецца, «поўны духу масонскага і лібералізму, смела рассейвае бязбожныя зерня і безперапыўна вядзе размовы супраць рэлігіі Хрыстовай і Прастола». Траяноўскі, відаць, добра разумеў сувязь існуючага ладу і рэлігіі. Ён пытаў у Скібінскага: «Колькі капеек у год бярэш ад Яго Імператарскай Вялікасці за ўкараненне дэспатызма людзям?»[134]

Следчая група, сфарміраваная гродзенскім губернаторам М. Т. Бабяцінскім, у складзе страпчага Вітаноўскага, духоўнага дэпутата ксяндза Осаўскай плебаніі Лінкіма і вядомага нам Тамашэвіча выявіла, што данясенне ксяндза Скібінскага «о дерзких отзывах помянутого Трояновского противу христианской веры и высочайшего престола, по

[133] Швед В. В. По следам Гродненской старины. — Гродно, 1993. — С. 37.
[134] БДГА, ф. 1, воп. 2, сп. 1885; гл. таксама: Мараш Я. Н. Художник Ян Траяновский друг декабристов // Декабристские чтения. 1. Гродно, 1990. — С. 39—42.

следствию не подтвердилось...». Гэта значыць, што не пацвердзіліся і наступныя словы даносу: «імператара называў дэспатам, тыранам, урад — ахоўнікам права неволі, князей — міністрамі дэспатызма...».

Але следчыя знайшлі ў хаце Траяноўскага шмат кніг, фарбы, мікраскоп. На адной з кніжак быў зроблены надпіс па-французску: «Каралі, якія мараць толькі аб тым, каб усяляць страх і прыгнятаць сваіх падданых, імкнучыся зрабіць іх больш пакорнымі, бічы роду чалавечага». Следчым Ян гаварыў, што яму спадабаліся гэтыя словы і ён выпісаў іх з сачынення Тылемаха. Успомнім, што эпіграфам да «Путешествия из Петербурга в Москву» А. Радзішчаў узяў словы з «Тилемахиды» В. К. Трэдзіакоўскага: «Чудище обло, озорно, огромно, стозевно и лаяй» («Пачвара тлустая, паскудлівая, велізарная, маючая сто пашчаў і брахаючая»). Можа Траяноўскаму быў вядомы гэты твор Радзішчава, які кідаў выклік дыспатычнаму рускаму самадзяржаўю, і яму захацелася звярнуцца да першакрыніцы — тварэнню Тылемаха?

Сярод папер знайшлі следчыя адзін з вершаў, напісаных Траяноўскім: «Роздум». У ім быў такі радок — Смяюся над вечнасцю і над хлуслівымі вестками[135]. Такім Чынам, следчая група мела матэрыял для таго, каб сцвярджаць, што Траяноўскі «заражён дерзостью неограниченных мыслей настоящего света, быв немалое время за границей в разных государствах». Аўтару гэтых слоў нешта не спадабалася і ён частку іх закрэсліў і зверху напісаў па-новаму: «Должен быть весьма дурных правил, коими начитан, будучи немалое время за границей в разных местах».

Траяноўскі сапраўды жыў за мяжой. У 1821 г. Віленскі універсітэт накіраваў яго ў Італію для ўдасканальвання адукацыі. Важна звярнуць увагу на тое, хто быў разам з ім. Гэта Канута Русецкі, які таксама вучыўся жывапісу ў Рыме і падтрымліваў сувязі з мясцовымі карбанарыямі. Другім быў Францішак Геранім (Яраш) Малеўскі — сын рэктара універсітэта, адзін з актыўных філаматаў, сябра А. Міцкевіча[136]. Такія сябры не маглі не ўплываць на погляды Траяноўскага. Разам яны вандравалі па Германіі, некалькі месяцаў жылі ў Парыжы, дзе мелі кантакты з мясцовай калоніяй рускіх і палякаў. Сярод іх, відаць, з Арэстам Кіпрынскім. У Рыме мастакі з Літвы, Беларусі, Польшчы падтрымлівалі паміж сабою кантакты, мелі нешта накшталт таварыства падобнага праграмай да філарэтаў. Вось што

---

135 Пераклад з польскай мовы на беларускую мой.

136 Ланда С. С. У истоков "Оды к юности" // Литература славянских народов. Вып. I. - М, 1956. - С. 11, 18; Korespondencja filomatow (1817-1823). - W, 1989. - S. 23.

гаварыў аб настроях гэтых людзей сучаснік: «І што можа быць больш узвышаным? Дзеці разадранай айчыны, мы збіраемся разам з розных частак Польшчы, на зямлі, пакрытай лаўрамі, і, паглыбляючыся ў дзеянні сусветных герояў, выхоўваем у сабе гарачае жаданне славы і, калі нязгода зняважыла і прывяла да падзення нашу айчыну, дык наш святы саюз стане, відаць, сэрцам і полымем Народа. Мы пакажам подзвігі нашых мужных продкаў і захаваем іх у памяці будучых нашчадкаў»[137]. У пачатку 1825 г. Траяноўскі вярнуўся ў Вільню.

Траяноўскага дапытвалі не толькі чыноўнікі мясцовай улады, але і ў Варшаве. Сенатар Навасільцаў даведаўся, што мастак быў знаёмы з дзекабрыстам Аляксандрам Поджыа і з ім раз'язджаў «па розным мясцінам». Сустрэча Яна з Аляксандрам магла адбыцца або напярэдадні яго ад'езду за мяжу, калі Поджыа, штабс-капітан Прэабражэнскага палка, знаходзіўся на Віцебшчыне ў час «італьянскага» паходу гвардзейскага корпуса[138], або адразу па прыездзе Траяноўскага, бо брат Поджыа на следстве па справе дзекабрыстаў гаварыў, што Аляксандр у 1823 г. «на шляху сваім з Пецярбурга заехаў, да знаёмай яму асобы ў Віленскай губерні». Ды і сам А. Поджыа паказаў, што ў 1824 г. быў у Віленскай губ., у г. Відзы па справе «зусім далёкай ад справы таварыства»[139].

Траяноўскі і Поджыа ў маі-чэрвені 1825 г. пабывалі на Украіне і Валыні, былі ў Адэсе[140]. Тут з лютага жылі сасланыя Адам Міцкевіч і Францішак Малеўскі, таму зусім верагодныя сустрэчы гэтых людзей са сваім сябрам Траяноўскім — паэтам, мастаком, атэістам, чалавекам, звязаным з віленскімі і рускімі рэвалюцыйнымі коламі. Сучасны даследчык С. С. Ланда дапускае, нават, удзел Траяноўскага разам з Міцкевічам і яго сябрамі ў летніх перагаворах у Адэсе паміж польскім Патрыятычным таварыствам і Паўднёвым таварыствам дзекабрыстаў[141]. Напэўна Траяноўскі сустракаўся з кімсьці з Адэскай польскай калоніі. Напрыклад, з былымі студэнтамі Віленскага універсітэта Кавальскім, філарэтам Мікалаем Маліноўскім і Цыпрыянам Дашкевічам і іншымі[142].

---

[137] Цыт. па: Ланда С. С. Мицкевич накануне восстания декабристов... — С. 109.

[138] У маёнтку Бельмонт Браслаўскага павета быў бацька Я. Траяноўокага.

[139] Восстание декабристов. Документы и материалы. Т. 11. — С. 51; Т. 12. — С. 181.

[140] У Адэсе жыў бацька Поджыа. Тут Аляксандр вырас і таму лічыў горад сваёй радзімай. Запрасіць да сябе ў хату, як вы самі разумееце, можна ні кожнага.

[141] Гл.: Ланда С. С. Мицкевич накануне восстания декабристов... — С. 111.

[142] Боровой С. Я. Мицкевич в Одессе // Декабристы- литераторы. Т. 2. Кн. 1. — М., 1956. — С. 442, 444 / Литературное наследство. Т. 60. Кн. 1.

У канцы 1825 г. Траяноўскі з поўдня Расіі едзе ў Санкт-Пецярбург. Можа ён выконваў ролю сувязнога паміж Міцкевічам і яго сябрамі (польскім тайным таварыствам) і дзекабрыстамі, з якімі яны былі знаёмы з 1824 г., калі праездам на поўдзень былі ў Пецярбургу. Напрыклад, А. Бястужаў (Марлінскі) і Кандраді Рылееў далі сасланым філаматам пры ад'ездзе рэкамендацыйны ліст на імя паэта В. І. Туманскага, які жыў у Адэсе[143].

...Пасля допытаў у Варшаве Траяноўскага прывезлі ў Вільню. Па наказу ад 25 жніўня 1827 г. яго прыгаварылі да аднаго года пакаяння ў Віленскім кляштары дамініканаў. Тут ён прасядзеў да 30 жніўня 1828 г. Потым жыў у бацькі пад паліцэйскім наглядам. Нават праз 8-10 год яму забараняли выязджаць з месца жыхарства ў Пецярбург, Маскву, Варшаву, пакінулі без увагі прашэнне аб замежным пашпарце.

У час, калі Траяноўскі быў у Віленскім кляштары, з ім пазнаёміўся А. Шэмеш, які ў сваіх успамінах піша пра яго, як мастака. Траяноўскі пачынаў вучыцца ва універсітэце, калі там працаваў вядомы жанрыст і партрэтыст Ян Рустэм. Потым удасканальваў свае веды за мяжой. Шэмеш піша, што Траяноўскі быў у Парыжы, калі там выстаўляўся Франсуа Жэрар, прыдворны жывапісец Напалеона І, які сваімі смелымі навацыямі рушыў класічныя традыцыі Давыда. Другі наватар Гараци Вернэт шукаў натхнення не ў міфалогіі і класічнай даўніне, а ў сучасных падзеях, у бітвах французаў за рэспубліку і імперыю. «Хто бачыў гэтыя творы, успамінае Шэмеш, — а потым яшчэ жывіўся ў Рыме выглядам стварэнняў старажытнага свету і італьянскіх школ, а пры гэтым радамі вядомага Камуцыні, павінен быў разысціся з цеснымі паняццямі віленскай школы. Размовы яго былі для мастака бязмерна мілыя і павучальныя — ён меў пачуццё Мастацтва і густ цалкам бязмежны; пры гэтым быў паслядоўнікам філасофіі 18 ст., не тайны, як вучні віленскай школы, а яўны, гарачы, фанатычны да экзальтацыі...»

Шэмеш лічыў Траяноўскага «моцным і арыгінальным талентам», мастаком, які меў больш творчых моцаў, чым усе разам мастакі-віленцы, не выключаючы Я. Рустэма. Шэмеш бачыў напісаную ім карціну: Баляслаў Храбры ў той момант, калі яму прыносяць праклён ад папы рымскага. Кароль сядзіць за сталом, абапершыся на локаць. На яго твары і ў постаці — грозны выраз, які прыводзіць у хваляванне тых, хто падае яму прысуд падзення і выгнання: яны

---

143 Яструн М. Мицкевич. — М. 1963. — С. 139.

стаяць у некаторым аддаленні ад караля, у іх постацях і выразах твару хістанне і жах. Паміж імі — духоўная асоба з рысамі і тварам італьянца.

У Вільні Траяноўскі працаваў над карцінамі «Пшемыслаў і Лудгарда», «Вітаўт». На апошняй — выява Вітаўта ў той час, калі да яго прыводзяць палонных татар, маскалёў і крыжаносцаў. Татары курчацца каля ног вялікага князя, астатнія ў аддаленні задумліва глядзяць. На першым плане карціны былі жрацы, забіваючыя ахвяру[144]. Да твораў Траяноўскага, відаць, належалі і дзве мініяцюры, знойдзеныя пры ягоным арышце: імператар Мікалай Паўлавіч і імператрыца Марыя Фёдараўна.

## ФІЛАМАТ АДАМ МІЦКЕВІЧ

«Адам Міцкевіч, — пісала Роза Люксембург, — з'яўляецца не толькі выдатным польскім паэтам і адным з выдатных паэтаў свету. Гэта паэт, з імем якога цесным чынам звязана ўся нацыянальная і духоўная гісторыя Польшчы»[145].

Імя Міцкевіча, сапраўды, звязана з рэвалюцыйнай барацьбой. Ягоная дзейнасць і творчасць аказалі вялікі ўплыў на жыццё і барацьбу шэрагу пакаленняў беларускіх і польскіх патрыётаў. Мне здаецца, што пахаванне астанкаў Міцкевіча ў ліпені 1890 г. у Кракаве, у нішы старажытнага Вавельскага замка, недалёка ад магілы Т. Касцюшкі, вельмі сімвалічна. Абодва сыны Беларусі бачылі сэнс жыцця ў барацьбе за вольнасць Беларусі і незалежнасць свайго народа.

...Каля 1 км ад Туганавічскага парку, на поўдзень ад в. Карчова Баранавіцкага раёна, ва ўрочышчы Кут, ляжыць вялікі камень (4,1x3,0x1,9 м). Жыхары навакольных вёсак называюць яго Каменем філарэтаў. Ён на самой справе звязаны з гісторыяй гэтага таварыства (відаць, з групай, арганізаванай у м. Цырын). Філарэты збіраліся каля Каменя ў час сваіх сходак і маёвак. Тут пабывалі Адам Міцкевіч, Тамаш Зан, Ян Чачот, Ігнаці Дамейка, Францішак Малеўскі — самыя аўтарытэтныя філаматы і філарэты. Тут Міцкевіч чытаў свае вершы, праводзіў дыскусіі[146]. Калі ў 1979-1982 гг. я працаваў у сярэдняй школе г. п. Гарадзішча Баранавіцкага р-на, мне даводзілася са сваімі вучнямі бываць каля Каменя філарэтаў і ў іншых міцкевіцкіх месцах. Нямногае

---

[144] Szemesz A. Wspomniene o Szkole malarskej... — S. 222-224.
[145] Люксембург Р. О литературе. — М., Л., 1934. — С. 53.
[146] Ляўкоў Э. А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны. — Мн., 1992. — С. 197—199.

я мог тады расказаць дзецям, не тое, што цяпер, кал і перагледжана шмат літаратуры, архіўных і апублікаваных крыніц.

«Именной список, общий, о принадлежавших к тайному обществу филаретов» зафіксаваў прызнанне кандыдата філасофіі Адама Міцкевіча да прыналежнасці яго да Таварыства філаматаў і што «не будучи якобы членом филаретов бывал иногда на заседаниях их». У Таварыства філаматаў Міцкевіч уступіў 1 кастрычніка 1817 г., з'яўляўся сябрам яго праўлення (дырэкцыі). Следчы камітэт уключыў яго таксама ў спіс філадэльфістаў, а з 7 красавіка 1819 г. Міцкевіч быў яшчэ і членам Саюза сяброў[147].

Адам Мідкевіч быў адным з актыўных арганізатараў Таварыства філаматаў. Яшчэ ў 1816 г. разам з Т. Занам, Ануфрыем Петрашкевічам, Юзэфам Яжоўскім стварыў ён «цесную кампанію або таварыства», у якім яны абмяркоўвалі прачытаныя кнігі, гаварылі пра пісьменнікаў, разважалі пра навукі. Канчаткова афармленне самастойнага студэнцкага таварыства адбылося значна пазней — у кастрычніку 1817 г., калі быў прыняты першы ўстаў.

Міцкевіч быў душою Таварыства філаматаў. Ен вылучаўся сярод сяброў шырынёй кругагляду і смеласцю крытычнай думкі. Быў цэнтральнай фігурай, якая задавала тон і накірунак дзейнасці арганізацыі. Францішак Малеўскі сцвярджаў, што Міцкевіч быў «создателем..., первой пружиной» усіх планаў, праектаў, пачынанняў філаматаў. Пратаколы пасяджэнняў Таварыства філаматаў малююць нам Міцкевіча як нястомнага арганізатара, пастаяннага выступаючага з разнастайнымі планамі і праектамі, актыўнага ўдзельніка ўсіх нарад і абмеркаванняў», аўтара вершаў, паэм, перакладаў, крытычных даследаванняў і паведамленняў.

Значную ўвагу ўдзяляў Міцкевіч прыёму новых сяброў у таварыства і канспірацыі. У вершы «Ужо з твару нябес...» ён пісаў:

Но право нужно быть тупицей недалеким,
Чтоб сделать доступ к нам открытым и широким.
Строенье лишь тогда не рушится веками,
Когда строители кладут отборный камень.
И, чтобы замысел не оставался словом,
Пусть исполнители пройдут отбор суровый!..

Аб канспірацыі Міцкевіч пісаў у прэамбуле першага ўстава таварыства, аб ёй ён гаварыў Яну Чачоту: «Аднак і ў саміх рэспубліканскіх краінах кабінеты маюць права трымаць у тайне свае

---

[147] РДГА, ф. 156, воп. 1, сп. 96, л. 388; ф. 36, воп. 4, св. 24, сп. 297, л. 3.

дзеянні і што ж гаварыць аб нашым таварыстве? Што дапаможа, калі ўсе будуць добрымі і толькі адзін дурным? Калі б гэты адзін усё ведаў, нам няма выратавання і большасць не змагла б абараніцца, ды яшчэ ў нашай дзяржаве!» Міцкевіч быў упэўнены: «Чым урад дэспатычней, тым мацней павінны быць засакрэчаны ўсе тайныя арганізацыі».

Растлумачваючы Я. Чачоту абавязкі сябра Таварыства філаматаў, Міцкевіч сцвярджаў: «Ітак, першае тваё намаганне павінна быць накіравана на тое, каб выбрацца з гэтай бездані раўнадушных адносін да ўсяго і дапамагчы выбрацца з яе іншым. Пераканаць чалавека, што ён здолен, я не гавару да выканання вялікіх спраў, але па крайняй меры да думкі аб іх, ужо вялікая справа!».

У першым уставе таварыства, падрыхтаваным Міпкевічам і Т. Занам, а потым перапрацаваным Яжоўскім, было да 60 параграфаў. Мэта вызначалася проста: «Вывучэнне навук, асабліва мастацтва пісьменійцтва, аказанне ў навуках узаемнай дапамогі...» Але за гэтай прастатой скрываліся планы барацьбы за нацыянальнае адраджэнне, бо навошта тады падтрымліваць строгую канспірацыю? Устаў праіснаваў на працягу аднаго 1817/1818 навучальнага года, а ў 1818/1819 дзейнічаў ужо іншы. Міцкевіч, які настойваў на рэфарміраванні таварыства, дабіўся свайго — у чэрвені 1818 г. быў прыняты другі ўстаў.

У ім мэта таварыства вызначалася, як. «узмацненне ўсеагульнай асветы». Міцкевіч прыпісаў: «а адсюль і агульнага дабрабыту», але гэта было выкрэслена. Параграф 5 сцвярджаў: «Поўная аддача сябе агульнаму дабрабыту з'яўляецца асновай жыцця Таварыства». Яно было падзелена на два аддзяленні: гуманітарнае (галава Міцкевіч) і натуральна-матэматычнае (галава Петрашкевіч, затым Т. Зан), уведзен клас карэспандэнтаў і сапраўдных сяброў таварыства, абрана праўленне (у яго, напомню, увайшоў і Міцкевіч), ускладніўся прыём сяброў, узмацнілася канспірацыя. Але і такі ўстаў не задавальняў Міцкевіча, бо мэта вызвалення краіны была ў ім сказана невыразна.

У праекце трэцяга ўстава (студзень-сакавік 1819 г.) Міцкевіч пісаў: «Перш за. ўсё аб мэце. Я згодзен, што яна павінна быць па магчымасці больш шырокай. У прыватнасці таварыства будзе імкнуцца распаўсюджваць усімі сродкамі грунтоўную адукацыю ў польскім народзе, ...умацоўваць непахісную народнасць; распаўсюдж-ваць ліберальныя правілы; абуджаць дух грамадскай дзейнасці; займацца справамі, якія цікавяць увесь народ; нарэшце, фарміраваць, падымаць і ўсталёўваць грамадскую думку». У час абмеркавання

трэцяга ўстава Міцкевіч заклікаў «Імкнуцца да распаўсюджвання вызначаных правіл маралі, так моцна змарнаванай сярод моладзі»[148].

У чэрвені 1819 г. трэці ўстаў быў прыняты. Мэтай таварыства было запісана: «выхоўваць у польскай моладзі пачуцці чыстай маралі, падтрымліваць у яе любоў да роднай гісторыі, абуджаць жаданне да вучобы, умацоўваць у меру сіл народную асвету і такім чынам садзейнічаць дабрабыту і благадзенству краіны»[149]. Гэты ўстаў быў разлічаны на пераходны перыяд, бо Міцкевіч задумаў «вялікую рэформу», да якой прыступілі ў пачатку 1819 г. Ён прапанаваў план пераўтварэння студэнцкага таварыства ў агульнанародную палітычную канспіратыўную арганізацыю. Яна ўяўляла б сабою разгорнутую сетку легальных і нелегальных таварыстваў па ўсёй тэрыторыі Польшчы (у тым ліку і літоўска-беларускі край). У іх маглі б уваходзіць не толькі студэнты, але і чыноўнікі, купцы, гараджане, рамеснікі, земляробы. Кіравалі б такой арганізацыяй філаматы. Выходзіла б легальная газета.

У перыяд абвяшчэння трэцяга ўстава Міцкевіч на пасяджэнні таварыства 1 лістапада 1819 г. прачытаў «Песню Адама», дзе заклікаў сяброў служыць «дабрадзейнасці, айчыне і навуцы»:

Пусть счастьем глаза загорятся,
Чело нам украсит венок,
Обнимемся все мы по-братски,
Сойдемся в веселый кружок.
Пускай к нам не ведают входа
Излишество, хитрость и лесть,
Извечно живет тут свобода,
Отчизна, наука и честь.
Мы руки друг другу протянем,
Откроем друг другу сердца
И помыслы, чувства, желанья
Поведаем все до конца.

Ва ўмовах грамадскага ўздыму 1819-1820 гадоў Міцкевіч і яго сябры вялі пошукі новых форм арганізацыйнай і палітычнай дзейнасці. Яны прывялі да стварэння ў канцы 1820 г. Таварыства філарэтаў. Як новая праграма дзеяння гучала напісаная Міцкевічам «Песня філарэтаў». Ён верыў, што:

Калі захоча зрушыць

---

[148] Mickiewicz A. Dzieła. T. XIV. Listy. Gz. 1. — W., 1953,- S. 26, 37, 47.
[149] Materiały do historii lawarzystwa filamatow, T. I. — Krakow, 1920 — S. 27.

Цяпер зямлю Н'ютон
Хай злічыць нашы душы
І — хопіць! — скажа ён.
Вучоным цыркуль мілы
І мёртвы бляск свяціл,
Для нас намераў сіла
Праўдзівей меры сіл.
Наш цыркуль — сэрцаў вера,
Імкненняў ясны дух,
Дабро — адна ў нас мера,
І дружба — болей дзвюх.

У 1832 г. у трэцяй частцы «Дзядоў» Міцкевіч намалюе вобразы сяброў Таварыства філарэтаў: людзей высокіх маральных якасцяў, простых і сціплых юнакоў, спаяных светлым сяброўствам, самаадданых патрыятычнай справе. Яны ідуць на ахвяру, таму што ведаюць — гэтыя ахвяры разбудзяць народ:

Но если я пойду, звеня кандальным звоном,
В Сибирь, на каторгу, в Литве заговорят:
«Так гибнет ни за что на каторге наш брат.
Постой, проклятый царь! Постой, москаль негодный!»

У 1820 г. Міцкевіч паспрабаваў стварыць у Коўна «Грамадзянскі саюз» і «Грамадзянскую бібліятэку». Тое ж самае марыў зрабіць і ў Навагрудку. Ён гаварыў, што трэба зрабіць абавязкам кожнага філамата стварэнне падначаленых таварыстваў, сябры якіх не павінны ведаць аб існаванні галоўнай арганізацыі.

Асаблівую ўвагу ўдзяляў Міцкевіч кантактам і сувязям Таварыства філаматаў з іншымі існуючымі арганізацыямі. У жніўні 1819 г. ён уступіў у перагаворы з масонскай ложай у Навагрудку «Вузел еднасці» («Узел единства»). Вясной 1820 г. Міцкевіч праявіў цікавасць да сустрэч філаматаў з эмісарам тайных варшаўскіх таварыстваў Ксаверыем Агінскім, а ў чэрвені 1820 г. пісаў Петрашкевічу ў Варшаву: «Ці не змог бы ты ў Варшаве нешта накшталт філарэтаў прыдумаць, некалькі невялікіх таварыстваў?» Зацікавіўся Міцкевіч і асобай Людвіга Пенткевіча — арганізатара «Саюза вольных палякаў»[150]. Быў блізкім паэт да «Таварыства сяброў», вышадшага з навагрудскай масонскай ложы, а можа, нават, быў і ініцыятарам яго стварэння. Прыклаў руку таксама да арганізацыі Таварыства ваенных сяброў, бо раіў Міхаілу Рукевічу звярнуцца ў справе стварэння таварыства ў

[150] Mickiewicz A. Dzieła. T, XIV. Listy, Gr. 1 — S. 21, 138-139.

Літоўскім асобным корпусе да Ігельстрома, знаёмага яму па той самай масонскай ложы.

Філаматы надавалі вялікую ўвагу літаратуры, навуцы і мастацтву, як сродкам асветы грамадства. У гэтым плане становіцца зразумелай сувязь дзейнасці Міцкевіча — філамата з ягонай творчасцю. Ігнаці Дамейка ўспамінаў: «Ён пісаў для нас песні, яго песні толькі і пелі, і гэтымі песнямі панаваў, ажыўляў, умацоўваў дух моладзі»[151]. Гімнам стала «Песня філарэтаў» (1820), спявалася «Песня Адама» (1819).

Шмат сваіх вершаў 1817-1820 гадоў чытаў Міцкевіч на пасяджэннях таварыства. 7 кастрычніка 1817 г. Міцкевіч пазнаёміў сяброў з невялічкай паэмай «Мешка — князь Навагрудка», ідэя якой — толькі народ змог выгнаць прыгнятальнікаў — татар, у той час, калі князь аддаваўся гульбе і распуцтву. У паэме «Бульба» (1817) бачны мары Міцкевіча і яго сяброў «аб зары вольнасці», якая ўстае «над руінамі», яны спадзяюцца, што прыйдзе час.

Когда король-народ всей властью облеченный,
Всех деспотов своих на гибель обречет
И новой вольности в Европе свет зажжет!

1 студзеня 1819 г. Міцкевіч прачытаў на пасяджэнні філаматаў гістарычную аповесць «Жывіля» (1818), дзе даў вобраз жанчыны-гераіні, вернай грамадзянскаму абавязку. Літоўская (беларуская?) дзяўчына заклікала народ да барацьбы з войскамі ворага, які ўварваўся на родную зямлю. Гэтая тома (аб'яднанне ўсіх патрыятычных сіл для агульнага выратавання) будзе працягнута ў «Гражыне» (1822). Успомнім, што ў гэты час Таварыства філаматаў спрабуе пашырыць уплыў сваёй дзейнасці на насельніцтва, стварыць разнастайную сетку тайных арганізацый.

Восенню 1820 г., калі Антоній Адынец уступаў у Таварыства філаматаў, на пасяджэнні чыталіся тры вершы Міцкевіча («Холмік Марылі», «Свіцязь» і «Свіцязянка»). Ён успамінаў: «Чачот прачытаў іх з такім пачуццём, што нават пры чытанні «Холміка Марылі» павінен быў на хвіліну запыніць чытанне, каб пераадолець уласнае хваляванне... Было чутна нават біццё сэрцаў, такая цішыня і такое ўражанне авалодалі слухачамі. Можна з упэўненасцю сказаць, што кожны з нас падзяляў подых героя балады, калі перад ім «поверх серебристых вод Свитязи переливалась девичья красота (Свитязянки)...»[152].

---

[151] Domejko I. Filareci i filomaci // Promieniści, Filomaci — filoreci / Zebrał H. Mościcki. — W., Lublin... Wyd. 2, 1928. — S. 9.

[152] Цыт. па: Советов С. С. Адам Мицкевич. — Л., 1956. — С. 61.

У гэтым жа годзе была напісана «Ода да маладосці». Маладосць — гэта ўвасабленне нястрыманай творчай энергіі барацьбітоў прагрэсу, старасць — сімвал палітычнай блізарукасці, эгаізму і рабалепства рэакцыянераў. Міцкевіч заклікаў да барацьбы супраць змярцвелага ліха, хаосу, які раз'ядноўвае людзей, супраць багацеяў-эгаістаў, не ведаючых ні пачуццяў, ні захаплення. Паэт-філамат бачыў шчасце ў служэнні грамадству і праслаўляў тых, хто аддаў жыццё ў барацьбе за агульнае блага чалавецтва. Ён заклікаў моладзь:

Друзья младые! Вставайте разом!
Счастье всех — наша цель и дело.
В единстве мощь, в упоеньи разум.
Друзья младые! Вставайте смело!

«Ода да маладосці» заканчваецца надзеяй на блізкі ўсход сонца свабоды:

Ломают льды весенние воды.
С ночною свет сражается тьмою.
Здравствуй, ранняя зорька свободы!
Солнце спасенья грядет за тобою!

Ода стала гімнам і маніфестам рэвалюцыйнай моладзі, а яе аўтар — іх правадыром. Аб рэвалюцыянізіруючым уплыве оды на моладзь пісаў у сваіх «Дзённіках» Каэтан Козьмян: «Нарэшце, з'явілася «Ода маладосці», бясспрэчна, выдатная, як паэма; але які быў вынік? Той, што яна цалкам перавярнула розум моладзі. Моладзь адчула сябе ўсім у айчыне, у патрыятызме, у літаратуры. Зліліся ў адно рэвалюцыйная тэндэнцыя ў літаратуры з імкненнем да палітычнай рэвалюцыі, з гэтага часу патрыятызм і рэвалюцыя ва ўсім, усюды і заўсёды сталі сінонімамі, Міцкевіч хваляваў у гэтым напрамку розум моладзі па ўсяму пространству польскай зямлі»[153].

У 1819 г. Міцкевіч скончыў Віленскі універсітэт і яго назначылі настаўнікам павятовай школы ў Коўна. Тут ён правёў амаль два гады, але не быў адарваны ад Таварыства філаматаў. Наадварот, лічыў Жулкеўскі, «Міцкевіч не адыходзіў ад філаматаў, а вёў іх за сабою»[154]. Ён ствараў праекты, планы, выказваў разнастайныя прапановы па далейшаму развіццю таварыства, падтрымліваў жвавую перапіску з філаматамі (апублікавана 266 лістоў ковенскага часу): прэзідэнтам філаматаў Ю. Яжоўскім (12 лістоў), кіраўніком Таварыства прамяніс-

---

[153] Цыт. па: Горский И. К. Адам Мицкевич. — М., 1955. — С. 72; Ланда С. С. У истоков "Оды юности" // Литература славянских народов. Вып. 1. Адам Мицкевич. Сб. статей. — М., 1956. — С. 5.
[154] Żółkiewski St. Spor o Mickiewicza. — Wroclaw, 1952. — S. 40, 52—53.

тых Т. Занам (13), сябрам праўлення Таварыства філаматаў Ф. Малеўскім (3), сябрам дзяцінства Я. Чачотам (27), сакратаром таварыства А. Петрашкевічам (5), філарэтам А. Адынцом (1) і іншымі. Філаматам не хапала іх актыўнага калегі, а Міцкевічу ў яго нудным жыцці правінцыяльнага настаўніка — партнёраў для сур'ёзнай дыскусіі і проста сяброў[155]. У 1821-1822 гг. Міцкевіч напіша віленска-ковенскія часткі «Дзядоў», дзе прагучаць дзве тэмы: сацыяльны пратэст супраць багацця, паноў, іх бяздушша і эгаізму, захаванне арыгінальных рыс і нацыянальных традыцый народа, а таксама — шчырае палымянае пачуццё паэта да каханай, але пакінуўшай яго дзяўчыны.

У ноч з 23 на. 24 кастрычніка 1823 г. Міцкевіч быў арыштаваны і пасаджаны ў Базыліянскі манастыр, пераўтвораны ў турму. Сябры па таварыству настойвалі на тым, каб паэт катэгарычна адмовіўся ад прыналежнасці да тайнай арганізацыі. У заключным дакладзе следчай камісіі ад 20 красавіка 1824 г. аб Міцкевічу было сказана, што ён «не належаў да сакрэтнага таварыства, а толькі меўшы ўдзел у гаворках, паступіў гэтым «неблагоразумно» і мог быць сачленам такім, якія ў палымянасці пераступілі абавязкі непрыстойнымі рэчамі сваімі». Абставіны гэтага перыяду Міцкевіч пазней апіша ў дрэздэнскіх частках «Дзядоў». 21 красавіка па хадайніцтву І. Лелевеля Міцкевіч быў вызвалены з турмы і ўзяты ім на парукі. Па прыгавору паэт-філамат належаў высылцы ў цэнтральныя губерні Расіі з правам выбраць сабе службу па свайму рашэнню. 22 кастрычніка 1824 г. Міцкевіч атрымаў прадпісанне не пазней як праз два дні выехаць у Пецярбург. 24 кастрычніка разам з Малеўскім і Яжоўскім назаўсёды пакінуў так горача любімую ім Літву. Наперадзе былі сустрэчы з А. Пушкіным, дзекабрыстамі (К. Рылеевым, А. Бестужавым-Марлінскім), перадавымі людзьмі Расіі (П. А. Вяземскім, Е. Баратынскім, А. Хамяковым, G. Шэвыровым).

Дзевяць месяцаў правядзе Міцкевіч на поўдні Расіі. У гэты час у Вільні (у канцы вясны 1825 г.) Таварыства філаматаў аднавіла сваю дзейнасць. Вось што даносіў 28 лістапада 1825 г. цэсарэвічу Канстанціну Паўлавічу сенатар Навасільцаў: «але корань онага па скрытнасці сваёй яшчэ існуе»[156]. Праяўленнем дзейнасді філаматаў было стварэнне М. Рукевічам Таварыства ваенных сяброў, рэарганізадыя «Заран» Свіслацкай і Беластоцкай гімназій, студэнцкія хваляванні ў Вільні з канца 1824 г. Высланы ў Адэсу, Міцкевіч аднаўляе сувязі з віленскімі

---

[155] Korespondencja filomatow (1817-1823)... - S. 493-499.
[156] РДГА, ф. 156, вон. 1, сп. 96, л. 614.

сябрамі. Адзін з іх — Мар'ян Пясецкі, якому нямала месца ўдзялялі данясенні Навасільцава і паліцэйскія рапарты за 1825 г. У майскім лісце Малеўскага да сястры ёсць просьба Міцкевіча да Пясецкага, каб ён дастаў і пераслаў яму вершы «І. Лелевелю» і «Да мастака», аповесць «Жывіля», перапісаны акт «Дон-Карласа» з «Оды да юнацтва» (абавязкова без купюр цэнзуры).

У пачатку ліпеня Міцкевіч сустракаецца ў Адэсе з доктарам Каралем Качкоўскім, з мастаком Янам Траяноўскім. У Акермане паміж 21 і 24 ліпеня 1825 г. адбылася цікавая сустрэча з доктарам Серафімам Гаціскім — земляком з Навагрудскага павета, масонам мясцовай ложы «Вузел еднасці». Спачатку Міцкевіч атрымаў ад яго ліст, а потым, нягледзячы на нагляд і небяспечнасць, паехаў на сустрэчу. G. Ланда лічыў, што паездка паэта мела нейкае дачыненне да адбываўшыхся ў ліпені 1825 г. перагавораў паміж Паўднёвым таварыствам дзекабрыстаў і прадстаўнікамі польскага Патрыятычнага таварыства. Гаціскі, відаць, расказаў Міцкевічу аб аднаўленні філамацкай арганізацыі, аб канспіратыўнай дзейнасці М. Рукевіча ў Беластоку і Гродзенскай губ[157].

Па сведчанню К. Мархоцкага, які суправаджаў Міцкевіча ў гэтай паездцы, Мідкевіч быў задаволены яе вынікамі. Сустрэча ўсяліла ўпэўненасць, прабудзіла творчыя замыслы паэта — ён прыступіў да напісання паэмы «Конрад Валенрод» (1827):

Люблю народ, как муж, любовник, друг, отец.
Хочу поднять его, наставить,
И в мире, из конца в конец,
Его деяния прославить.

...У 1972 г. Камень філарэтаў быў абвешчаны геалагічным помнікам прыроды. Спадзяюся, што прыйшоў час і да абвяшчэння яго помнікам гісторыі і культуры. Для гэтага, як мы бачым, ёсць усе падставы.

## ІНСУРГЕНТЫ З МАСТОЎШЧЫНЫ

«Рэвалюцыя на парозе Расіі, — сцвярджаў Мікалай I, — але, прысягаю, яна не пранікне ў яе, пакуль у мяне захаваецца дыханне жыцця». Расійскі цар гаварыў гэта ў 1826 годзе, калі ішло следства над дзекабрыстамі. Але не прайшло і пяці гадоў, як рэвалюцыйныя падзеі

[157] Гл.: Ланда С. С. Мицкевич накануне восстания декабристов (иа истории русско-польских общественных и литературных связей) // Литература славянских народов. Вып. 4. М., 1959. - С. 116-122.

зноў «пранiклi» ў Расiю. У лiстападзе 1830 г. пачалося паўстанне ў Польшчы, якая ў той час з'яўлялася часткай Расiйскай iмперыi.

Доўгi час рускiя, а потым савецкiя гiсторыкi лiчылi яго толькi «польскiм». Iгнаравалiся вядомыя гiстарычныя факты. Лiчыце самi. 6 (18) снежня 1830 г. асобы манiфест паўстанцкага Нацыянальнага ўрада абвясцiў задачу аднаўлення Польшчы ў межах 1772 г. (да I падзелу Рэчы Паспалiтай). Абедзьве партыi, чырвоныя i белыя, iмкнулiся распаўсюдзiць паўстанне на Лiтву, Беларусь, Украiну. I трэба сказаць, яны часткова дабiлiся сваёй мэты.

У шарэнгi лiстападаўскiх паўстанцаў усталi i жыхары Мастоўшчыны. Яны былi ў наступных атрадах: былога паручнiка Аляксандраўскага палка Цiтуса Пуслоўскага, якi дзейнiчаў у Слонiмскiм, Пружанскiм, Кобрынскiм паветах; памешчыка Стафана (Сцяпана) Незабiтоўскага i дваранiна Антона Бронскага, якi дзейнiчаў у Слонiмскiм павеце; засядацеля Гродзенскай палаты, адстаўнога капiтана былых польскiх войск Iвана Жылiнскага, якi дзейнiчаў у Гродзенскiм павеце i Беластоцкай вобласцi; акруговага ляснiчага, тытулярнага дарадчыка Яўгена Ронка i маршалка Брэсцкага павета Карла Нямцэвiча, якi дзейнiчаў у Белавежскай пушчы.

Наш расказ пра некаторых паўстанцаў, якiя змагалiся ў гэтых атрадах «За нашу вольнасць i вашу!». Дзяшко Сцяпан — селянiн Гродзенскага павета памешчыка Мучынскага з маёнтка Радзiвонавiчы Фелiкса Пуслоўскага. У следчых дакументах пра яго гаворыцца: «знаходзiўся ў шайцы мяцежнiкаў з ружжом». Вiдаць, Дзяшко быў у атрадзе Цiтуса Пуслоўскага. Арышт адбываў у Гарадзенскiм астрозе (а пакуль хварэў ляжаў у гарадавым шпiталi). Па рашэнню мiнскага губернскага начальства ад 20.08. (1.09) 1831 г. быў адпраўлены ў Табольск для вызначэння ў Сiбiрскiя лiнейныя батальёны. Там, са згоды Iвана Залеўскага, якому выпала царскае дараванне, узяў пры пераклiчцы ягонае iмя i збег у Гродзенскую губерню. Зноў быў схоплены i па вызначэнню следчай камiсii ад 10 (22) жнiўня 1832 г. другi раз адпраўлены ў Сiбiрскiя лiнейныя батальёны. Далейшы лёс невядомы.

**Курпiнскi Фелiкс** — селянiн маёнтка Забалацце Ваўкавыскага павета памешчыцы Сухадольскай. Падчас праходу праз губерню Хлапоўскага служыў у яго лакеем. Захварэў i знаходзiўся ў Коўна, дзе i быў захоплены ў палон. Сядзеў у Дынабургскай крэпасцi, адкуль адпраўлены ў Гродна. Па вызначэнню следчай камiсii ад 1 (13) лютага 1833 г. Курпiнскаму «коего мятежные действия заключаются в 3-й степени» было абвешчана прабачэнне з пасяленнем на былое месца жыхарства. Што i было выканана 3 (15) лютага 1833 г.

**Матусевіч Мацвей** — памешчык в. Калядзічы Ваўкавыскага павета. «Присоединясь к шайке мятежников с оными отлучился за границу, от коль просил пощады». У якім атрадзе быў Матусевіч, высветліць не ўдалося, а «ўсеміласцівейшае прабачэнне» ён атрымаў і па рашэнню камісіі паселены на былое месца жыхарства.

**Мінучыц** — шляхціц, служыў у маёнтку Масты памешчыка Кіркілы. Камісіяй быў унесены ў 2 разрад «злачынцаў», бо добраахвотна прыйшоў у Зубрыны Кут Белавежскай пушчы і ўступіў у атрад К. Нямцэвіча і Я. Ронка. Быў таксама ў атрадзе І. Жылінскага, дзе стаў «руплівым выканаўцам распараджэнняў свайго начальніка». Пасля разгрому атрада збег невядома куды. Камісіі засталося толькі ў 1832 г. канфіскаваць ягоны маёнтак Астравок Лідскага павета. Ён быў настолькі малы (усяго 3 душы), што ў большасці дакументаў насупраць прозвішча Мінучыца запісана «маёнтка не мае».

**Палубінскі Ігнаці Станіслававіч** — памешчык Гродзенскага павета (маёнтак Курчаўцы — 26 душ рымска-каталіцкага веравызнання) і Слонімскага (Грыўда — 225 душ праваслаўнага і рымска-каталіцкага веравызнання). Да паўстання з'яўляўся прэзідэнтам Слонімскага земскага павятовага суда. 3 (15) мая ў Слоніме, у хаце Фелікса Бронсісага, Палубінскі разам з Цітусам Пуслоўскім задумалі стварыць партызанскі атрад. Ён быў сфарміраваны ў лесе пад Крашанамі, куды ў ліпені па пісьму Пуслоўскага прыбыў і Палубінскі. Ігнаці стаў «бліжэйшым ягоным наперснікам і сябрам, быў з ім усюды і шалёным у баі пад Няўлянамі». Пасля паражэння ў гэтай бітве Палубінскі спрабаваў збегчы ў Галіцыю, але быў затрыманы на мяжы (па іншым матэрыялам — сам з'явіўся ў Валынскай губерні засядацелю Іскаву). Быў адпраўлены ва Уладзімірскі земскі суд, адтуль — у Жытомір і, нарэшце, — у Гродна. Па дарозе туды, у Слоніме, сказаўся хворым (павятовы лекар Пучкоўскі нават выдаў пасведчанне аб хваробе), але па агляду спецыяльна створанай у Гродне камісіі быў прызнаны здаровым. У лютым 1832 г. Палубінскі сядзеў пад арыштам у Гродзенскім кляштары кармялітаў. На яго кватэры ў Гродне, у доме Беркавіча О. Б., паліцмайстра зрабіў вобыск. Як сведчыць напісаны ім вопіс рэчаў Палубінскага, пасля першай вопісі знікнуў персцень з гербам. Ігнаці быў аддадзены ваеннаму суду, пры допытах меў вочныя стаўкі — у гістарычным архіве Гродна захаваліся асабістыя паказанні Палубінскага з ягоным подпісам. Суд прыгаварыў 30 мая (11 чэрвеня) 1833 г. паўстанца да службы ў Каўказскім асобым корпусе. Маёнткі, якімі Ігнаці валодаў разам з братам Францам, былі канфіскаваны ў 1832 г.

**Палубінскі Франц Станіслававіч** — памешчык Слонімскага павета, брат папярэдняга. Быў у атрадзе Незабітоўскага і А. Бронскага. Пры адступленні Дэмбінскага далучыўся разам з атрадам да яго, дайшоў да Варшавы і ўступіў афіцэрам у Егерскі пяхотны полк. Пасля паражэння паўстання збег у Прусію, адкуль прасіў літасці. Па ўказу Сената ад 10 (22) ліпеня 1833 г. атрымаў прабачэнне і дазвол вярнуцца на радзіму. 14 (26) ліпеня вярнуўся і жыў «безотлучно» па месцу жыхарства «в спокойном духе». У кастрычніку 1833 г. напісаў прашэнне аб вяртанні канфіскаванага маёнтка (аўтограф глядзі ў гістарычным архіве Гродна, ф. 1, вып. 27, спр. 346, а. 7, аб., 14). Франц атрымаў свае маёнткі, але павінен быў 1 частку даходаў з іх адцаваць у казну за свайго асуджанага брата Ігнацыя.

**Сапега Еўстафій** — князь, памешчык Слонімскага і другіх паветаў. 18 (30) чэрвеня 1831 г. прыехаў у Варшаву з Галіцыі (так ён аб'явіў мясцовай паліцыі). Служыў у Галоўным штабе польскай паўстанцкай арміі ў чыне паручніка «Літоўска-Расійскай легіі». Пасля паражэння паўстання выехаў за мяжу, адкуль вяртанне на радзіму было яму забаронена Палажэннем Камітэта па справах заходніх губерняў. Маёнтак Зэльва (1177 душ праваслаўнага і рымска-каталіцкага веравызнання) быў канчаткова канфіскаваны ў 1836 г.

**Трусееіч (Трушэвіч) Фёдар Цімафеевіч** — селянін в. Ябланава Ваўкавыскага павета памешчыка Эйсымонта. У маі 1831 г. тайна пакінуў яго і далучыўся да войска Хлапоўскага. Служыў дзеншчыкам у паручніка Забельскага. Пасля прайгранай атрадам бітвы пад Коўнам Трусевіч спрабаваў прабрацца ў каралеўства Польскае, але ў Кобрынскім павеце быў злоўлены і дастаўлены ў Гродна. Падчас следства сядзеў у Гродзенскім астрозе. Па вызначэнню Камісіі ад 13 (25) красавіка 1832 г. і рашэнню палявога аўдытарыята 1-й арміі, канфірмаванаму 4 (16) ліпеня 1832 г. Трусевічу абвешчана прабачэнне з пасяленнем на былое месцажыхарства пад распіску памешчыка з абавязкам наглядаць за яго паводзінамі.

**Шабанскі Франц** — памешчык Ваўкавыскага павета, далучыўся да атрада паўстанцаў і з ім збег за мяжу, адкуль прасіў літасці. Быў сярод 43-х чалавек, якія яе атрымалі; на архіўным дакуменце маецца надпіс алоўкам — «возвратился». Рашэннем Камісіі Шабанскаму забаранілі ўдзельнічаць у дваранскіх выбарах і вярнулі на месца жыхарства.

**Эйсымонт Антоні** — шляхціц Ваўкавыскага павета, маёнтка не меў, месца жыхарства — Заблоцце, служыў кандуктарам пры будаўнічай частцы. У час паўстання меў каля 30 год, уступіў у партызанскі атрад (які невядома). Потым служыў падафіцэрам у 11

уланскім палку, з якім адступіў у Прусію, дзе быў інтэрнаваны. Выконваючы абавязкі генерал-губернатара Гродзенскага і Беластоцкага, князь Далгарукаў прыслаў Гродзенскаму губернатару спіс 15 былых паўстанцаў, якія адправіліся вадою з Пілавы ў Францыю. Сярод іх есць і Эйсымонт (праўда, прозвішча напісана памылкова Эгземонт), да якога таксама належыць характарыстыка Далгарукава: «упорствующие в неповиновении». Камісіяй унесены ў 2 разрад дзяржаўных злачынцаў.

**Эйсымонт Актавіян** — памешчык Гродзенскага павета, меў маёнтак Ябланава, служыў у Варшаве пры Міністэрстве фінансаў. У час паўстання, да верасня 1831 г., быў афіцэрам паўстанцкай арміі. Пасля паражэння добраахвотна з'явіўся ў Варшаву, чым заслужыў прабачэнне з вызваленнем маёнтка ад сяквестра і канфіскацыі. Жыў на паручыцельстве ў свайго брата Люцыяна, былога харунжага. Відаць, у Гродне, бо захавалася прашэнне Эйсымонта аб дазволу на выезд з Гродна на два тыдні ў Ябланава па «фамільным справам».

Удзел мастаўчан у Лістападаўскім паўстанні 1830-1831 гг. яшчэ раз падкрэслівае, што яно было не толькі «польскім», але і «беларускім» (як і «літоўскім»)[158].

## «ТО ЛІЦВІНКА ЭМІЛІЯ ПЛЯТЭР!»

23 сакавіка 1794 года Касцюшка выдаў адозву «Да жанчын»: «...Браты, сыны, мужы Вашыя ідуць біцца, кроў наша павінна заверыць Вашае шчасце, жанчыны! Няхай іх кровазліццё стрымае Ваша стараннасць! Паміж іншым, прашу Вас, каб, міласцю людскай, рабілі корпію і бінты для войска; ахвяра гэтых ладных рук палегчыць цярпенне і заахвоціць мужчын»[159]. Праз 37 год, як бы на гэты заклік свайго куміра, адазвалася Эмілія Плятэр. Праўда, корпія і бінты не маглі задаволіць — у яе былі іншыя метады «заахвочвання мужчын».

У Лістападаўскім паўстанні ў шарэнгах партызанскіх атрадаў і рэгулярнага войска ваявала не адна жанчына. Можна ўспомніць шаснаццацігадовую Вільгельміну Каспровіч, якая пазбегла Ашманскай разні, дзе загінула яе маці-ўдава, і далучылася да партызанскага атрада. З іншых жанчын — Забароўскую, Габрыэлю Агінскую, Тэклю Сабалеўскую, Дэнбіцкую, пра якіх амаль нічога невядома. Але ўсіх іх

[158] Гэты нарыс напісаны па матэрыялах Беларускага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Гродна: ф. 1, воп. 20, сп. 471; воп. 27, сп. 64, 114, 130, 346; ф. 4, воп. 1, сп. 110, 135, 192, 209.
[159] Tadeusz Kosciuszko w historii i tradycji… — S. 47.

засланіла сабою Эмілія Плятэр. Імя яе стала сімвалам адданасці і мужнасці, незламанай волі выканання таго, да чаго сябе рыхтавала, упартасці ў справе народнага паўстання. Эмілія Плятэр як бы з паходняю ў руцэ абышла свой край, заклікаючы на барацьбу з ворагам.

Пра Эмілію гаварылі ўжо падчас паўстання. З вуснаў у вусны перадавалі пра яе весткі, якія абрасталі фантазіямі і легендамі. Шэраг брашур і ўспамінаў, выдадзеных пасля паўстання, расказвалі пра Эмілію. Раскажам і мы пра мужную дзяўчыну, бо ў беларускай літаратуры падрабязнасцей яе жыцця і дзейнасці вы не знойдзеце.

Нарадзілася Эмілія Плятэр 13 лістапада 1806 г. у Вільні. Бацька граф Францішак Ксаверы Плятэр160, маці — Ганна з Моляў. Францішак быў марнатраўца і гуляка, таму маці пасля бясконцых спрэчак вырашыла пакінуць мужа і выехаць у маёнтак Ліксна Віцебскай губерні. Гаспадыняй тут была ўдава па дэядзьцы Эміліі — Ізабэла Сіберт-Плятэр, вялікая патрыётка і каталічка. Дзевяцігадовая дзяўчынка расла і выхоўвалася разам з яе дачкамі. У сям'і Эмілія чула размовы аб згвалчанай і падзеленай Рэчы Паспалітай, праследаванні патрыётаў у Каралеўстве Польскім і на Літве — Беларусі, з горыччу і абурэннем прыняла паведамленне аб працэсе над студэнтамі Віленскага універсітэта (філаматамі і філарэтамі) у 1823 г.

Эмілія была надзелена моцнай воляй, была заўсёды сур'ёзнай, яе не цікавілі дзявочыя справы: гульні, танцы, вопратка, думы аб мужчынах і мары аб замужжы. У Эміліі была добрая бібліятэка і яна вучыла гісторыю і літаратуру Рэчы Паспалітай, чытала кнігі аб знакамітых людзях, якія са зброяю ў руках ваявалі за вольнасць свайго краю. У тым ліку пра Жанну д'Арк, партрэт якой вісеў у яе пакоі разам з партрэтамі Касцюшкі, князя Юзэфа Панятоўскага і пазней Ганны Дароты Хжаноўскай (удзельніцы абароны Трэмбалі ад татар у 17 ст.).

Віцебскі этнограф і фалькларыст, петрашэвец Максімільян Маркс у сваіх успамінах пісаў, што Эмілія вылучалася народалюбствам, дікавілася беларускім фальклорам, танцамі. Сама іграла на фартэпіяна і танцавала, асабліва ёй падабалася «Лепятуха». Маркс ставіў Плятэр у першы рад культурных дзеячоў і называў прадвесніцай беларускага Адраджэння XIX стагоддзя. «Першая яна, — бадай, я не памыляюся, - з запалам, уласцівым чулым і высакародным сэрцам, аддалася душою беларускаму люду, вывучала яго бяду і спачувала ёй, стараючыся па магчымасці аблегчыць яе, збірала і спявала яго песні, шчодра плаціла

160 Род Плятэраў старажытны, радавое гняздо — замак Броаль у Вестфаліі. Мелі значныя ўладанні ў Літве, Баларусі, Польшчы.

за іх дастаўку і спрабавала пяро ў іх наследаванні. На фартэпіяна[161] яна ўмела найвыразней перадаць і зухаватасць і тугу народных матываў і нават тэмбр сапрана-жалейкі і баса-дуды»[162].

Эмілія пісала вершы, стылізаваныя над народныя плачы-галашэнні. На жаль, ад яе літаратурнай спадчыны на сёння вядомы толькі два радкі:

Авой, авой, дзяцюк ты мой!
Не на радасць, не на шчасце ты радзіўся!

У 1829 г. Эмілія ездзіла з маці ў Варшаву, Кракаў, дзе аглядала на Вавелю труны каралёў і Касцюшкі. У Айцове пабывала ў гроце, дзе хаваўся Уладзіслаў Лакотэк. У замку ў Пясцовай Скале бачыла партрэт манашкі, якая падчас нападу ворага ваявала са зброяю ў руках, а потым пайшла ў кляштар. Усё ўбачанае мела вялікі ўплыў на Эмілію, дзяўчыну ўражлівую, гарачых пачуццяў, прымаючую блізка да сэрца людское няшчасце.

Каб стаць другою Жаннай д'Арк, Эмілія рыхтавала сябе не толькі маральна, але і фізічна. Яна вучылася ездзіць конна, пераадольваць рвы і дрыгву, фехтаваць, страляць у цэль, рабіла далёкія паходы.

Ліпеньская рэвалюцыя ў Францыі парадзіла надзею на перамены ў Польшчы, Літве і Беларусь Як толькі Эмілія пачула пра паўстанне ў Варшаве, адразу села на каня і аб'ездзіла сваіх навакольных сваякоў і знаёмых, каб падрыхтаваліся да ўзброенага паўстання ў Літве і Беларусі. У тым ліку пабывала ў Габрыелі Агінскай, Юзэфа Страшэвіча, дваюраднага брата Цэзарыя Плятэра.

Сустрэлася Эмілія таксама з кузінамі Луцыянам і Фердынантам Плятарамі, іх сябрам Аляксандрам Рыпінскім, курсантамі школы падхарунжых з Дзінабургскай крэпасці. Абмяркоўваўся план захопу апошняй сіламі атрада, які сфарміруе Эмілія і прывядзе для штурму, і сіламі курсантаў, якія павінны былі арганізаваць таварыства для ўнутранага ўдару. Гарнізон крэпасці быў невялікі, а ўмацаванні слабыя, так што змоўшчыкі спадзяваліся на поспех. Але планы не здзейсніліся, бо школу закрылі, падхарунжых выслалі ўглыб царства і ўключылі ў расійскія палкі, а крэпасць узмацнілі аддзелам генерала Т. Схірмана. Сустрэча закончылася пасвячэннем Эміліі ў Рыцара-Панну згодна старажытным традыцыям. І паколькі Рыцар гэты павінен быць

[161] У 1840 годзе фартэпіяна з м. Імброды, маёнтка Дыянісія Моля будзе продана з публічных таргоў памешчыку Бутлеру за 40 руб. 74 1/2 кап. серабром, а грошы адасланы ў казну.
[162] Цыт. па: Кісялёў Г. Радаводнае дрэва. — Мн., 1994. — С. 234-235.

літоўскім (беларускім) паўстанцам замест мяча на рамень далі ёй малую паляўнічую стрэльбу[163].

У Польшчы ўжо ішлі баі, а Літва і Беларусь маўчалі. Не хапала цярпення і Эмілія паехала ў Вільню, каб сустрэцца з людзьмі, якія павінны нешта ведаць. Верагодна, што ўдалося нейк выйсці на Віленскі Камітэт. Размаўляла з віленскімі студэнтамі. Калі вярнулася, часта наведвала ў Дусятах Цэзарыя. Нарэшце 29 сакавіка пачула аб захопе Расіен Ю. Гружэўскім. Адразу ж наехала да Цэзарыя і з ім аб'ездзіла навакольныя вёскі, заклікаючы браць зброю і рыхтаваць косы. Эмілія падрэзала свае доўгія прыгожыя валасы, пераапранулася ў падрыхтаваны раней мундзір і ў бліжэйшую нядзелю, 29 сакавіка, з'явілася на плошчу гіерад касцёлам Дусят (Дусетас).

Узброеная двума пісталетамі і кінжалам, дзяўчына выклікала ў людзей, выйшаўшых пасля набажэнства, здзіўленне. Эмілія звярнулася да ўсіх, як да братоў, і абвясціла, піто пачалася барацьба за «нашу і вашу свабоду», супраць ворагаў веры і айчыны. Як пішуць сведкі, за чвэрць гадзіны Эмілія назбірала атрад колькасцю ў 280 стральцоў, 60 донных і некалькі сот касінераў. Памочнікам у гатым быў для яе Люцыян Вейсенхоф[164].

На чале з Эміліяй і Цэзарыем Плятэрамі партызанскі атрад пайшоў на Дзінабург (Даўгаўпілс). Па дарозе 30 сакавіка зрабілі напад на паштовую станцыю Даўгелі. Разбілі невялікі расійскі атрад, здабылі 60 коней і трохі зброі. 2 красавіка сустрэліся з ахоўнай часткай генерала Шырмана. Пад Уценай адбылася бітва, у выніку якой рускія адышлі. Эмілія ў час яе натхняла сваім прыкладам партызан да мужнасці. 4 красавіка атрад Плятэраў напаў на м. Езёросы (Езёраны?) і захапіў яго. Эмілія ўпісала акт паўстання ў гарадскую і судовую кнігі.

Пасля таго, як казакі выбілі атрад з мястэчка і амаль што разбілі яго, Эмілія і яе ад'ютантка Марыя Прушынска з групай партызан дабраліся да атрада Караля Залускага каля Панявежы (Панявежыса). Той таксама ўгаварваў Плятэр вярнуцца дадому, але ўсё ж прызнаваў, што з'яўленне дзяўчат у атрадзе падняло настрой партызан. Вількамірцы, якія былі сярод іх, з радасцю сустрэлі Эмілію і лічылі за гонар служыць разам з ёю.

---

163 Гл.: Majchrowski St. Niezwykłe postacie z czasów powstania Listopadowego. - W., 1984. - S. 180; Powstanie Listopadowe. 1830-1831. Dzieje wewnetrzne. Militaria. Europa wobec powstania / Pod red. Wl. Zajewskiego. - W., 1990. - S. 398.

164 Barzykowski St. Historja powstania Listopadowego. - Poznan, 1883. T. IV. - S. 178-179; Majchrowski St. Opis cit. - S. 181.

Набліжэнне моцных рускіх войск прымусіла Залускага адыходзіць на злучэнне з большай групай партызан. Марш быў вельмі цяжкім, адбываўся днём і ноччу, праз дрыгву, палі па калені ў гразі. Дайшлі да Шадава (Шедува), дзе засталіся на адпачынак. Аднак праціўнік не даў адпачыць і 4 мая пачаў акружаць атрад. Каб перашкодзіць гэтаму, у атаку пайшлі стральцы і віленскія студэнты. Эміліі, якая была ледзь жывая і калывалася ў сядле, дазволілі выехаць угіерад, каб паказацца атакуючым і «нагрэць іх да бою». З гонарам вытрымала бітву, атрад вырваўся, але быў прымушаны зноў адыходзіць пры пастаянным кантакце з непрыяцелем.

Ішлі на Байсогалу, на Ковенскім тракце. Эмілія, змучаная маршам і боем, страціла прытомнасць і ўпала з каня. Калі б не Міхаіл Пяткевіч і некалькі стральцоў, магла б дастацца рускім. Выратавальнікі пакінулі яе ў сялянскай хаце. Была напаўпрытомнай і фізічна вычарпанай. Але як толькі трошкі стан здароўя палепшыўся, Эмілія заявіла сваім гаспадарам, што пойдзе шукаць паўстанцаў.

Спачатку ішла адна, потым да яе далучыліся асобныя партызаны і малыя трупы. Так на чале іх дайшла да Залускага, лагер якога размясціўся над Дубісай, прытокам Немана, у адной мілі ад Расіен (Расейняй). Вількамірскія стралкі сустрэлі Эмілію авацыяй. Пасля нарады, на якой было вырашана падзяліцца на невялікія атрады і кожнаму з іх весці барацьбу ў сваіх паветах, Эмілія ўзначаліла вількамірцаў. 17 мая яны захапілі Вількамір і былі з трыумфам сустрэты яго жыхарамі. Да Эміліі далучыліся Марыя Рамановіч і 16-гадовая Антаніна Тамашэўска. Сваякі прымушалі Эмілію пакінуць атрад і ісці дадому, тады яна разам з сяброўкамі папрасілася ў атрад Канстанцыя Парчэўскага. Ён не быў супраць. У чэрвені ў Жэймах (Жеймяй) Трокскага павета Парчэўскі і Габрыель Агінскі (камандзір віленскіх студэнтаў) аб'ядналіся з рэгулярным польскім войскам генерала Д. А. Хлапоўскага. У гэты час і сустрэў Эмілію Ігнат Дамейка. У сваіх успамінах ён пісаў: «...Далучыўся да нас даволі вялікі, добра апрануты, узброены ў пікі і гіалашы конны аддзел гіаўстанцаў на чале з Плятэр. З ёй прыбылі Цэзары і Уладзіслаў Плятэры, шмат цывільнай моладзі і пешыя ахвотнікі. Плятэранцы можна было даць не болей 24 гадоў, невялічкая ростам, бледная, не прыгажуня, але з акруглым, прыемным, сімпатычным тварам, блакітнымі вачыма, стройнага, хоць і не моцнага складу. Была паважная, хутчэй суровая, чым свойская ў абыходжанні, малагаваркая і поглядам нібыта патрабавала да сябе належных адносін і прыстойнасці. Дый ніхто ў лагеры не дазваляў у яе прысутнасці кінуць якое недарэчнае слова, жарт або паграшыць у ветлівым абыходжанні. На ёй быў шарачковы сурдут з чырвоным

каўнерам, а каля шыі карункавы каўнерык, што вельмі ёй пасавала. Невялікі мужчынскі ківер на галаве, валасы падрэзаны, шырокія, да зямлі, шаравары, на поясе кінжал і невялікая шабля, сярэбраныя шпоры на боціках. Сціплая, без усякай ненатуральнай прэтэнзіі, зграбна трымалася на кані»[165].

А вось як пісаў другі сведка гэтай сустрэчы Я. Клюкоўскі: «Абедзьве мелі ладную, падкрэсліваючую фігуру шарачковую вопратку, цёмна-блакітныя круглыя шапкі, з нежадання ўкладзеныя набок, двухкаляровыя какарды на грудзях, лёгкія шаблі на баку і за вузкім поясам малыя кінжалы. Мундзір і ўзбраенне былі падобныя, але адзін («маладзенькі ваёўнік літоўскі» — В. Ш.) меў бледны твар..., блакітныя вочы, якія глядзелі задумліва і калі-нікалі панурую ўсмешку на вуснах і другі — акруглага румянага твару, прыгожых вачэй з-пад шырокіх броваў, гледзячых жыва, увесь час усміхаючыся, як бы душа яго ва ўсім бачыла толькі вясёлую забаву. Выраз твару і вонкавы выгляд вельмі адрознівалі гэтых двух цікавых сяброў. Першым была Эмілія Плятэр, другім — Рамановіч...»[166].

Хлапоўскі прыняў Эмілію «вельмі ветліва і натхнёна» і, калі яна не згадзілася вярнуцца дадому і пачакаць там з надзеяй перамогі, далучыў да свайго штаба. Згодна ўспамінаў Ліманоўскага, Хлапоўскі авансаваў Плятэр чын капітана і прызначыў ганаровым камандзірам літоўскага палка. З часткай гэтага палка Эмілія і яе паплечніцы прыйшлі ў Коўна (Каўнас), занятае польскім войскам. Тут вядомая сяброўка А. Міцкевіча Кавальская дала ў сваім доме баль у гонар Эміліі[167]. А 27 чэрвеня адбылася бітва, падчас Якой яна зноў ледзь не трапіла ў палон. Удалооя збегчы толькі дзякуючы самаахвярнасці маёра Кекерніцкага, які аддаў ёй свайго каня, а сам папаў да рускіх. Наўздагон кінуліся тры казакі, конь Эміліі не здолеў пераскочыць праз плот і яна ўпала. Марыя Рамановіч пачала страляць з карабіна, падаспеў на дапамогу маёр Мацэвіч — і Эмілія ўратавалася, хаця і была паранена.

Усе тры сяброўкі былі пры Хлапоўскім, калі 8 ліпеня было вырашана атакаваць Шаўлі (Шаўляй). Літоўскі полк Эміліі ахоўваў абоз, які таксама быў уцягнуты ў бітву. ГІлятэр праявіла незвычайную мужнасць, што было адзначана ў рапарце Гелгуда.

---

165 Powstanie 1831 r. na Litwie. Wspomnienia uczestników / Wyd. H. Mościcki. — Wilno, 1931. — S. 14—15; частка цытаты ёсць у: Кісялёў Г. Радаводнае дрэва... — С. 235.
166 Powstanie 1831 na Litwę... — S. 153.
167 Там сама. — С. 17.

9 ліпеня на ваеннай радзе ў Куршанах (Куршэнай) было вырашана падзяліць польскае войска ў Літве на тры часткі, якія будуць дзейнічаць у трох накірунках. Эмілія засталася пры Хланоўскім, на якога ўскладала вялікія надзеі. Але 13 ліпеня яна даведалася, што той задумаў перайсці на тэрыторыю Гірусіі. У роспачы Эмілія заклінала Хлапоўскага, каб адазваў свой загад і ваяваў далей, хаця б давядзецца загінуць. «Лепш было б памерці з гонарам, — зацвердзіла дзяўчына, — чым скончыць такой ганебнай знявагай. Шчаслівай дарогі, генерал! Што да мяне, пакуль іскра жыцця будзе чутна ў грудзях, буду біцца за Айчыну».

Вечарам каля вогнішча Эмілія і сяброўкі сядзелі з іншымі партызанамі. Плятэр была бледная і спакойная, увесь час маўчала, толькі з роспачы сказала: «Радуйцеся, завядуць Вас да Прусіі на ганьбу!» Гэтыя заклікі, відаць, мелі нейкі ўплыў на тое, што некаторыя афіцэры і радавыя пакінулі свае вайсковыя часці і не пайшлі ў Прусію, а тыя, каго завялі туды, пры раззбраенні павярнулі назад у Літву.

Дамейка ўспамінаў, што на трэці дзень пасля выйсця з Куршан, у нейкай вёсцы Эмілія, горка вымавіўшы нам за тое, што даем сябе весці да Прусіі, развіталася з ім і Мацевічам. Марыя і Антаніна засталіся, а Плятэр вырашыла дабрацца да Каралеўства, каб далучыцца да ваюючых аддзелаў168. Яна засталася вернай сваёй ідэі быць салдатам «пакуль Полынча не адшукае поўнай свабоды». Пайшлі ў бок Варшавы Эмілія і Цэзары Плятэры, ад'ютант Гелгуда Длужэўскі і яшчэ некалькі чалавек. Ішлі па тэрыторыі, дзе было шмат рускага войска, таму абыходзілі населеныя пункты, прадзіраліся скрозь лясы і багны, галодныя і халодныя.

Прайшлі амаль усю Летуву з поўначы на поўдзень і апынуліся ў ваколіцы Сейн. Эмілія была фізічна вычаргіанай і на 11 дзень вандроўкі страціла прытомнасць. Сябры павінны былі яе пакінуць у прыдарожнай літоўскай хаце169. Сяляне добра яе прынялі, але не маглі гарантаваць небяспеку і даць адпаведны „медыцынскі нагляд. Таму Эмілію перанеслі ў бліжэйшы двор гаспадара Абламовіча, дзе яна хавалася пад рознымі прозвішчамі (Каравінскай, Шчавінскай). Калі трошкі паправілася, Абламовічы прывезлі яе да свайго дому, як настаўніцу сваіх дзяцей.

---

168 Так што Wielka Encyklopedia powszechna PWN памыляецца, калі піша, што Плятэр адышла на прускую тэрыторыю (T. 8. — S. 723).

169 Цэзары дайшоў да Варшавы, стаў паслом Сейма і ўдзельнічаў 7.09. 1821 г. у пасяджэнні пасольскай ізбы, дзе выступіў супраць ратыфікацыі ўмоў фельдмаршала Паскевіча і за адозву да салдат «ці хочуць біцца» за незалежнасць.

Эмілію пакахалі ўсе дарослыя і дзеці. Каб не пашкодзіць здароўю, ёй не гаварылі, што паўстанне скончылася трагічна. Пра гэта яна даведалася толькі ў канцы кастрычніка — зноў цяжка захварэла на сэрца і пасля некалькіх тыдняў памерла 23 снежня 1831 г.[170] Смерць Эміліі апаэтызаваў Адам Міцкевіч (ён ведаў пра дзяўчыну ад Дамейкі), напісаўшы зімою 1831/1832 гадоў верш «Смерць палкоўніка». Прывядзем невялічкі ўрывак у перакладзе Кастуся Цвіркі:[171]

Вось палкоўнік каня асядлаць загадаў
І прывесці бліжэй да парога.
Гіерад смерцю яшчэ раз хоць глянуць жадаў
Ён на друга свайго баявога.
Загадаў свой прынесці паходны мундзір,
Свой кінжал, зброю, пояс стралецкі.
Ён хадеў і з рыштункам сваім, камандзір,
Развітацца, як калісь Чарнецкі172.

Ды чаму твар дзявочы ў байца? Два грудкі...
Хто ж мог знаць, што баёў завадатар
Быў... дзяўчынай! Была — слёз не трэба, жанкі —
То ліцвінка Эмілія Плятэр!

Пахавалі Эмілію пасля свята Божага Нараджэння. Я быў на яе магіле ў г. п. Капчамесціс. Цяпер гэта Літоўская Рэспубліка, а ў той час Капцёва Аўгустоўскай губерні. Гэта недалёка ад в. Галавенчыцы Сапоцкінскага сельсавета Гродзенскага раёна. У месцы захавання ёсць памятная пліта з надпісам па-польску «Эмілія графіня Броэл-Плятэр. Нарадзілася 13.XI. 1806 - 23 .XII.1831. Гаворым вечны спакой».

Эмілія памерла, але чуткі, што яна жывая, хадзілі яшчэ ў 1833 г. У жніўні віленскі генерал-губернатар князь Далгарукаў паведаміў віцебскаму губернатару, што яе тайна прывёз з-за мяжы ў маёнтак графа Плятэра Тамоны на Ковеншчыне ягоны ўпраўляючы Мінхгаўзен. Але ў сапраўднасці аказалася, што той прывёз дачку Нямчынскага з Дзінабургскага павета. У 1830-я гады нямецкая моладзь стварала тайныя таварыствы, у якія ўступалі таксама дзяўчаты — прыкладам для іх была легендарная Эмілія Плятэр.

---

[170] Там сама. - С. 31; Wawrzykowska-Wierciochowa D. Prawdziwe zyce Emilii Plater // Nagajowo M. Jeżyk polski. - W., 1988. - S. 231.

[171] Там сама. - С. 232; Majchrowski St. Opis cit. - S. 193; Кісялёў Г. Радаводнае дрэва... - С. 237.

172 Чарнецкі Стэфан (1599-1665) - славуты военачалы-іік Рэчы Паспапітай. Памёру час баявога гіаходу ў вясковай хаце.

Вестка пра яе абляцела ўвесь свет, пра бясстрашную ліцвінку пісалі вершы не толькі польскія, але і французскія, нямецкія, англійскія, венгерскія, італьянскія і іншыя паэты. В. Косак напісаў партрэт. З малюнка Дэверыя 1835 г. зроблена літаграфія. Імя Плятэр насіў Асобны жаночы батальён 1-й пяхотнай дывізіі імя Т. Касцюшкі Войска Польскага, сфарміраванай у 1943 г. у СССР.

На заканчэнне аповяда пра Плятэр я хачу прывесці ўрывак легенды, якую запісаў у 1970 г. ад Веранікі Іосіфаўны Герасім — жыхаркі в. Малыя Екентаны Астравецкага раёна, В. І. Скідан. Пра сваю вёску Герасім расказвала: «Быў тут калісьці гасподскі двор. Гаспадарыў у ім пан Нарбут. У 1863 г. Нарбут камандаваў групай мяцежнікаў. Кіравала імі, галоўнай была Эмілія Плятар. У 1864 г. казакі разбілі паўстанцаў. Гасподскі двор спалілі. І навезлі сюды бурлакоў-пасяленцаў з Пскоўскай, Чарнігаўскай губерняў. Вёску назвалі Царская Мар'яўка...» [173]. Цікавы сам факт існавання такой легенды, а то, што ў ёй шмат блытаніны, чытач, напэўна, ужо зразумеў. Наступны ж нарыс пра Л. Нарбута дасць для гэтага дадатковы матэрыял.

## «ВАЙСКОВЫ НАЧАЛЬНІК ЛІДСКАГА ПАВЕТА ГРАМАДЗЯНІН НАРБУТ»

Людвік Нарбут адыграў у паўстанні 1863 года значную ролю. Аб гэтым сведчаць сучаснікі. А. Яліцкі — аўтар кніжкі «Нарбут» — пісаў: Каліноўскі — «найвялікшы з нашых рэвалюцыянераў, выразнік грамадскай думкі паўстання ў такой жа меры, як Нарбут быў выразнікам духу і гераізму эпохі...». Сябра Народнага ўрада А. Гілер таксама ставіў Нарбута ў рад з Каліноўскім: Каліноўскі «человек безграничного самопожертвования, честности, разума и энергии. Личность выдающаяся, достойная стоять рядом с Сигизмундом Сераковским, Людвиком Нарбутом и Мицкевичем в памяти народной»[174].

31 жніўня 1832 г. у маёнтку Шаўры Лідскага павета ў сям'і архітэктара, інжынера і вядомага гісторыка Літвы і Беларусі Тэадора Нарбута нарадзіўся хлопчык, якога назвалі Людвікам. Ён вучыўся ў Лідскім павятовым вучылішчы, потым у Віленскай гімназіі, дзе ў канцы 1850 г, быў арыштаваны за спробу стварыць «общество патриотов с целью произвести восстание». У сакавіку 1851 г. Людвіка публічна

---

[173] Легенды, паданні / Склаў М. Я. Грынблад і А. І. Гурскі. Мн., 1983. - С. 287, 483.
[174] Цыт. па: Кісялёў Г. «Як салодка памерці за радзіму!..» / Таленавіты камандзір паўстанцаў 1863 года Людвік Нарбут // Наш радавод. - Кн. 11. - Гродно, 1990. - С. 271; К. Калиновский: Из печатного и рукописного наследия. - Мн, - С. 159.

пакаралі розгамі і аддалі ў салдаты. У пісьмах з Каўказа ён прасіў сястру Тэадору прысланы хаця б засушаную кветку або жытні каласок з родных палёў. Вярнуцца сюды давялося толькі ў пачатку красавіка 1860 г. Жыў у бацькі, вёў гаспадарку, а калі ажаніўся пасяліўся ў маёнтку Сербянішкі, недалёка ад Шаўраў. У лютым — красавіку 1863 г. паміж Лідаю і Мерачам дзейнічаў атрад Л. Нарбута.

Калі пачалося рыхтавацца паўстанне, Нарбут звязаўся з «чырвонымі», Каліноўскім, бываў на канспіратыўных сходах у Лідзе. У падпольнай арганізацыі выконваў абавязкі акруговага арганізатара. 13 лютага загадам Віленскага рэвалюцыйнага камітэта Нарбут быў назначаны вайсковым начальнікам Лідскага павета (цяпер гэта тэрыторыя Лідскага і Воранаўскага раёнаў). Ён арганізаваў адным з першых партызанскі атрад на Беларусі. Не схаваўся за псеўданімам, як гэта зрабіла большасць камандзіраў, і дзейнічаў у родных мясцінах, дзе мясцовыя жыхары яго добра ведалі і паважалі. Гэта быў смелы ўчынак і свядомы выклік царскаму ўраду.

Ядро паўстанцкага атрада Нарбута склалася ў пачатку лютага з яго, брата Баляслава (ад'ютанта) і былога студэнта Пецярбургскага універсітэта Уладзіслава Пілецкага. У будаўніцтве атрада значную дапамогу аказала сястра Людвіка Тэадора Маньчуньска (Манджунская). Яна прывяла ў атрад двух расейскіх афіцэраў, групу віленскай моладзі, дастаўляла харчовыя прыпасы і, нават, сама ажыццяўляла пераходы з атрадам.

Першы лагер нарбутаўцаў быў заложаны ў 3 вярстах ад м. Нача. Сюды з невялікай групай прыйшоў Леў Краінскі. Разам перайшлі ва ўрочышча Сабалюнцы, куды прыбыў ксёндз, настаяцель Вішнёўскага касцёла Лідскага павета Юзэф Гарбачэўскі (ён стаў капеланам атрада). Аснову атрада Нарбута складалі сяляне — гэта адна з асаблівасцей, таму што ў многія атрады іх уцягвалі сілком. А Людвік, як я ўжо казаў, карыстаўся папулярнасцю. Будучы дэмакратам, ён абвясціў маніфест аб спыненні павіннасцей і надзеле сялян зямлёй. Атрад быў нядрэнна ўзброены (партыя зброі і экіпіроўкі паступіла таксама з Вільні), дысцыплінаваны, навучаны страляць і прыёмам партызанскай вайны.

Аб тактыцы атрада Нарбута пісаў у сваім рапарце начальніку расійскіх войск, якія знаходзіліся ў Віленскай губерні, палкоўнік Амсараў: «Шайка эта хорошо вооружена и организована, во время действий высылает цепи и в совершенстве пользуется местностью, даже устраивает засеки для собственного прикрытия. Не имея обоза, легко одетая, знакомая с местностью, она занимает в лесу трудно доступные позиции. При приближении войск, хотя не представляет большого сопротивления, но встречая войска она из-за надежного

прикрытия быстро отступает в чащу, вновь занимая другую позицию, при этом образе действий войска наши, не имея возможности ее настигать в частом лесу, могут нести бесполезные потери...»[175]. На тактыку атрада Нарбута безумоўна спрыяў яго ваенны вопыт: ён удзельнічаў у двух войнах — Каўказскай і Крымскай, меў званне прапаршчыка і пайшоў у адстаўку падпаручнікам.

За амаль чатыры месяцы існавання атрад Нарбута ўдзельнічаў у шэрагу баёў і сутычак. 28 лютага нарбутаўцы з'явіліся ў наваколлі м. Эйшышкі Лідскага павета. Ішлі з вёскі да вёскі, начавалі ў памешчыцкіх мызах, вербавалі ў атрад, чыталі сялянам пракламацыі, адымалі зброю ад ляснічых. Паблізу Воранава на дарозе Вільна — Ліда паспрабавалі спыніць пошту, страляючы ў канвойных салдат. Першая буйная сутычка адбылася пры в. Руднікі Трокскага павета. З боку паўстанцаў — 80 чал., у праціўніка — рота лейб-гвардыі Маскоўскага палка пад началам палкоўніка Вінберга і сотня казакаў. Пасля першых стрэлаў паўстанцаў казакі адышлі, а пяхота трымалася здаля, каб не далятаці кулі. Атрад пераправіўся праз Сольчу і рушыў к Аранам. У баі было паранена 4 расійскія салдаты і забіта 4 паўстанца. Хутка атрад Нарбута аказаўся у Радунскім прыходзе Лідскага павета і хадзіў паміж мястэчкамі Заблонц і Нача.

10 красавіка Нарбут паслаў атрад коннікаў у Бершты, каб ён знішчыў мост на р. Котра — гэта аперацыя перарвала камунікацыю ад чыгуначнай станцыі Парэчча. 11 красавіка адбыўся бой каля в. Дубічы Каняўскай воласці Лідскага павета. Сустрэліся паўстанцы Нарбута і 2 роты лейб-гвардыі Паўлаўскага палка з 36 казакамі Данскога № 4 палка пад камандаю капітана Цімафеева. Рухаючыся часам па пояс у вадзе, карнікі ўсё ж вымусілі паўстанцаў адступіць. Яны адышлі з цэльнай стральбой па праціўніку і выкарыстоўваючы мясцовасць. Страты іх: 1 забіты, 5 паранена, расійскіх салдат забіта — 2, паранена — 5[176]. Пасля гэтага бою генерал-губернатар Назімаў прызначыў за галаву Нарбута вялікую цану, а расійскія салдаты празвалі яго ведзьмаром.

Для разгрому атрада Нарбута ў Гродне была ўтворана асобая частка: атрад палкоўніка Вернера (3 роты Калужскага пяхотнага палка, эскадрон улан Курляндскага палка, 20 казакаў і 1 гармата). 14 красавіка ён рушыў з Гродна ў пошук нарбутаўцаў. 20 красавіка ў в.

---

[175] Виленский временник. Кн. VI, ч. 2. — Вильно, 1915. - С. 104.
[176] Миловидов А. И. Перечень боевых столкновений русских войск с польскими повстанцами в кампании 1863—1864 гг. в пределах Северо-Западного края. — Вильно, 1915. — С. 4.

Буды Вернер даведаўся, што паўстанцы хаваюцца ў балотах у наваколлі возера Думбля (каля в. Кавалькі). Бой, які тут адбыўся, працягваўся чатыры гадзіны. Агульная колькасць атрадаў Нарбута і Навіцкага дасягала каля 600 чалавек, але Вернер меў 805 чал. Пасля цяжкага бою паўстанцы страцілі 7 забі'цымі (сярод іх — Навіцкі і брат Нарбута) і болей 10 параненымі (па іншым даным — забіта 100, паранена — болей 100). 10 расійскіх салдат было паранена.

Нарбуту ўсё ж удалося захаваць ядро атрада, а Вернер 23 красавіка пайшоў у Гродна. 30 красавіка Віленскі паўстанцкі камітэт прысвоіў Нарбуту званне палкоўніка паўстанцкіх войск і, можа быць, кур'ер, якога прыняў Нарбут у ноч з 2 на 3 мая, прывёз яму патэнт на кіраўніцтва ўсімі ўзброенымі сіламі на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю.

Апошні бой Нарбута адбыўся ля возера Палясы каля в. Дубічы. Начальнік Віленскага атрада вядомы ўжо нам Цімафееў нарэшце дапільнаваў няўлоўны атрад. Маючы значка большыя сілы (ланцуг стралкоў, рота Паўлаградскага палка, узвод казакаў 42 Данскога палка), чым паўстанцы, ён вырашыў іх атакаваць і знішчыць. Нарбут не чакаў праціўніка і яго байцы практыкаваліся ў стральбе. Карнікі ж пайшлі на хітрасць: пераапрануліся ў сялянскую вопратку і іх гірынялі за сялян чакаемага транспарту з хлебам. Такім чынам, атака расійскіх стралкоў была нечакана. Яны выбілі паўстанцаў з балотных кустоў, а пяхотная рота атакавала левы фланг Нарбута, каб скінуць у балота. Манеўр атрымаўся, паўстанцы адышлі, але зрабілі гэта арганізавана (перакатамі). Восем атак патрабавалася Цімафееву, каб зламаць супраціўленне і прымусіць Нарбута аддаць загад прабівацца з акружэння асобнымі групамі. Цімафееў праследаваў паўстанцаў па калена ў балотнай вадзе, праз густарослую лазу да самай цемры і толькі ў тры з паловай ночы вярнуўся ў м. Дубічы.

У выніку бою было забіта 13 паўстанцаў (па іншых даных — 61), паранена — 8 (ці 9), у палон папала 6 чалавек. Сярод забітых — памочнік Нарбута Л. Красінскі і сам Людвік. Яго паранілі тройчы: спачатку ў нагу, потым — у грудзі. Паплечнікі неслі яго на руках, каб схавацца ў лесе, але смяротная куля папала ў шыю. Захаваўся дікавы расказ гвардзейскага афіцэра, які чуў падрабязнасці гібелі Нарбута ад Цімафеева: «Отступление совершалось в порядке, как вдруг Нарбут пошатнулся, упал на колени и присел на землю. Ближайшие повстанцы бросились к нему на помощь, но он замахал руками и проговорил: «то ниц, то ниц...» (это ничего, ничего). Он был смертельно ранен. Его подхватили на руки и побежали с ним, но спасти все-таки не смогли, так как наши подошли и были уже в нескольких шагах. Нарбут успел

еще расстегнуть чамарку и передать бумаги и деньги одному из своих проводников, но затем упал мертвым вместе с помощниками, пораженными несколькими пулями... Шайка при известии о тяжелой ране своего начальника приостановилась на свою гибель. Ее окружили и почти всю уничтожили». Далей ва ўспамінах царскага афіцэра гаварылася: «Мы вышли в переднюю: первое, что я увидел, был лежавший на скамейке труп Нарбута..Он был в простой синей чамарке, без всяких отличий и в больших сапогах. Лицо покойника было красивое, привлекательное: высокий лоб, правильные черты лица, на котором как будто застыла горделивая улыбка»[177]. Вядомы віленскі мастак Міхал Эльвіра Андрыёлі, які ваяваў у атрадзе Нарбута і быў паранены ў апошнім баі, намалюе потым палатно «Смерць Нарбута».

Забітых паўстанцаў прывезлі ў Дубічскі касцёл, адпелі і пахавалі паблізу ў брацкай магіле, але хутка ўлады зруйнавалі яе з зямлёю. А па вёсцы Дубічы яшчэ доўга патрулявалі казацкія раз'езды. Палонныя гіапалі ў Сібір, Валяслава Нарбута злавілі ў ваколіцах Друскенік і аддалі пад ваенны суд у Гродне. Сястра Тэадора збегла за мяжу[178]. Рэшткі атрада былі сабраны пад кіраўніцтва Парадоўскага- Астрога, які летам завёў атрад у Гродзенскую пушчу, а потым далей — у Аўгустоўскія лясы.

...У 1933 г. польскі 76 полк пяхоты імя Л. Нарбута на сабраныя грошы паставіў на месцы пахавання паўстанцкага камандзіра помнік з надпісам: «За нашу свабоду и вашу»[179].

## БІБЛІЯТЭКАР ГРОДЗЕНСКАЙ МУЖЧЫНСКАЙ ГІМНАЗІІ Е. Ф. АРЛОЎСКІ

Зусім нядаўна мы адзначалі 130-годдзе з дня нараджэння і 80-годдзе з дня смерці Еўстафія Філарзтавіча Арлоўскага (14.04.1863-2.12.1913). Ураджэнец Ашмянскага павета амаль усё жыццё быў звязаны з Гродзеншчынай. Пасля заканчэння гістарычнага факультэта Імператарскага гісторыка-філалагічнага інстытута ў Санкт-Пецярбурзе Арлоўскі ў 1885 г. быў назначаны настаўнікам Гродзенскай мужчынскай гімназіі. Тут ён працаваў 28 з паловай год, прайшоўшы ўсе ступені кар'еры дзяржаўнага чыноўніка — ад калежскага асэсара

---

[177] Цыт. па: Кісялёў Г. Указ. сач. — С. 275-276.
[178] Ігнатоўскі У. 1863 год на Беларусі: Нарыс падзей. — Менск, 1930. — С. 113—114; Миловидов А. И. Указ. сач. — С. 4; Виленский временник... — С. 128—129.
[179] Нарбут А. Генеалогія сям'і // Чырвоная змена. — 1989. 18.XI. — С. 9.

(12.03.1890) да стацкага дарадчыка (27.02.1898). Званне заслужанага настаўніка Еўстафій Філарэтавіч атрымаў нездарма. Яго ўрокі «дыхалі гісторыяй», для яго не існавала правіла «ад званка да званка», ён ажыўляў «вобразы былога, рабіў іх як бы зноў жывымі, прымушаў іх зноў жыдь і дзейнічаць». Арлоўскі накіроўваў сваіх вучняў да дабра, шчыра радаваўся іх поспехам і шчыра бедаваў аб няўдачах. На пахаванні гімназіст У. Кузьмідкі ўдала параўнаў Еўстафія Філарэтавіча з Дыягенам і сказаў, што мы пазбавіліся «Настаўніка-Чалавека».

Другая частка жыцця Арлоўскага, якая вельмі моцна звязана з педагагічнай дзейнасцю, — праца вучонага-гісторыка. «Чалавек навукі», як назваў яго калега Д. М. Кропатаў, напісаў звыш 20 прац па гісторыі Гродзеншчыны. З-пад пяра Арлоўскага выйшлі артыкулы, брашуры, манаграфія «Гродненская старина», у якіх ён пісаў пра населеныя пункты (Гродна, мястэчкі Свіслач і Жыровіцы), пра гістарычныя асобы (Сергій Раданежскі, Мікалай І, М. М. Мураўёў, імператрыца Марыя Фёдараўна, гісторык М. В. Каяловіч), пра храмы і кляштары. Некалькі выданняў вытрымалі вучэбныя дапаможнікі па гісторыі Віленскай і Гродзенскай губерняў. Пытанням народнай асветы былі прысвечаны працы: «К истории народного образования в Гродненской губернии» і «Исторический очерк Гродненской гимназии». Сучасныя гісторыкі Гродзеншчыны, як мне здаецца, не могуць абысці працы Арлоўскага, бо ў іх закрануты ўсе сферы жыцця мясцовага краю: эканоміка, палітыка, культура, адукацыя, рэлігія.

Шмат часу траціў Еўстафій Філарэтавіч на грамадскую дзейнасць. Як адзначылі ў сваіх прамовах на пахаванні выступаючыя, ён быў «добры грамадскі работнік». Вось, па ўсёй верагоднасці, няпоўны пералік абавязкаў: у 1907 г.— галосны, а ў 1911 — кандыдат у галосныя гарадской думы, сябра праўлення Гродзенскай гарадской публічнай бібліятэкі (1891-1913 гг.), Паўночна-заходняга аддзела Імператарскага рускага геаграфічнага таварыства, Гродзенскага царкоўна-археалагічнага камітэта (1913), педагагічнага таварыства, Гродзенскага праваслаўнага брацтва, таварыства брацкай узаемадапамогі, Гродзенскага павятовага аддзялення Літоўскага епархіяльнага вучылішчнага савета (1892/1898), агент таварыства драматычных пісьменнікаў.

Як бачым, Еўстафій Філарэтавіч Арлоўскі быў цікавым шматгранным чалавекам. Не кожны з сённяшніх настаўнікаў можа пахваліцца за сваю педагагічную і навуковую працу пяццю ордэнамі і дзвюма медалямі. Падрабязней пра жыццё і дзейнасць Арлоўскага

можна пачытаць у маім артыкуле або ў кніжцы «По следам Гродненской старины»[180]. А ў гэтым нарысе мне хацелася б апісаць яшчэ адну цікавую старонку дзейнасці Еўстафія Філарэтавіча — бібліятэчную.

У мужчынскай гімназіі ён займаў пасаду бібліятэкара фундаментальнай бібліятэкі і ўзначальваў аддзел «Вучэбныя дапаможнікі па гісторыі і геаграфіі». Каб не было блытаніны і незразумеласці, адзначым, што гімназія мела дзве бібліятэкі: фундаментальную і вучнёўскую. Першай вучні трох старэйшых класаў пачалі карыстацца толькі пасля цыркуляра міністра народнай адукацыі ад 25.XI.1905 (ст.ст.). Фундаментальная бібліятэка размяшчалася ў «особоустроенном для нея зале». Памяшканне гэта было прасторнае і зручнае, чаго не было ў вучнёўскай бібліятэцы[181].

Асновай бібліятэчнага фонда Гродзенскай губернскай гімназіі стала бібліятэка дамініканскай гімназіі, значная частка якой была перададзена ёй пасля скасавання апошняй — гэта каля 10.000 тамоў[182]. Е. Ф. Арлоўскі пісаў: «Дзякуючы перадачы ў гімназіяльнае ведамства дамініканскай бібліятэкі, гімназія стала ўладальнікам багатага збору польскіх кніг. У гэтых абставінах хутка былі прыняты меры да папаўнення бібліятокі кнігамі рускімі, таксама перакладамі з замежных моў на рускую»[183]. У 1838 г. у бібліятэку Гродзенскай гімназіі перадалі 279 тамоў кніг, канфіскаваных у паўстанца 1830-1831 гг. князя Сапегі. У 1840 г. паступілі кнігі 193 назваў, адабраныя ў К. Нямцэвіча, таксама паўстанца (у 1845 г. іх раздзялілі паміж вучэбнымі ўстановамі Гродзенскай дырэкцыі) [184] . Агульная колькасць кніг фундаментальнай бібліятэкі па справаздачы за 1884-1885 гг. налічвала 8.535 тамоў, а па стану на 1 студзеня 1909 г. — 5.146 назваў у 11.793 тамах, ды ў вучнёўскай бібліятацы — 1971 назва ў 2635 тамах[185]. Такім чынам, у валоданнях Арлоўскага быў багаты кнігазбор.

Спалучэнне гісторыка і бібліятокара ў асобе Еўстафія Філарэтавіча дало добрыя ўсходы. Самае значнае стварэнне ім у канцы 1896 г. пры фундаментальнай бібліятэцы «мясцовага аддзела», гэта

---

[180] Швед В. В. По следам Гродненской старины. - Гродно, 1993. - С. 54-60; Ён жа. Летописец Гродненщины // Гродненская правда. - 1992. - 17 декабря. - С. 3.
[181] БДГА, ф. 1186, воп. 3, сп. 81, л. 14 аб, 15 аб.
[182] Падрабязней пра бібліятэку дамінікан гл.: Ковкель Л. И. Из истории библиотек Гродненских монастырей // Наш радавод. Кн. 4, ч. 1. - Гродна, 1992. - С. 164-166; Jodkowski J. Gimnazjum podominikanskie w Grodnie.. - Grodno, 1924.
[183] Орловский Е. Ф. Исторический очерк Гродненской гимназии. - Гродна, - 1901. - С. 31.
[184] Там сама. — С. 38.
[185] БДГА, ф. 1186, воп. 3, сп. 81, л. 14 аб.

значыць краязнаўчага, які ўключаў у сабе кнігі, брашуры і прадметы, якія датычацца Паўночна-Заходняга краю навогул і Гродзенскай губерні, у прыватнасці. «Усе кнігі і прадметы мясцовага аддзела, — пісаў Арлоўскі, — зарэгістраваны ў асобым каталазе і большая частка іх сканцэнтравана ў асобым шкафу (№ 35); пры гэтым аддзел, па меры магчымасцей, папаўняецца новымі набыткамі, а таксама ахвяраваннямі розных асоб. Для г. Гродна мясцовы аддзел з'яўляецца тым больш важным і неабходным, што ў цяперашні час ён аказваецца адзіным у межах цэлай Гродзенскай губерні»[186]. Звернем увагу ў гэтай цытаце і на саму працу Арлоўскага — асобы каталог, асобы шкаф № 35, папаўненне фонду.

Калегі Еўстафія Філарэтавіча ўспаміналі, што ён быў добрым грамадскім работнікам, гэта адносіцца і да яго абавязкаў бібліятэкара. Відаць, трэба было шмат часу праводзіць у бібліятэцы, каб па памяці ведаць нумар і месца кожнай кнігі. Ён заўсёды мог даць верную даведку па навуковых або жыццёвых пытаннях. У гістарычным архіве г. Гродна захавалася справа па Гродзенскай гімназіі «О предоставлении в Округ срочных и по предложениям сведений и отчетов», дзе мы знайшлі некалькі аўтографаў Арлоўскага — тры рапарты дырэктару гімназіі (ад 20.XII.1908 г., ад 20.X.1909 г. і ад 16.XI.1909 г. па ст. ст.) і два спісы вучэбных дапаможнікаў па геаграфіі і гісторыі. З рапартаў і спісаў, прыкладзеных да іх, відаць, што Арлоўскі добра ведаў фонды свайго аддзела, сачыў за паступленнямі новых карцін, атласаў, геаграфічных і гістарычных карт, спісваў тыя з іх, якія прыйшлі ў заняпад. У снежні 1908 г. Арлоўскі пісаў дырэктару, што прыступіў да складання новага каталога вучэбных дапаможнікаў па гісторыі і геаграфіі.

На старонках 109-112 вышэйназванай архіўнай справы знаходзяцца два спісы дапаможнікаў — можа гэта і ёсць пералік з таго каталога, аб якім пісаў Арлоўскі? У першым спісе ўказаны дапаможнікі па геаграфіі — 57 назваў у 202 экземплярах, у другім — па гісторыі: 36 назваў у 76 экземплярах. Сярод іх такія дзікавыя, як: вялікі і малы глобусы, 15 бюстаў розных тыпаў рас і плямён, план Гродна, алеяграфіі «Развалины замка в г. Троках» і «Пятницкая церковь в Вильне 1807 г.», фотаздымак «Каменецкий столб (башня)», дзве мазаічныя карціны відаў Гродзенскага замка ў XVI-XVII ст. ст., Максімава «Карта Виленского Учебного Округа» і іншае.

---

[186] Орловский Е. Ф. Указ. сач. — С. 103.

«Выкарыстоўваць час» было любімым выслоўем Арлоўскага, і ён сапраўды ўмеў гэта рабіць, як ніхто іншы. Мне здаецца, што ў бібліятэчнай цішы, сярод тысяч кніг, багатых інфармацыяй і фактамі, нарадзілася не адна праца гісторыка Арлоўскага. Да 1910 г. ён быў не жанаты і, відаць, шмат вольнага часу прысвячаў навуковай дзейнасці. Сябры называлі Арлоўскага «хадзячай энцыклапедыяй», чалавекам шматдасведчаным, бо ён імкнуўся ведаць усё, аб усім і аб усіх, і ўсё пазнанае назаўсёды захоўваў у сваёй дасканалай памяці, а заслугоўваючае найбольшай увагі і трактуючае ім як матэрыял для будучых прац заносіў у свае шматлікія лісточкі»[187]

На жаль, гэта ўсё, што можна сёння сказаць пра бібліятэкара Арлоўскага. Будзем спадзявацца, што пошукі новых дакументаў дапоўняць характарыстыку постаці нашага вядомага земляка.

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

[187] Е. Ф. Орловский (некролог). — Гродна, 1913.

ЗМЕСТ

Прадмова

Частка 1. ПАДЗЕІ

Гарадзенскае княства і яго ўладальнікі
Другі падзел Рэчы Паспалітай і Гродзенская канстытуцыя 1793 г
"За вольнасць, роўнасць, незалежнасць"
Пад прозвішчам герцага Вічэнцкага, або Напалеон Банапарт у Смаргоні і Ашмянах
Навагрудскія масоны
Лісты загаварылі
Гродзенскія гусары
"Ехаў Дзедка на кірмаш"
Знешні гандаль Гродзенскай губерні
Падзеі паўстання 1863 г. у Слонімскім павеце
Таварыства сельскай гаспадаркі
"Чорны воран" (з гісторыі гродзенскага рэкета)
Аповяды старых газет
"Лёс мой — Нёман"

Частка 2. ПОСТАЦІ

"Пойдзем жыва да Касцюшкі"
Мастак з Ашмяншчыны Юліян Карчэўскі
Справа воранаўскага жывапісца Яна Траяноўскага
Філамат Адам Міцкевіч
Інсургенты з Мастоўшчыны
"То ліцвінка Эмілія Плятэр!"
"Вайсковы начальнік Лідскага павета грамадзянін Нарбут"
Бібліятакар Гродзенскай мужчынскай гімназіі Е. Ф. Арлоўскі

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год